Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 8 (28624)

12 СТУДЗЕНЯ 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА



Шляхі беларускай «экаежы»

МС



Рыхтаваць дровы загадзя

МС



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ШЫЛА, намеснік міністра аховы здароўя:**

*«На гэтым этапе ставіцца глабальная задача — інфарматызацыя галіны, накіраваная на аб'яднанне ўсіх устаноў аховы здароўя. Плануецца стварэнне адзінага інфармацыйнага асяроддзя, складовай часткай якога стане інтэграваная электронная карта пацыента, аўтаматызаванае працоўнае месца ўрача, асабісты інтэрнэт-кабінет пацыента. Ставіцца задача выйсці на ўзаемадзеянне з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, іншымі дзяржорганамі. Адзінае інфармацыйнае асяроддзе аб'яднае ўсе медыцынскія цэнтры і фармацэўтычныя сеткі, у тым ліку недзяржаўнай формы ўласнасці. Усё гэта будзе выгадна найперш самому пацыенту».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0188 | ▲ |
| Еўра | 2,4093 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0354 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# МАМЫ РОЗНЫЯ ПАТРЭБНЫ



**Галоўная славутасць Вілейкі — скульптурная кампазіцыя «Маці з дзецьмі», якая знаходзіцца ў цэнтральным парку горада. Тут вельмі любяць праводзіць час маладыя сем'і з дзецьмі. На фота Святлана ГАЛУБЕНКА з маленькай дачкой Кацярынай.**

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

■ Гарадское жыццё

## Калі ў парыльні — суседзі па раёне

### Ці папулярныя сёння грамадскія лазні і колькі гэта каштуе?

**У сталіцы працуе восем грамадскіх лазняў. За мінулы месяц іх наведала 35 тысяч гараджан. «Звязда» даведалася, хто ходзіць у грамадскія парыльні, колькі каштуюць гэтыя паслугі і якой будзе пасля рэканструкцыі лазня № 1.**



### НІЯКІХ СЛОІКАЎ З ГРЫБАМІ І СЕЛЯДЦА!

У будны дзень у лазню № 7 прыходзіць 250—300 гараджан. У суботу і нядзелю наведвальнікаў амаль удвая больш — па 500 чалавек.

— У нас рускія парыльні. Тэмпература ў іх 60—70 градусаў, вільготнасць паветра — 80 працэнтаў, — расказвае **загадчык лазні Вячаслаў КІРГІЗ.** — Парыльні праграюцца за шэсць—восем гадзін да пачатку сеансаў, а потым яшчэ прапальваюцца гадзіну пасля абеду.

На ўваходзе прадаюцца венікі — бярозавыя па 3,75 рубля і дубовыя па 3,80. Кажуць, наведвальнікі часта іх купляюць.

СТАР. 7

■ Майстар-клас

## НАСТАЎНІКІ СЕЛІ ЗА ПАРТЫ

### Як педагагічныя «зоркі» дзяліліся сваім досведам з калегамі

**«Цудоўная атмасфера адзінства, мора крэатыву і пазітыву», «Натхняльна, пазітыўна, радасна», «Здзіўлена і зачаравана энтузіязмам, працалюбствам і прафесіяналізмам усіх выступоўцаў», «Радасць і гонар за калег!», «Усё было супер!», «Цікава! Карысна! Актуальна! Хачу яшчэ!» — такія ўражанні пакідалі ў вагонах імправізаванага навагодняга экспрэса ўдзельнікі Рэспубліканскага каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства, які прайшоў у сценах Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ўжо сёмы раз.**

### Сумна тут не бывае

Да слова, сёння ніхто не можа прыгадаць, як у фестывалю з'явілася прыстаўка «калядны», хоць ён заўсёды праводзіцца падчас зімовых школьных канікул. Проста хтосьці з педагогаў напісаў аднойчы на імправізаванай агароджы: «Дзякуй за выдатны калядны фестываль!» Гэта адна са шматгадовых традыцый — напрыканцы кожнага мерапрыемства яго ўдзельнікі дзеляцца сваімі ўражаннямі і пажаданнямі на падрыхтаванай пляцоўцы, ролю якой выконвае або адмыслова аформленая агароджа, або ялінка, або навагодні экспрэс, як сёлета. Але ўскочыць у «цягнік» змаглі далёка не ўсе. Колькасць ахвотных значна перавышала фізічныя магчымасці аўдыторый у акадэміі — пашчасціла толькі 500-м педагогам. І гэта новы фестывальны рэкорд! Рэгістрацыя на некаторыя секцыі спынілася ўжо праз паўгадзіны з моманту яе адкрыцця. Пры гэтым удзел у калядным фестывалі — абсалютна добраахвотны і ніякіх бонусаў настаўнікам быццам бы не дае. Хоць гэта, канешне, няпраўда: трапіць у асяродак аднадумцаў і неабыякавых людзей дарагога каштуе.

СТАР. 4

# АДКРЫВАЕМ ГРАНІЦЫ.
## АЛЕ ДУМАЕМ ПРА БЯСПЕКУ

**Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па лібералізацыі візавага рэжыму адзначыў, што паспяхова канкурыраваць у турызме магчыма толькі тады, калі выпрацаваны аптымальны рэжым уезду для замежных грамадзян. Але бяспека па-ранейшаму застаецца на першым месцы.**

За мінулы год праз Нацыянальны аэрапорт «Мінск» да нас прыбыло амаль 80 тысяч іншаземцаў. Акрамя таго, амаль 4,5 тысячы замежных турыстаў прыехала летась па бязвізавым рэжыме ў Белавежскую пушчу, а Аўгустоўскі канал за апошнія 14 месяцаў наведала больш за 51 тысячу.

Пры тым што колькасць замежных грамадзян, якія наведалі Беларусь, вырасла, гэта не мела негатыўнага ўплыву на міграцыйную сітуацыю. Наша краіна застаецца донарам бяспекі. Мы можам назіраць, якія наступствы паказвае адсутнасць рэальнага кантролю за перамяшчэннем бежанцаў у Еўрапейскім саюзе. Перш за ўсё — гэта рост тэрарыстычнай пагрозы ў рэгіёне. «Таму, прымаючы тыя ці іншыя рашэнні, неабходна перш за ўсё памятаць, што найважнейшае для нас — бяспека грамадзян Рэспублікі Беларусь і тых, хто прыбывае ў той ці іншы момант у Беларусь. Бяспека перш за ўсё. Ніякімі грашыма ад турызму гэта не кампенсуецца. Таму нам неабходна дэталёва разгледзець усе аспекты спрашчэння візавага рэжыму з улікам міжнародных тэндэнцый і прыняць абсалютна аптымальнае і ўзважанае рашэнне», — растлумачыў Прэзідэнт, а таксама адзначыў, што прынятыя меры не павінны ні ў якім разе ствараць праблемы для дзяржаў, якія падзяляюць з намі мяжу.

Развіццё турыстычнай галіны неабходна працягваць, але захады, якія робіць Беларусь, выклікаюць насцярожанасць у нашага найбліжэйшага партнёра па Саюзнай дзяржаве. Пачынаючы з лютага 2016, расійскі бок без афіцыйнага паведамлення пачаў ажыццяўляць паўнавартасны пашпартны кантроль на мяжы. «Гэта ненармальна, калі паміж дзвюма брацкімі дзяржавамі і народамі зноў аднаўляецца граніца, якую мы з такімі намаганнямі знімалі больш за 20 гадоў таму», — пракаментаваў Прэзідэнт. Дарэчы, сёлета такія меры засцярогі сталі прычынай вялікіх чэргаў на выездзе з Беларусі пасля навагодніх свят, на якія прыехала шмат расіян.

Такі падыход расійскі бок абгрунтоўвае пытаннямі бяспекі, але ў абедзвюх дзяржаў ёсць сумесныя спісы іншаземцаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю Саюзнай дзяржавы, а паміж сілавымі ведамствамі наладжана сістэмнае супрацоўніцтва, таму бяспека цвёрда гарантуецца па знешнім контуры. У той жа час, калі Расія мае пэўную асцярогу, неабходна весці дыялог на гэту тэму, не закрываючыся адзін ад аднаго, абмяркоўваць, якія рознагалоссі захоўваюцца і як іх пераадолець. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за гэты год трэба за сталом перамоў вырашыць усе пытанні, якія ўзнікаюць паміж Беларуссю і Расіяй у гэтым кірунку.

Раней адзначалася, што ёсць ужо пэўныя распрацоўкі па далейшай лібералізацыі візавага рэжыму. Сярод іх — стварэнне камфортных умоў для наведвальнікаў II Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

### Каментарый у тэму

**Міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ** расказаў, што зараз ідуць перамовы з Еўрапейскім саюзам і Кітайскай Народнай Рэспублікай па лібералізацыі візавага рэжыму. З расійскімі калегамі ідзе прапрацоўка ўзаемнага прызнання віз. У найбліжэйшы час прапановы, атрыманыя ад расійскіх партнёраў, будуць праананалізаваны і дапрацаваны. Напрыканцы нарады па лібералізацыі візавага рэжыму кіраўнік знешнепалітычнага ведамства адзначыў:

— Былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з тым, якую карысць, якія дывідэнды нясе гэта (лібералізацыя візавага рэжыму — **Аўт.**) для дзяржавы. Вы ведаеце, у лютым мінулага года быў прыняты ўказ Прэзідэнта аб прадастаўленні права бязвізавага ўезду ў Рэспубліку Беларусь для грамадзян з 80 дзяржаў. На нарадзе быў правядзены аналіз сітуацыі, звязанай з гэтым. Мы канстатавалі, што адбыўся значны рост экспарту турыстычных паслуг у Мінску, у Брэсцкай вобласці, у Гродзенскай вобласці. У Мінску гэтая лічба нават складае 35 %. У цэлым тая лінія, якая ў свой час была адобрана кіраўніком дзяржавы, — лінія па лібералізацыі візавага рэжыму ў мэтах развіцця нашага турыстычнага і дзелавога патэнцыялу — з'яўляецца правільнай. Было прынята рашэнне і далей рухацца акуратна ў гэтым кірунку.

# ПРЭЗІДЭНТ ЗАЦВЕРДЗІЎ ПЛАН ПАДРЫХТОЎКІ ЗАКОНАПРАЕКТАЎ НА 2018 ГОД

**Адпаведны ўказ 10 студзеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе беларускага лідара.**

У адпаведнасці з планам, будуць падрыхтаваны і ўнесены ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу трыццаць дзевяць праектаў законаў. Пры гэтым шэсць законапраектаў з'яўляюцца прынцыпова новымі: праекты законаў «Аб плацежных паслугах у Рэспубліцы Беларусь», «Аб персанальных даных», «Аб электраэнергетыцы», «Аб радыяцыйнай бяспецы», «Аб ахове і выкарыстанні балот (тарфянікаў)» і «Аб судова-экспертнай дзейнасці».

Пяць законапраектаў складаюць так званы бюджэтны пакет. У іх ліку праект закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2019 год».

Астатнія законапраекты прадугледжваюць карэкціроўку дзеючага заканадаўства. Планцуецца ўнясенне змяненняў у шэраг кодэксаў, а таксама ў законы «Аб ахове працы», «Аб трансплантацыі органаў і тканак чалавека», «Аб гаспадарчых таварыствах», «Аб геаграфічных указаннях», «Аб аўдытарскай дзейнасці», «Аб дарожным руху», «Аб рэкламе», «Аб натуральных манаполіях», «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» і іншыя.

Акрамя таго, у 2018 годзе будуць падрыхтаваны і ўнесены Прэзідэнту на ўзгадненне дзве канцэпцыі праектаў законаў — «Аб дзяржаўных арганізацыях і гаспадарчых таварыствах з удзелам дзяржавы» і «Аб папярэджанні насілля ў сям'і».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТ ЗША АДВЁЎ НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ НА ПЕРАЕЗД ПАСОЛЬСТВА Ў ІЕРУСАЛІМ

**Для пераезду пасольства ЗША з Тэль-Авіва ў Іерусалім спатрэбіцца некалькі гадоў, паведаміў у эфіры тэлеканала Fox News віцэ-прэзідэнт ЗША Майкл Пенс.**

«Як вы ведаеце, прэзідэнт заявіў аб неабходнасці прыступіць да планавання, выбраць месца для размяшчэння пасольства і стварэння неабходнай інфраструктуры. Я думаю, што спатрэбіцца некалькі гадоў, перш чым мы разрэжам стужачку на цырымоніі адкрыцця пасольства ЗША ў Іерусаліме», — адзначыў віцэ-прэзідэнт, дадаўшы, што «рашэнне прынята, мы пераводзім наша пасольства ў сталіцу Ізраіля».

«На працягу ўжо больш за 20 гадоў адна адміністрацыя ЗША за другой, адзін склад Кангрэса за другім прызнавалі Іерусалім сталіцай Ізраіля. Аднак ні адзін амерыканскі прэзідэнт не адважваўся зрабіць крок наперад і ажыццявіць такое рашэнне. Прэзідэнт Трамп на аснове сваіх перакананняў прыняў такое рашэнне, і я падчас візіту ў Ізраіль палічыў гонарам для сябе пацвердзіць нязменнасць гэтага рашэння», — дадаў Пенс. Паводле яго слоў, Трамп такім чынам «пацвердзіў прыхільнасць ЗША працэсу мірнага ўрэгулявання на Блізкім Усходзе».

### У САВЕЦЕ БЯСПЕКІ ААН ВЫСТУПІЛІ СУПРАЦЬ ПАСЛАБЛЕННЯ САНКЦЫЙ У ДАЧЫНЕННІ ДА КНДР

**Дыпламаты шэрагу краін — членаў Савета Бяспекі ААН учора выказаліся супраць паслаблення санкцыйнага ціску на КНДР у адказ на рашэнне Пхеньяна ўступіць у дыялог з Сеулам. Як заявіў журналістам пастаянны прадстаўнік Вялікабрытаніі пры ААН Мэцью Райкрофт, у Савеце Бяспекі чакаюць ад паўночнакарэйскага боку спынення распрацоўкі ядзернай зброі і балістычных ракет.**

«Нам трэба, каб яны спынілі сваю незаконную дзейнасць», — дадаў Райкрофт. Паводле яго слоў, кожны правакацыйны крок Пхеньяна глыбока турбуе ўсю міжнародную супольнасць. «Мы хочам, каб гэтыя правакацыі і нарошчванне ракетнай і ядзернай праграм спыніліся і была дасягнута поўная дэнуклеарызацыя Карэйскага паўвострава», — падкрэсліў брытанскі прадстаўнік у ААН.

### НЯМЕЦКАЯ ПАЛІЦЫЯ СПЫНІЛА КАЛОНУ З БРАНЯТЭХНІКАЙ ЗША

**Калона грузавікоў па замове арміі ЗША перавозіла праз Саксонію самаходныя гаўбіцы. Паліцыя высветліла, што ў перавозчыкаў адсутнічалі неабходныя дакументы, да таго ж грузавікі былі празмерна цяжкія.**



Паводле паведамлення, інцыдэнт адбыўся на аўтабане А4 у прыдарожнай зоне адпачынку «Оберлаўзіц-Норд». Аўтамабільная кампанія, якую наняла армія ЗША, перавозіла з Польшчы ў Германію шэсць самаходных гаўбіц M109. Аднак транспартная паліцыя ў ходзе праверкі выявіла шматлікія парушэнні і не дазволіла калоне з шасці цягачоў рухацца далей. На польскую транспартную фірму і шафёраў будуць накладзены штрафы.

У паведамленні тлумачыцца, што ў кіроўцаў адсутнічалі дакументы і дазвол, неабходныя для транспарціроўкі падобнага грузу. Сам груз быў занадта шырокі і цяжкі: як паказалі вынікі праверкі, дапушчальная вага была перавышана на 16 тон. Паліцыя таксама канстатавала, што аўтакалона рухалася без прадугледжанага ў такім выпадку аўтамабіля суправаджэння, а некаторыя з кіроўцаў былі празмерна стомленыя з-за недахопу адпачынку.

## ■ Нашы дзеці

# ПАДЗЯЛІСЯ СВЯТАМ

**10 студзеня ў краіне завяршылася Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА лічыць, што задача — арганізаваць для ўсіх без выключэння дзяцей навагоднюю казку — была паспяхова вырашана. Дваццаць гадоў таму, калі гэта акцыя толькі стартавала, галоўнай мэтай было ахапіць святам найперш дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. А сёння ў яе ўцягнуты абсалютна ўсе дзеці: са шматдзетных сем'яў, з асаблівымі патрэбамі, таленавітыя і адораныя, тыя, якім патрабуецца асаблівая ўвага.**

Раіса Сідарэнка адзначыла адну станоўчую тэндэнцыю: у 1995 годзе ў Беларусі дзейнічалі 86 устаноў для дзяцей-сірот, а цяпер іх налічваецца толькі 44, і 80 працэнтаў дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, знаходзяцца на сямейных формах уладкавання.

У снежні аб сваім жаданні далучыцца да дабрачыннай акцыі афіцыйна заявіла каля 90 дзяржаўных арганізацый і прадпрыемстваў, але колькі насамрэч было ўдзельнікаў, падлічыць складана, бо ў мерапрыемствах прымалі ўдзел і грамадскія арганізацыі, і фонды, і камерцыйныя структуры, і прыватны бізнес.

«Сёлета зусім нечакана для нас з'явілася ініцыятыва прадпрымальнікаў, якія ў якасці спонсарскай дапамогі сабралі 960 тысяч рублёў і накіравалі гэтыя грошы ў дзіцячы анкалагічны цэнтр. Калі нараджаюцца такія ініцыятывы, мы разумеем, што акцыя «Нашы дзеці» — адна з самых важных у нашай краіне», — падкрэсліла Раіса Сідарэнка.

Рэспубліканскія органы перадалі ў дзіцячыя ўстановы матэрыяльную дапамогу, абсталяванне і падарункі ў памеры 1 мільён 180 тысяч рублёў (на 260 тысяч больш, чым у папярэднюю акцыю, і ў два разы больш, чым у перыяд акцыі 2015 года). Прычым у гэтай суме не ўлічаны падарункі Прэзідэнта, якія былі дадаткова накіраваны ва ўстановы спецыяльнай адукацыі, — гэта 2,5 тысячы развіццёвых гульняў і такая ж колькасць салодкіх падарункаў.

Кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў наведвалі дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, апякунскія і прыёмныя сем'і, дзіцячыя бальніцы, аказвалі ім дапамогу ў вырашэнні існуючых праблем.

Сапраўдным падарункам для тысячы юных беларусаў стала і магчымасць наведаць Палац Незалежнасці ў Мінску. 27 снежня сюды на сустрэчу з кіраўніком дзяржавы запрасілі таленавітых і адораных дзяцей, студэнцкую і творчую моладзь. А 4 і 5 студзеня дзверы палаца адчыніліся для дзяцей, якія патрабуюць асаблівай увагі.

— Мы лічым, што акцыя «Нашы дзеці» мае і вялікі выхаваўчы патэнцыял, — падкрэслівае Раіса Сідарэнка. — Дзеці, якім арганізавалі свята, імкнуцца падзяліцца святочным настроем з тымі людзьмі, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі: яны ідуць у дамы састарэлых, бальніцы, да ветэранаў, інвалідаў, выступаюць перад імі і дораць падарункі, зробленыя ўласнымі рукамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ■ Тэхналогіі

# НА «БЕЛАЗе» БУДУЦЬ ГАНДЛЯВАЦЬ ЗА БІТКОЙНЫ?

**Пакуль вы марыце пра тое, як правесці вечар пятніцы, і ў думках ужо знаходзіцеся не на працы, на «БелАЗе» спрабуюць прадаць тэхніку за крыптагрошы. Паводле інфармацыі, якую можна знайсці на афіцыйным сайце прадпрыемства, кампанія заўсёды стараецца ісці ў нагу з часам, а таксама рабіць сваю прадукцыю больш даступнай. Холдынг разглядае прапановы аб рэалізацыі прадукцыі за крыптавалюту з 11 па 30 студзеня.**

Ну а пакуль «БелАЗ» разглядае магчымасці, адзін з найбуйнейшых сусветных рынкаў крыптавалют — Паўднёвая Карэя, плануе прыняць закон, які забараняе іх абарот на сваіх біржах. Пад раздачу патрапіць у тым ліку і самая дарагая крыпта — біткойн. Улады Паўднёвай Карэі занепакоеныя магчымым ухіленнем ад выплаты падаткаў і развіццём крыптавалютнай гульнямані. На гэтым тыдні на некалькіх крыптавалютных біржах у Сеуле прайшлі праверкі падчас расследавання магчымага ўхілення ад выплаты падаткаў. Біткойн і іншыя віртуальныя грошы страцілі ў чацвер каля 10 % свайго кошту, прычым біткойн патаннеў да 13 тысяч долараў. Але, як кажуць эксперты, улічваючы нізкі ўзровень гандлю і досыць невялікую колькасць людзей, якія валодаюць віртуальнымі валютамі, рэзкія ваганні каціровак — нармальная справа.

На зніжэнне кошту біткойна, відаць, паўплываюць і планы Кітая аб абмежаванні «здабычы» крыптавалюты (майнінгу). На гэтую краіну сёння прыпадае каля 80 % сусветных магутнасцяў па «вытворчасці» самай дарагой крыптавалюты. Нядаўна міжведамасная група пад кіраўніцтвам Цэнтрабанка краіны выпусціла дырэктыву аб паступовым спыненні працы майнераў. У верасні рашэння Кітая ўжо паўплывалі на курс біткойна, калі выкікалі яго зніжэнне на дзве тысячы долараў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Фестывалім

# ГЛЕДАЧАМ ПАКАЖУЦЬ ГУЛЬНЮ Ў ЛЮДЗЕЙ

**У Магілёве расказалі, чым будзе здзіўляць гасцей міжнародны тэатральны маладзёжны форум «М.@rt.кантакт — 2018»**

**У Магілёве запахла вясной, якая ўжо больш за дзесяць гадоў асацыюецца ў гараджан з правядзеннем міжнароднага тэатральнага форуму. Дарэчы, гэты «М.@rt.кантакт» будзе 13-ы па ліку, і арганізатары абяцаюць, што гэта містычная лічба таксама будзе цікава абыграна.**

Прагама форуму больш чым насычаная. На працягу тыдня — з 21 па 27 сакавіка — будзе паказана 23 спектаклі 22 тэатраў з дзевяці краін свету — Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Казахстана, Літвы, Латвіі, Славакіі, Германіі. Асноўныя ўдзельнікі — намінанты і лаўрэаты міжнародных тэатральных прэмій. Некаторыя з іх ужо добра знаёмыя па ранейшых фестывалях і ўпадабаныя магілёўскім гледачом. Жанравая палітра як заўсёды разнастайная і інтрыгуючая — ад больш звыклых для слыху драмы і трагікамедыі да, напрыклад, гісторыі для раяля, скрыпкі, тэрменвокса і голасу або гульні ў людзей. Нікога ў Магілёве ўжо не здзіўляе, што пастаноўкі могуць быць прадэманстраваны і на альтэрнатыўных пляцоўках, напрыклад, у кавярні або ў музеі. Апошнія два гады вельмі ўдала для тэатральных паказаў выкарыстоўваўся этнаграфічны музей. «Гэты вопыт здаецца нам вельмі ўдалым, таму аргкамітэт ініцыяваў сёлета ў якасці эксперымента задзейнічаць плошчы абласнога мастацкага музея імя П. Масленікава», — паведаміў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ.** Свой праект «Цудоўнае і жахлівае» тут пакажа арт-група «Med a prach / Мёд і пыл» са Славакіі. Гэта нешта сярэдняе паміж галерэйнай інсталяцыяй, спектаклем і канцэртам.



Фота Галіны ХІТРЫКАВАЙ.

У афішы — славутыя тэатральныя калектывы сусветнага ўзроўню — Тэатр юнага гледача імя А. Бранцава і Тэатра Дзі Капуа з Санкт-Пецярбурга, кіеўскі тэатр «Залатыя вароты», нямецкі тэатр «Руская сцэна», Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Вахтангава з Масквы, Маскоўскі губернскі тэатр, якім кіруе Сяргей Бязрукаў. Пастаноўкі амаль спрэс авангардныя. «Толькі тры спектаклі паводле класічных твораў, астатнія — эксперыментальная тэатральная мова, дзесьці музыка і пластыка», — удакладніе **дырэктар Магілёўскага драматычнага тэатра Андрэй НОВІКАЎ.**

Дарэчы, Магілёўскі драмтэатр, парадуе сёлета гасцей форуму пастаноўкай «Жанчына мора» паводле Генрыка Ібсена ў інтэрпрэтацыі таленавітага тандэма ў складзе галоўнага рэжысёра тэатра Саўлюса Варнаса і мастачкі Юратэ Рачынскайце. Стваральнікі спектакля разам са славутым аўтарам даследуюць метафізіку кахання, жаночы пачатак, імкненне чалавека да шчасця.

Не менш насычаная будзе спецыяльная праграма. Аматараў сцэны чакае майстар-клас ад славутага тэатральнага мэтра Генадзя Трасцянецкага — прафесара, кіраўніка акцёрскіх і рэжысёрскіх курсаў Расійскага дзяржаўнага інстытута сцэнічных мастацтваў, уладальніка шматлікіх прэстыжных тэатральных прэмій. Будзе працаваць майстэрня маладой рэжысуры. Пад кіраўніцтвам вучаніцы Трасцянецкага Камілі Хусаінавай магілёўскія артысты на працягу тыдня падрыхтуюць эскіз да спектакля паводле апавядання Васіля Быкава «Жоўты пясочак».

Неад'емнай часткай форуму сталі штодзённыя абмеркаванні пастановак прафесійнымі крытыкамі і тэатразнаўцамі. Гэта практыка працягнецца. Больш за тое, актыўна будзе прыцягвацца да гэтых гутарак моладзь, ад тэатральных крытыкаў-пачаткоўцаў чакаюць смелага аналізу і ярких аналітычных публікацый для спецвыпуску форуму.

Білеты на пастаноўкі «М.@rt.кантакта» з'явяцца ў касах Магілёўскага абласнога драмтэатра ўжо 18 студзеня. Адначасова можна будзе забраніраваць месца ў зале праз сайт тэатра. У сярэднім задавальненне далучыцца да тэатральнага свята каштуе 15—20 рублёў. Самы дарагі спектакль — «Крык лангусты» Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Вахтангава, білет на яго каштуе больш за 35 рублёў. Бюджэт фестывалю сёлета складзе каля 170 тысяч рублёў. Палову сумы акупяць білеты, усё астатняе датуе абласны бюджэт.

Заснавальнікамі папулярнага тэатральнага фэсту з'яўляюцца Магілёўскі аблвыканкам, галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама, Магілёўскі абласны драматычны тэатр. За гады існавання «М.@rt.кантакта» ў Магілёве было паказана 190 спектакляў з 20 краін. Іх паглядзела больш за 40 тысяч гледачоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

## Улада слухае

**Па традыцыі, у гэтую суботу прамыя тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць прадстаўнікі ўлады ў сталіцы і рэгіёнах:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ВЯЛІЧКА, тэл. (80162213121);

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ, тэл. (80212222222);

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ, тэл. (80232331237);

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ, тэл. (80152735644);

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ, тэл. (80222501869);

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Алег Альфрэдавіч ПЛАЎСКІ, тэл. (80175004160);

першы намеснік старшыні МІНГАРВЫКАНКАМА Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ, тэл. (80172224444).

■ На слыху

# АГОНЬ АБАРВАЎ ПЯЦЬ ЖЫЦЦЯЎ

**Пяць чалавек загінула пры пажары ў Барысаўскім раёне.**



Паведамленне аб пажары ў жылым доме ў вёсцы Стайкі паступіла ў дзве гадзіны ночы 11 студзеня. Загінула пяць чалавек. Прычына пажару высвятляецца. Як растлумачыла афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія Швайбовіч, калі да месца выкліку прыбылі пажарныя-ратавальнікі, драўляны дом гарэў адкрытым полымем. Работнікі МНС у доме выявілі пяцярых загінулых мужчын.

Як праінфармавала афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінскай вобласці Таццяна Беланог, на месцы здарэння працуе следча-аператыўная група. Следчыя сумесна з экспертамі праводзяць агляд месца трагедыі, устанаўліваюцца асобы загінулых, сведкі, відавочцы. Праводзіцца комплекс першапачатковых следчых дзеянняў.

Крыху пазней Таццяна Беланог агучыла новую інфармацыю па справе. Былі вызначаны асобы загінулых грамадзян: жыхар дома 1986 года нараджэння, а таксама чацвёра іншых мужчын, якія былі ў гасцях: 1961, 1983, 1987, 1988 гадоў нараджэння. Як растлумачылі відавочцы, напярэдадні кампанія ў доме распівала спіртныя напоі, пры гэтым палілася печ. На падставе аналізу першасных следчых даных, па папярэдняй версіі, прычынай узгарання магло стаць неасцярожнае абыходжанне з агнём. Дакладная прычына смерці мужчын будзе вядомая па выніках судова-медыцынскіх экспертыз.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ХОЛАДНА, АЛЕ БЕЗ СНЕГУ

**На старце наступнага тыдня месцамі падмарозіць да мінус 15 градусаў**

**У гэтыя выхадныя і ў пачатку наступнага тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе вызначаць антыцыклон, які сфарміраваўся ў халодным паветры паўночных шырот, так што тэмпературны фон працягне зніжацца, а вось на снег разлічваць не выпадае, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам антыцыклону з цэнтрам над Ленінградскай вобласцю Расіі. На паўночным усходзе на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература днём будзе ад нуля да мінус 6 градусаў. А вось у гэтыя выхадныя захаваецца ўплыў антыцыклону, так што будзе без ападкаў. Антыцыклон прынясе хвалю халадоў. Так, у суботу тэмпература ўначы панізіцца да 4—10 марозу, па паўночным усходзе краіны пры праясненнях будзе да мінус 12 градусаў. Удзень значна цяплей — мінус 1—6 градусаў. Яшчэ халаднейшае надвор'е чакаецца ў нядзелю. Уначы на 14 студзеня тэмпература паветра апусціцца да 6—11 марозу, пры праясненнях месцамі паветра астудзіцца да мінус 12—14 градусаў. Днём чакаецца 2—7 градусаў са знакам мінус.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня ўмовы надвор'я па-ранейшаму будзе вызначаць антыцыклон, які перамесціцца на цэнтральныя раёны еўрапейскай часткі Расіі. У панядзелак і аўторак будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература ўначы мінус 7—13 градусаў, пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Удзень будзе 2—8 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# КАПРЫЗЫ ЗАХОДНЯЙ ДЗВІНЫ

**Як паведамлялася, у Віцебску вада з Заходняй Дзвіны выйшла з берагоў. Але асаблівых бед з-за гэтага не здарылася. Падтапіла частку набярэжнай, упрыгожанай гранітнымі плітамі. Паводка ў цэнтры горада зафіксавана ў раёне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Такое назіралася і раней, але не ў снежні—студзені.**

Паводле інфармацыі філіяла «Віцебскаблгідрамета», прычын «патопу» некалькі. У прыватнасці, лета было дажджлівае, параўнальна шмат ападкаў выпала і восенню, у пачатку зімы. Напрыклад, толькі ў снежні выпала 1,5 месячнай нормы ападкаў. Зімовыя дажджы цяпер, на жаль, сталі традыцыяй. Плюс растаў снег...

— У апошнія дні снежня павышэнне тэмпературы спрыяла поўнаму ачышчэнню рэк ад лёду. Далейшае пацяпленне прывяло да раставання снегу, што ў сукупнасці з выпадзеннем ападкаў выклікала рост узроўню вады. У асобныя дні інтэнсіўнасць росту ў Віцебску дасягала 56 сантыметраў за суткі. І ў выніку пачалося развіццё зімовай паводкі, пік якой сфарміраваўся 7 студзеня, — паведамілі ў філіяле.

Па стане на 8 студзеня, гідралагічная сітуацыя на рэках вобласці стабілізавалася, адзначаны невялікі спад узроўню вады. У далейшым, пры ўсталяванні надвор'я з паніжэннем тэмпературнага фону і адсутнасцю выпадзення ападкаў чакаецца далейшае падзенне ўзроўню вады. І рака пакрыецца льдом.

Бадай, больш за астатніх пакутуюць з-за капрызаў Заходняй Дзвіны жыхары гарадскога пасёлка Сураж Віцебскага раёна. Там жыве больш за 800 чалавек. Ён знаходзіцца прыблізна за 40 кіламетраў ад абласнога цэнтра. Да Расіі, як той казаў, рукой падаць. Заходняя Дзвіна падзяляе населены пункт на дзве часткі. У цёплую пару года людзей перавозяць на пароме, а калі ён не выкарыстоўваецца, то на катары з назвай «Тытанік». А па лёдзе арганізуюць спецыяльную пераправу. У сувязі з тым, што паром рамантуюць, а судна, як кажуць рачнікі, на «прыколе», частка «правабярэжных» суражан засталася без «Вялікай зямлі». Калі ехаць у аб'езд, трэба пераадолець мінімум 80 кіламетраў, а гэта каля дзвюх гадзін руху на транспарце...

Як нагадалі ў мясцовым сельвыканкаме, у такіх выпадках выкарыстоўваецца адпрацаваная гадамі сістэма. Напрыклад, вучні, якія не могуць хадзіць у сваю школу, вучацца ў іншай, сельскай. Тым, каму патрэбна медыцынская дапамога, выклікаюць «хуткую». Без прадуктаў людзі таксама не застаюцца, бо ёсць крама. Тутэйшыя жыхары спадзяюцца, што калі-небудзь будзе ўзведзены мост або ўлады знойдуць іншы варыянт, каб надвор'е не так уплывала на жыццё.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Нас чакае клімат Венеры

**Вядомы навуковец Стывен Хокінг заявіў, што кліматычныя ўмовы на Зямлі з цягам часу стануць невыносныя для людзей. Пра гэта піша лонданскае выданне Daily Mail.**

У гэтай брытанскай газеце фізік-тэарэтык сцвярджае, што планета Зямля паўторыць лёс Венеры. Паводле яго слоў, змяненне клімату прывядзе чалавецтва да вымірання, а Зямля з-за гарачыні ператворыцца ў сапраўднае пекла. Калі людзі не скароцяць выкіды парніковага газу, то з цягам часу сярэдняя тэмпература на нашай планеце дасягне 460 градусаў па Цэльсію, лічыць навуковец. Калі прагноз вучонага апраўдаецца, то чалавецтву трэба будзе шукаць сабе новую планету для жыцця.

Між іншым, эксперты NASA лічаць, што 4 млрд гадоў назад Венера была падобная на Зямлю, мела атмасферу, акіяны і расліннасць, але па цэлым шэрагу прычын планета пазней «згарэла».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# НАСТАЎНІКІ СЕЛІ ЗА ПАРТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Можна гадамі нічога не змяняць у сваёй практыцы і настальгіраваць па савецкай школе і паслухмяных вучнях, а можна хоць бы ў зоне сваёй адказнасці паспрабаваць змяніць сістэму адукацыі да лепшага, пацікавіцца апошнімі адукацыйнымі трэндамі і дзяліцца сваімі прафесійным досведам і знаходкамі з іншымі.

Як заўважыла **начальнік галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА,** усе папярэднія фестывалі былі вельмі розныя: класічныя і рамантычныя, сур'ёзныя і жартоўныя, мадэрнісцкія і постмадэрнісцкія, з педагагічнымі капуснікамі і КВЗ, калі зала літаральна пішчала ад захаплення. Але якія б тэмы і формы ні абіраліся, галоўнае — на фестывалі ніколі не было сумна!

Лейтматывам VII Рэспубліканскага каляднага фестывалю стаў дэвіз «Вопыт лепшых — здабытак кожнага». Падчас яго было арганізавана 15 секцый, у рамках якіх за два дні праведзена 113 мерапрыемстваў: прадметных і міжпрадметных майстар-класаў, урокаў для дарослых, інтэрактыўных перапынкаў, педагагічных студый, трэнінгавых заняткаў. Свайм досведам з калегамі падзяліліся 127 найлепшых педагогаў краіны (пераважна настаўнікі-метадысты), якія прадстаўлялі ўсе рэгіёны краіны. Многія з іх былі на першых фестывалях звычайнымі слухачамі, а сёння ўжо выступаюць у ролі ментараў. Дарэчы, асноўныя арганізатары фестывалю — Асацыяцыя настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне», клуб «Хрустальны журавель» і Беларускае педагагічнае таварыства. А паколькі літаральна некалькі месяцаў таму ў краіне завяршыўся конкурс «Настаўнік года», то да фестывалю далучыліся яго фіналісты і суперфіналісты, якія таксама праводзілі для калег майстар-класы.

## Інтрыга на ўроку

**Пераможца Рэспубліканскага конкурсу педагагічнага майстэрства «Настаўнік года — 2017» Святлана РУМЯНЦАВА,** якая выкладае беларускую мову і літаратуру ў Баравухскай сярэдняй школе № 15 г. Наваполацка, прысвяціла свой майстар-клас сістэме пазнавальных заданняў.

— Я шукала сродкі, якія дапамогуць мне зрабіць маіх вучняў пасляховымі і ў вучобе, і ў стасунках з іншымі, і ў дарослым жыцці, і для мяне такім сродкам сталі пазнавальныя заданні, — канстатавала педагог. — Яны скіраваны на пошук новых ведаў, актыўнае выкарыстанне ў навучанні сувязяў і доказаў, патрабуюць актывізацыі памяці, увагі, фантазіі, мыслення. Пазнавальныя заданні павінны выкарыстоўвацца сістэмна, з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў, іх узросту, жыццёвага досведу, чаргавацца, утрымліваць элемент навізны, абапірацца на міжпрадметныя сувязі.

Для размінкі настаўнікам было прапанавана пагуляць у «Інтрыгу», а фактычна ў сапсаваны тэлефон. Сакратар інфармуе настаўніка: «Дырэктар школы Іван Пятровіч паехаў у 11 гадзін, не дачакаўшыся вас. Вельмі засмуціўся, што не змог пагутарыць, і папрасіў вам перадаць, што калі ён не вернецца да абеду, а гэта будзе залежаць ад таго, колькі часу ён правядзе на нарадзе ў аддзеле адукацыі, то майстар-клас трэба правядзіць без яго ў 14.30. Дарэчы, на нарадзе абмяркоўваецца пытанне аб пастаўцы новых камп'ютараў, якія нічым не горшыя за імпартныя. Пасля майстар-класа трэба аб'явіць маладым спецыялістам, што яны павінны прайсці інструктаж па запаўненні класнага журнала ў 219-м кабінеце з 9 да 12 гадзін». Натуральна, што апошні з удзельнікаў гэтага выпрабавання, які зайшоў у аўдыторыю, пачуў толькі вельмі аддаленую версію агучанай інфармацыі.

— Па-першае, такое практыкаванне спрыяе развіццю камунікатыўных навыкаў, але разам з тым яно ўказвае на распаўсюджаную прафесійную памылку. Мы ўсе, у тым ліку і я, вельмі любім на ўроку гаварыць самі. Але калі будзем гаварыць толькі мы, то які працэнт інфармацыі затрымаецца ў галовах нашых дзяцей? На сваіх уроках трэба прапаноўваць вучням такія заданні, якія навучаць іх здабываць веды самастойна, бо толькі тыя веды застануцца з імі на ўсё жыццё, якія яны знойдуць самі, — упэўнена Святлана Румянцава. — Але на першым этапе наша задача — стварыць для кожнага вучня сітуацыю поспеху.

Выдатнае заданне, скіраванае на развіццё псіхічных працэсаў, — «Чароўная торбачка». Педагог выкарыстоўвае гэты прыём не толькі для трэніроўкі памяці ў вучняў, але і для папаўнення іх небагатага слоўнікавага запасу. У торбачку настаўнік кладзе дзесяць звычайных прадметаў, якія на беларускай мове гучаць па-іншаму, для прыклада, каву, нататнік, пашпарт, насоўку, аловак, гузікі, нажніцы, цукеркі, гумку, завушніцы (варыянтаў — безліч). Калі ў вучня атрымаеццааднавіць у памяці ўсе 10 прадметаў, ён можа пахваліцца выдатнай памяццю. 8—9 прадметаў — вельмі добрай памяццю. А вось у тых, хто можа прыгадаць менш як шэсць прадметаў, памяць «кульгае».

## У вандроўку... па літаратурным квэсце

**Ірына КАЗАЧЭНКА, настаўнік беларускай мовы і літаратуры з Лельчыцкай раённай гімназіі,** расказала, што ў пошуках спосабаў, як жа зацікавіць вучняў беларускай літаратурай, выйшла на тэхналогію вэб-квэстаў.

— Размова ідзе пра пазнавальную гульню з прыцягненнем інтэрнэт-рэсурсаў. Падчас яе вучні выбіраюць для сябе ролі, прапанаваныя настаўнікам, вывучаюць інфармацыю з інтэрнэт-рэсурсаў (іх пералік рэкамендуе педагог) і такім чынам вырашаюць (індывідуальна ці ў групе) вучэбную задачу. Ад настаўніка патрабуецца распрацаваць сцэнарый вэб-квэсту, падрыхтаваць серыю заданняў для ўсіх яго ўдзельнікаў (пытанняў, на якія трэба знайсці адказ, праблемных сітуацый), вызначыць крытэрыі ацэньвання вынікаў і прадумаць урок, на якім будуць падводзіцца вынікі квэсту, — тлумачыць Ірына Казачэнка. — Але спачатку трэба стварыць інтрыгу, прадумаць легенду, каб дзеці зацікавіліся асобай літаратара.

Вось адзін з прыкладаў такой легенды: «Вялікі сын вялікага народа. Першаадкрывальнік многіх тэматычных пластоў у нацыянальнай літаратуры. Выдатны мастак слова і не менш выдатны гісторык. Фатограф-прафесіянал. Непераўзыдзены жартаўнік, душа многіх і многіх кампаній... Эрудыт, якіх мала ведала і мала зведае зямля Белай Русі. Сапраўдны таварыш, сябра. Народны заступнік. Заступнік нацыі... Усё гэта — пра хлопца з Оршы, з наддняпроўскай кручы...

*Быў. Ёсць. Буду.*
*Таму, што заўжды, як праклятлы,*
*Жыву бяздоннай трывогай,*
*Таму, што сэрца маё распята*
*За ўсе мільярды двухногіх.*

Такія радкі ў пасмяротнай кнізе «Быў. Ёсць. Буду» мог напісаць толькі той, хто свядома распяў сябе, як Ісус Хрыстос, на крыжы ў імя людскога роду. Так і здарылася на самай справе: песняра не прызнавалі ці прызнавалі напалову. З пакутніка-заступніка здзекаваліся за тое, што ён паказваў сапраўдны, драматычны, складаны і разам з тым легендарна-гераічны лёс зямлі пад белымі крыламі. Што выхоўваў у жывых любоў да нацыянальнага, роднага. Што шанаваў і ўздымаў на нечуваную вышыню старонкі забытай гісторыі. Яму не далі пры жыцці званне народнага, а ён стаў амаль самым чытаным, самым дарагім для абсалютнай большасці беларусаў пісьменнікам».

Клас дзеліцца на падарожнікаў, літаратуразнаўцаў і біёграфаў. Заданне для апошніх — скласці прэзентацыю «Радавода Караткевіча», для падарожнікаў — стварыць карту Google і пазначыць на ёй месца нараджэння пісьменніка, мясціны, дзе ён атрымаў адукацыю, даведацца пра сямейную легенду яго роду, сфармуляваць галоўную заслугу перад беларускай літаратурай. Задачы для літаратуразнаўцаў — скласці анталогію выдадзеных ім кніг, даведнік «Сімволіка аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха», прыдумаць віктарыну па творчасці Уладзіміра Караткевіча з цытатамі з яго вершаваных і празаічных твораў.

Безумоўна, каб падрыхтаваць вэб-квэст, трэба быць вельмі апантаным чалавекам. Пакрокавы сцэнарый адымае шмат часу, але вынік таго варты: старшыя школьнікі з задавальненнем пагружаюцца ў прапанаваную ім літаратурную гульню і адпаведна ў беларускую літаратуру. Ірына Казачэнка распрацавала ўжо **восем літаратурных вэб-квестаў, якія знаходзяцца ў свабодным доступе на сайце https://questlit.jimdo.com:** «Без смешнага няма сатыры», «Прамова фактамі», «Дарогамі першадрукароў», «Эпоха Барока», «Беларускаму дудару» і іншыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*




**«Лесвіца поспеху» з пазнавальных заданняў.**




**Святлана РУМЯНЦАВА: «Усе настаўнікі вельмі любяць на ўроку гаварыць самі. Але які працэнт інфармацыі затрымаецца ў галовах нашых дзяцей?»**

# Цуд і для бальніцы

**Каля 150 дабрачынных мерапрыемстваў правялі на Гомельшчыне валанцёры піянерскай арганізацыі і БРСМ — удзельнікі дабрачыннай акцыі «Цуды на Калядах».**

Сёлета да акцыі далучыўся Гомельскі абласны камітэт Камуністычнай партыі Беларусі. Падарункі ад іх атрымалі больш за 3,5 тысячы дзяцей, якія выхоўваюцца ў розных спецыяльных сацыяльных установах.

**Старшыня Гомельскай абласной піянерскай арганізацыі Арцём КАРПЕНКА** расказаў, што заключны этап акцыі адбыўся ў Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Там валанцёры руху «Добрае сэрца» і піянеры-цімураўцы правялі казачнае прадстаўленне і інтэрактыўную забаўляльную праграму. А ў завяршэнне перадалі адміністрацыі ўстановы аховы здароўя сертыфікат на суму 2,5 тысячы рублёў. Сабраныя сродкі прызначаны для далейшай рэканструкцыі бальніцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## Навука

# НОВЫЯ ПРЭПАРАТЫ: ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ І РАСЛІН

**У Нацыянальнай акадэміі навук традыцыйна назвалі топ-10 вынікаў працы за 2017 год у галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў. У выніковы спіс увайшлі найлепшыя работы айчынных вучоных з розных інстытутаў.**

Сярод тых, хто трапіў у дзясятку, — калектыў Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, які займаўся фундаментальнымі даследаваннямі і распрацоўкай малагабарытнага мабільнага суперкамп'ютара, прызначанага для апрацоўкі вялікіх масіваў даных і рашэння задач высокададкладнага мадэлявання і праектавання. Вельмі высока была ацэненая і работа аўтарскага калектыву НПЦ па матэрыялазнаўстве па распрацоўцы і сінтэзе кампазіцыйных і нанаструктурных магнітных матэрыялаў, якія забяспечваюць высокія функцыянальныя ЗВЧ-характарыстыкі і абарону вырабаў мікраэлектронікі ад дэстабілізавальнага вонкавага ўздзеяння.

Навукоўцы з Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі трапілі ў топ за стварэнне метадаў і праграм разліку аптычных сячэнняў атамных ядраў з гарантаванай дакладнасцю, што прымяняюцца пры вырашэнні навуковых і інжынерных задач атамнай энергетыкі. Калектыў Інстытута біяарганічнай хіміі НАН — за ўстанаўленне малекулярнага механізма падаўлення імунітэту чалавека мікабактэрыямі Mycobacterium tuberculosis з мэтай стварэння супрацьтуберкулезных прэпаратаў новага пакалення. Яшчэ адзін калектыў з Інстытута біяарганічнай хіміі быў уключаны ў топ за выяўленне новага ўніверсальнага індыкатара антыаксідантнага патэнцыялу для дыягностыкі ўстойлівасці чалавека да акісляльнага стрэсу.

Самую высокую ацэнку атрымаў і старшы навуковы супрацоўнік Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі, кандыдат біялагічных навук, дацэнт Сяргей Федаровіч — за ўстанаўленне механізма парушэнняў сінаптычнай перадачы ў нейронах у жывёл пры гіпаксіі, карэкцыя якіх дазваляе абараніць мозг ад пашкоджанняў пры ішэмічным інсульце.

За выяўленне і інактывацыю генаў рэгуляцыі біясінтэзу антымікробных метабалітаў у бактэрый, што дазваляе стварыць сродкі абароны раслін новага пакалення, адзначаны калектыў аўтараў Інстытута мікрабіялогіі. Навукоўцы Інстытута глебазнаўства і аграхіміі стварылі мікробную кампазіцыю, якая спалучае ўласцівасці біяўгнаення, рэгулятара росту і біяфунгіцыду.

У Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры і Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі распрацавалі метадалогію канвертавання электроннага арфаграфічнага запісу беларускіх слоў у фанетычную транскрыпцыю і стварылі першы поўны беларускі лінгвістычны даведнік.

У лік пераможцаў увайшлі таксама і навукоўцы Інстытута гісторыі НАН — за адкрыццё на Палессі ўнікальных для сусветнай гістарычнай навукі славянскіх паселішчаў, а таксама раскрыццё працэсу фарміравання і развіцця раннеславянскай супольнасці на тэрыторыі Беларусі.

Узнагароджанне пераможцаў будзе прымеркавана да Дня беларускай навукі, які адзначаецца ў канцы студзеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*






## «ХТО ЯМУ КАПАЕ, ТОЙ САМ ТУДЫ І ТРАПЛЯЕ»

Гэта сапраўды так: добры сусед лепш, чым сем далёкіх родзічаў, бо менавіта ён, калі што, першы прыйдзе на дапамогу... Ён жа разважыць і нешта параіць. Да таго ж з ім, як, мусіць, ні з кім, добра пасядзець за кубачкам чаю ці нечага іншага.

Прыкладна так, па-сяброўску ці нават па-брацку, жылі на ўскраіне гарадка Міхась са Сцяпанам. Любілі яны разам махнуць на рыбалку, потым пасёрбаць юшкі...

Але ж жарты таксама строіць любілі. А ўжо якія!..

Неяк раз, летам, па дарозе з работы Міхась прачуў, што ім peралічылі зарплату. Дык чаму б, падумаў, не атрымаць яе, не парадаваць тым самым жонку, сям'ю...

Зрабіць гэта хацеў, падобна, не ён адзін: да банкамата вялікая чарга сышлася. Факт, што пакуль дастаяўся, на неба хмары набеглі, пасыпаў дождж . Міхась яшчэ пашкадаваў, што парасона няма. Але ж грошы свае атрымаў (што прыемна, зусім новымі, хрусткімі паперкамі), у нагрудную кішэньку паклаў ды гайда дадому.

І як быццам жа хутка ішоў, можна сказаць, нават подбегам, а змок усё роўна.

Дома найперш да трусоў раздзеўся, грошы з кішэні дастаў. Убачыў, што яны таксама змоклі. Але ж, вырашыў, гэта не бяда. На кухні, над газавай плітой, у іх вяровачка нацягнута. Рыба на ёй амаль што дасохла. Можна, значыць, зняць, а купюры падвесіць — прышчэпкамі «падхапіць».

Міхась з гэтым лёгка справіўся. А толькі злез з табурэткі, — стук у дзверы пачуў. «І каго ж прынесла? — падумаў. — У жонкі ключ павінен быць. Можа, хіба забылася?»

Патэпаў у вітальню, нясмела (ведама, голы амаль) прыадчыніў дзверы, а там сусед. І па-свойску так:

— Здароў!

— Здароў.

— Ты чаму раздзеты?

А сам тым часам на кухню ідзе (яны там звычайна сядзелі), грошы на вяровачцы бачыць:

— Што гэта? — пытае ў Міхася, вылупіўшы вочы.

— А то не бачыш, — злуе на суседа той. — Грошай трохі надрукаваў — толькі што скончыў, павесіў сушыцца... Прынесла цябе нячыстая... Кажы, чаго?

А Сцяпан з таго перапуду... забыўся.

— Проста так, — сказаў ды рушыў дамоў.

Адысціся не паспеў, — участковы яму насустрач.

— Дзе ходзіш? — пытае, павітаўшыся.

— Ды вось у суседа быў, у Міхала. Хацеў пасядзець з ім, патрындзець крыху, але ён надта ж часу не мае — заняты: грошы сабе друкуе.

Участковы, як быццам, міма вушэй гэты «сігнал» прапусціў — нічога больш не распытваў, але ж сам да Міхася адразу падаўся: так і так, маўляў, паказвай, як «вытворчасць» наладзіў, дзе хаваеш станок?

— Які? Няма ў мяне ніякага станка, — адпіраецца той.

Але ж вяровачка ў кухні вісіць, грошы на ёй сохнуць, прычым новыя-новыя!

— Адкуль? — пытае ўчастковы.

— Ды з банкамата... Зарплату сёння атрымаў, пад дождж трапіў.

Не верыць яму ўчастковы: розныя пытанні задае, збіраецца ўрэшце панятых запрашаць, вобшук рабіць у хаце.

А Міхась між тым ужо скумекаў, хто яго ўчастковаму «здаў». Вось і кажа:

— Прабач, служывы, падмануў я цябе. Ёсць станок, але ж я яго суседу пазычыў. Ну вельмі прасіў...

Калі ўчастковы прыйшоў да Сцяпана, той якраз быў справай заняты. І, вядома ж, не грошы друкаваў, а... гарэлку гнаў: толькі-толькі першачку дачакаўся.

Прыйшлося ўчастковаму новы пратакол складаць.

...Прыяцелька там у сведках была, яна і расказала.

**Лілія Скіндзер.**

*г. Івацэвічы.*

## КАБ ЖА НЕ ПЕЎ

Вы думаеце толькі ў яўрэяў ёсць завядзёнка, што нявесту жаніху (і наадварот...) падбіраюць родныя? У нас, беларусаў, намеры тыя ж. Мы таксама стараемся некага пазнаёміць, звесці ў пару: запрасіць, напрыклад, у госці альбо на талаку... Раптам хлопец з дзяўчынай убачаць адно аднаго, раптам спадабаюцца?

...Помню, нашы сябры свайго сына жанілі. На вяселлі з іхняга боку ўсе знаёмыя былі. Адзінае — нейкі дзяцюк побач з Аленай. Яна — дзеўка, адным дзелам, харошая, хоць, можа, у дзеўках і засядзелася.

А сябры выкладалі ў прафтэхвучылішчы. Там жа, разам з імі халасцяк адзін працаваў: хлопец сур'ёзны, адказны, завочна ў інстытуце вучыўся. Вось яны і падумалі, чаму б не пазнаёміць яго з Аленай? Да пары ж як быццам: таксама сур'ёзная, працавітая, а ўжо ў лесе дык ёй і наогул роўных няма, усе грыбныя мясцінкі ведае, вёдрамі ягады носіць...

І вось тое вяселле, дзень першы, усё ідзе як належыць. Тыя двое побач сядзяць, размаўляюць, нават знешне выглядаюць падобнымі (абое ёмкія, светлавалосыя)... Разам нешта п'юць ды ядуць, парачкай танцуюць, «Горка!» маладым крычаць...

Назаўтра ўсе крыху прытаміліся. Шмат хто з маладых да рэчкі падаўся, мужчыны заселі ў карты гуляць, жанчыны — свае размовы весці, а баяніст — нештачка пілікаць. Каля яго таксама кампанія сабралася — паслухаць. І Алена там. З кавалерам.

Хто ж ведае: можа, той падвыпіўшы быў, можа, занадта шчаслівы? Факт, што ён заспяваў — гучна, нават дзіка, бо словы песень ведаў, а вось мелодыю...

Спачатку музыка паспрабаваў быў яму падыграць, але не даў, бедны, рады і сціх.

Пакрысе, пакруціўшы пальцамі ля скроняў, ад гарлапана сталі адыходзіць госці. Куды вочы глядзяць, збегла і Алена. А кавалер, як цецярук, усё спяваў і спяваў...

Карацей, не зладзілася тое сватаўства. Хлопец праз нейкі час ажаніўся з іншай. Знайшла сабе пару і Алена. На першы погляд і ў адной сям'і, і ў другой усё нармальна, усе шчаслівыя. Хоць, як падаецца, маглі быць яшчэ шчаслівейшыя (і даўно), калі б ён не запеў.

**Любоў Чыгрынава,**

*г. Мінск.*

## НОЧ НА КАЛЯДЫ

Нашы суседзі, расіяне, кажуць, што няпрошаны госць горш, чым татарын (альбо не горш... Хрэн за рэдзьку не саладзейшы).

Не любілі нязваных і нашы продкі. Казалі, што ім лыжкі нямашака, што іх месца — пад сталом, а то і наогул за парогам. Але ж гэта — як правіла, з якіх заўсёды бываюць выключэнні.

Дык вось. У маёй сяброўкі Мілы ў маладосці была вельмі цікавая каляжанка. Па тым часе ў яе было досыць рэдкае імя — Нэлі. Ды і захапленне таксама. Яна, у прыватнасці, вельмі любіла розныя кампаніі, танцы, бяседы. Яна ў іх, як у вір кідалася... І на гадзіннік тады ніколі не глядзела, бо навошта? Дадому, як правіла, яна ішла не адна: знаходзіўся нейкі праважаты. Хоць і не заўжды.

Аднойчы, акурат на Каляды, Нэлі вярталася з гасцей сама, прычым вельмі позна. Грамадскі транспарт ужо не працаваў, таму дзяўчына «тармазнула» машыну. У ёй сядзела двое маладых хлапцоў, і выглядалі яны досыць прыстойна, таму дзеўка без асаблівых ваганняў уступіла з імі ў размову, а потым — села ў салон.

Хлопцы, як высветлілася, нікуды не ехалі — проста каталіся па начным горадзе, можна сказаць, шукалі прыгод ды дзяўчат. У іх нават шампанскае з сабою было, якім яны збіраліся завяршыць гэты вечар, пажадана — у прыгожай кампаніі.

— Можа, у вас сяброўка ёсць? — запыталі ў Нэлі.

— Ёсць, — нядоўга думаючы адказала дзяўчына. — Жыве ў прыватным доме. І цяпер, напэўна, адна. Бацькі яе да сваякоў на свята збіраліся...

Мабільнікаў тады не было. Ды і звычайныя, правадныя тэлефоны стаялі далёка не ў кожнага. Таму ў госці кампанія паехала «татарамі» — без папярэджання, без запросінаў.

...Міла, прачнуўшыся ад іхняга стуку, выглянула ў акно, убачыла Нэлі і, вядома ж, пайшла адчыняць: як была — у начной кашулі, заспаная, непрычасаная, бо нават у думках не мела, што госця можа быць не адна, а з нейкімі хлопцамі.

Праганяць іх, Нэліных «сяброў», а тым больш у Калядную ноч, неяк не выпадала. Прыйшлося запрасіць у хату...

У выніку вечар, а дакладней — астатак ночы, прайшоў вельмі рамантычна: новыя знаёмцы прасядзелі ледзь не да раніцы: пілі віно і каву, размаўлялі, жартавалі.

Што цікава, адзін з тых хлопцаў з першага позірку закахаўся ў Мілу і літаральна праз некалькі дзён зрабіў прапанову рукі і сэрца.

...Значыцца, праўду кажуць: каму ў голаў зайдзе, той і за печчу знайдзе. Але ж, здараецца, знайдзе не сам. Трэба, каб нехта дапамог: той самы сябар з машынай, альбо першая сустрэчная — ноччу, на вуліцы, у ноч на Каляды.

Зрэшты, яе «подзвіг» ды па сённяшнім часе я паўтараць бы не раіла: сцеражонага бог сцеражэ. Ці не так?

**Людміла Касяк,**

*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***Ад яе ж.*** *Шчыры дзякуй усім чытачам, якія адгукнуліся на просьбу «пажурыць» конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю. «Найвышэйшай адзнакай я ацаніў 12 твораў, надрукаваных у 2017-м і, каб не пакрыўдзіць нікога са сваіх выдатнікаў, прапаную на разгляд журы ўсю сваю дванаццатку», — піша спадар Мікалай Старых з Гомеля.*

*Спіс, як той казаў, дадаецца: «С. Гурскі «Не руш чужых груш» («Звязда», 28.01), А. Несцяронак «Любоў не блінцы» (17.02) і яе ж «Кабыла на ганак не палезе» (10.03), І. Валуевіч «Дурныя жарты пахвалы не варты» (31.03), І. Гаральчук «Жонку слухай, а свой розум май» (21.04), С. Кусянкова «На вайне, як на вайне» (21.04), Г. Нічыпаровіч «Юшка з дабаўкай» (12.05), С. Чыгрынава «А не шкодзь» (2.09), А. Палынскі «Рыцарскі паядынак» (14.10), Ніна С. «Ты спачатку паглядзі» (24.11), Віталь Г. «Перастараўся» (1.12), Юрый К. «План «Перахоп» (8.12).*

*Такім чынам спадар Старых (ды іншыя...) свой выбар зрабілі. Блізкае да таго ж і журы звяздоўскае. Але ж тут, як падаецца, чым больш меркаванняў, тым лепш. А таму зусім не позна яшчэ нешта (альбо ўсё) перачытаць, некага падтрымаць...*

*Вынікі конкурсу ў наступным нумары.*

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПРАБЛЕМА КАМУНІКАТУ

## Пра лёгкасць быцця і праўду жыцця

З Наталляй мы пазнаёміліся даўно, яшчэ ў мінулым тысячагоддзі. Дагэтуль як сімвал тых бесклапотных маладых часоў успамінаецца яе здымная «хрушчоўка» дзесьці за Кіеўскім скверам, у якой заўжды быў натоўп людзей, віно, гітара, натхнёныя спрэчкі і разумныя размовы пра будучыню краіны і свету ўвогуле. І заўсёды ў цэнтры ўвагі гаспадыня — велікавокая, з пушыстымі хвалістымі валасамі — летуценная дзяўчынка, якую, здавалася, зусім не турбуюць побытавыя пытанні: як ёсць, так і добра.

Яна сапраўды пырхала па жыцці, як лёгкі матылёк. І ўвесь час чымсьці ці кімсьці захаплялася. Загарэлася нейкай ідэяй — скажам, з'ездзіць у якое небяспечнае месца — усе намаганні прыкладала і трапляла-такі. У зону ўзброенага канфлікту, напрыклад, — іх тады і ў Еўропе хапала. Дзеля чаго? Дзеля адрэналіну, як сама казала, дзеля вострых адчуванняў. Каб было што ўспомніць, пра што з прыдыханнем расказваць, каб удзячныя слухачы сядзелі ашаломленыя і ўражаныя. Спадабаўся чалавек — магла гадзінамі гаварыць пра яго, надзяляць самымі найлепшымі якасцямі (здаралася, нават ілгуноў і мярзотнікаў, якія каля тых якасцяў і блізка не стаялі). Карысталіся гэткай яе імпульсіўнасцю ўсе без выключэння прадметы яе захаплення: жанчыны — дзеля якой карыслівай выгады (пазычыць грошай, узяць панасіць сукенку ці пакарыстацца касметыкай і не спяшацца вяртаць), мужчыны... самі разумееце. Наталля іх прыцягвала, бы магніт, і яркай знешнасцю, і гэтай самай сваёй лёгкасцю, якая ні да чога не абавязвала, і закаханай адданасцю, нядоўгай, але такой шчырай і сапраўднай.

ЯК вынік — шлюб у васямнаццаць (канешне ж, па каханні!), гучны развод праз пару гадоў: муж яе «застукаў» з чарговым прадметам захаплення. І Сонька — дзіця ад таго нядоўгага шлюбу. Ёй ужо было гадоў шэсць, дзяўчынка жыла з маці, падчас шумных застолляў у іхняй аднапакаёвай кватэры яна ціхенька сядзела ў кутку пад таршэрам, нешта сама сабе корпалася, ніяк не звяртала на сябе ўвагу навакольных. Усе да Сонькі былі прывыкшы, як да прадмета інтэр'ера ці да хатняга гадаванца. Зрэдку хтосьці прыносіў ёй які гасцінец, дзяўчынка незадаволена буркала «дзякуй» і працягвала займацца сваімі справамі. «У яе праблемы з камунікатам», — з усмешкай тлумачыла маці, даючы ўсім зразумець, што насамрэч гэта ніякая не праблема. Нават калі Соньцы прыйшоў час ісці ў школу, і ў паліклініцы пры аглядзе настойліва параілі паказаць дзіця псіхатэрапеўту, Наталля не асабліва хвалявалася. «Уяўляеце, яна на тэсце ў псіхолага намалявала людзей з тварамі, зафарбаванымі чорным», — расказвала пасля нават з гонарам ад таго, што ў дачкі такое нетыповае арыгінальнае мысленне...

Як Сонька пайшла ў школу, я ўжо не ведала: выпала з кола зносін Наталлі гэтаксама лёгка і нечакана, як туды трапіла. Аднойчы проста зайшла «на агеньчык» — а дзверы адчынілі ўжо іншыя кватаранты. Мабільнікі тады былі вялікай рэдкасцю, паведаміць аб сваім пераездзе якім іншым спосабам прыяцелька патрэбным не палічыла. Асаблівай скрухі з гэтай нагоды я, прызнацца, не адчувала. Так, яшчэ адзін прыемны эпізод з успамінаў маладосці, якія з цягам часу змяшаліся ва ўяўленні ў нейкую суцэльную карціну, падобную да твораў імпрэсіяністаў: размытыя абрысы і скрозь празрыста-светлыя фарбы...

ТАМУ, калі мы гадоў дзесяць назад сустрэліся ў метро, я Наталлю нават не адразу пазнала. Яна трымала за руку крыху перапалоханага велікавокага хлопчыка гадоў пяці. «Знаёмся: гэта Васька, мой сын», — сказала пасля прывітання нязмушана, нібы не бачыліся мы з ёй нейкія два тыдні. Пакуль ехалі, паспела расказаць мне пра новыя свае захапленні. З бацькам Ваські пажаніліся (канешне, па каханні!), яна паехала з ім кудысьці пад Рагачоў, дзе ў яго быў свой дом. Развяліся амаль адразу пасля нараджэння сына: Наталлю паклікаў за сабой у Маскву мужаў стрыечны брат, які прыехаў у госці. Ваську пакінулі бацьку, але той запіў, давялося кідаць усё, бо ў хлопчыка былі ўсе шанцы трапіць у дзіцячы дом, а ў яе — пазбавіцца бацькоўскіх правоў. Новы мужчына, пакуль яна вырашала пытанні з малым, ужо страціў да яе цікавасць, таму вяртацца не было куды. Паехала ў родны пасёлак, дзе пасля смерці бацькоў засталася невялікая кватэрка ў двухпавярховым доме. Так бы і прападала там у правінцыі, але тут з'явіўся новы кавалер — прадпрымальнік з Мінска, які прывозіў прадаваць да іх цукар і крупы. Ён харошы чалавек, забраў яе з малым у сталіцу, праўда, аказаўся раўнівы і скупаваты. Наталля ад яго сышла, уладкавалася ў страхавое агенцтва («Але гэта ненадоўга, у мяне тут цікавая ідэя, збіраюся адкрыць ІП, — захоплена дзялілася планамі, а вялікія вочы ззялі, як у маладой дзяўчынкі). «Во, дык мы па суседстве жывём. Заходзь, калі што. У нас шмат моладзі збіраецца, весела». «Соньчыны сябры?» — нарэшце ўдалося спытаць пра старэйшую дачку. «Соньчыны? Не, мае. Сонька ў чатырнаццаць гадоў сама бацьку знайшла і да яго жыць папрасілася. Сёлета некуды паступала, але не ведаю, ці паступіла — даўно не званіла. Ну, ты, калі што, заходзь». Усунула мне ў руку візітоўку страхавой фірмы і пашыбавала на прыпынак рашучымі крокамі. Маленькі пануры хлопчык, ад якога за ўвесь час я не пачула ні гуку, подбегам ледзь за ёй паспяваў.

ПАЗАЎЧОРА мы зноў сустрэліся ў метро. Гэтым разам я доўга не пазнавала яе, нават гледзячы ва ўпор. Усе мы не маладзеем, але... Павіталіся, пагаварылі. Коратка і неяк... няёмка, ці што? Вярнулася Наталля ў тую ж бацькоўскую кватэру ў пасёлку. Пакуль не працуе, але збіраецца адкрыць ІП: прыязджала ў Мінск даведацца, якія патрэбны дакументы. Сын, скончыўшы дзевяць класаў, паступіў у каледж, жыве ў інтэрнаце, дамоў прыязджае рэдка. Маці не крыўдзіцца: «Грошай я яму ўсё роўна даць не магу, а што яму тут рабіць?» Сонька выйшла замуж за добрага хлопца, нарадзіла дзяўчынку, ёй ужо два гады. Толькі ні ўнучкі, ні зяця Наталля яшчэ не бачыла і ў найбліжэйшы час наўрад ці ўбачыць. «Ты ж ведаеш маю Соньку. У яе заўжды была праблема камунікату», — сказала, нібы апраўдваючыся.

Я пасля доўга думала: перад кім?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

Директор **ООО «Арбитр»** Долгов Р. С. сообщает, что собрание кредиторов по защите требований ООО «Дубовые просторы» в сумме 7 511 рублей 60 копеек по делу № 119-36/2017 о банкротстве в отношении ООО «СКМ-Строй» (591011631) состоится **31.01.2018** в **16.00** (в помещении экономического суда Гродненской области по адресу: г. Гродно, ул. Советских пограничников, 102, холл 1-го этажа). Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу управляющего ООО «Арбитр»: г. Гродно, ул. Суворова, д. 127, корп. 5, каб. 411, тел. 80152 530715.

УНП 590995276

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение акционерного общества | **ОАО «Элегант»** Минская область, г. Жодино, пр. Ленина, 22 |
| Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров | Наблюдательный совет ОАО «Элегант» Протокол заседания № 22 от 10.01.2018 года |
| Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров | **11 января 2018 года** |

УНП 600039318

# mastercard РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «УЧАСТВУЙ В РОЗЫГРЫШЕ АВТОМОБИЛЯ С MASTERCARD»

Завершилась Рекламная игра «Участвуй в розыгрыше автомобиля с MasterCard».

Срок начала Рекламной игры – 1 июня 2017 г.

Срок окончания Рекламной игры – 20 февраля 2018 года.

Для того чтобы стать участником рекламной игры и участвовать в розыгрыше подарочных сертификатов «Корона» номиналом 50,00 руб ежемесячно и автомобиля Skoda Octavia, было необходимо в период с 1 июня по 31 декабря 2017 года включительно:

• осуществить безналичную операцию оплаты товаров с использованием банковской карты MasterCard® (за исключением банковских карт Maestro и Белкард/Maestro) на любую сумму от 15,00 (пятнадцати) белорусских рублей 00 копеек и более в одном чеке на территории проведения Рекламной игры;

• в один из следующих этапов:

Этап 1: с 01.06.2017 (00.00) по 30.06.2017 (23.59.59)
Этап 2: с 01.07.2017 (00.00) по 31.07.2017 (23.59.59)
Этап 3: с 01.08.2017 (00.00) по 31.08.2017 (23.59.59)
Этап 4: с 01.09.2017 (00.00) по 30.09.2017 (23.59.59)
Этап 5: с 01.10.2017 (00.00) по 31.10.2017 (23.59.59)
Этап 6: с 01.11.2017 (00.00) по 30.11.2017 (23.59.59)
Этап 7: с 01.12.2017 (00.00) по 31.12.2017 (23.59.59);

• ввести регистрационные данные на странице Рекламной игры www.promo.korona.by:

1. дату совершения Операции;
2. код авторизации (код, подтверждающий осуществление банком-эмитентом авторизации, состоит, как правило, из 6 цифр и печатается в карт-чеке);
3. последние 4 цифры платежной карты Участника;
4. фамилию, имя и отчество Участника;
5. номер мобильного телефона Участника;
6. адрес электронной почты Участника;
7. почтовый адрес Участника (индекс, населенный пункт, улица (проспект, переулок и т.д.), дом, корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии));

• разместить скан или фотографию карт-чека в соответствующем поле на странице Рекламной игры.

Территория проведения Рекламной игры: магазины «Корона» (за исключением секций «Модный Молл»), находящиеся на территории Республики Беларусь, а именно:

| № п/п | Наименование торгового объекта | Адрес магазинов «Корона» |
|---|---|---|
| 1 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Кальварийская, 24 |
| 2 | Магазин «Корона» | г. Минск, пр-т Победителей, 65-1 |
| 3 | Магазин «Корона» | г. Минск, пр-т Независимости, 154 |
| 4 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Корженевского, 26 |
| 5 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Янки Брыля, 24-184 |
| 6 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Кунцевщина, 37-113 |
| 7 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Одинцова, 9-67 |
| 8 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Одинцова, 20, пом. 11 |
| 9 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Могилевская, 2, корп. 1, помещения № 1, 9, 10 |
| 10 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Сурганова, 57а |
| 11 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Судмалиса, 3а |
| 12 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Сторожевская, 8, пом. 26н |
| 13 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Барамзиной, 8а |
| 14 | Магазин «Корона» | г. Минск, ул. Олешева, 1, пом. 314 |
| 15 | Магазин «Корона» | Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Минская, 69а-1 |
| 16 | Магазин «Корона» | Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Заречная, 1в-3 |
| 17 | Магазин «Корона» | Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 28а, район аг. Щомыслица |
| 18 | Магазин «Корона» | г. Брест, ул. Московская, 210 |
| 19 | Магазин «Корона» | г. Брест, ул. Пуганова, 4 |
| 20 | Магазин «Корона» | г. Брест, ул. Сябровская, 99а |
| 21 | Магазин «Корона» | г. Барановичи, пр-т Советский, 2-1 |
| 22 | Магазин «Корона» | г. Барановичи, ул. Кирова, 101/1 |
| 23 | Магазин «Корона» | г. Бобруйск, ул. 50 лет ВЛКСМ, 33-3 |
| 24 | Магазин «Корона» | г. Бобруйск, ул. М. Горького, 36 |
| 25 | Магазин «Корона» | г. Витебск, шоссе Бешенковичское, 3-1 |
| 26 | Магазин «Корона» | г. Витебск, ул. Гончарная, 11 |
| 27 | Магазин «Корона» | г. Витебск, пр-т Московский, 109-1 |
| 28 | Магазин «Корона» | г. Витебск, пр-т Черняховского, 44-213, 44-214 |
| 29 | Магазин «Корона» | г. Витебск, пр-т Строителей, 11 |
| 30 | Магазин «Корона» | г. Борисов, ул. III Интернационала, 5 |
| 31 | Магазин «Корона» | г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 29 |
| 32 | Магазин «Корона» | г. Гродно, пр-т Янки Купалы, 16а-1 |

Организатор Рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью "Пиар квадрат", УНП 191682518, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 7 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191682518.

Юридический адрес Организатора: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, пом. 24.

Наименование Рекламной игры: «Участвуй в розыгрыше автомобиля с MasterCard».

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3023 от 30.05.2017 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

В Рекламной игре приняли участие 93 421 человек.

Результаты проведения Рекламной игры «Участвуй в розыгрыше автомобиля с MasterCard» с указанием полного списка победителей приведены на сайте **www.promo.korona.by**

Призовой фонд Рекламной игры был разыгран в полном объеме.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры +375 44 544 00 50.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Смолевичский РКБО» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

__**Лот № 1:**__ **комплексный приемный пункт** общей площадью 50,0 кв. м, инв. № 614/С-33420, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624882004601000266 площадью 0,0262 га, по адресу: Минская область, Смолевичский район, Заболотский с/с, д. Орешники.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 16 000,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (1 600,00 бел. руб.)**

__**Лот № 2:**__ **комплексный приемный пункт** общей площадью 65,1 кв. м, инв. № 614/С-33437, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624882002601000305 площадью 0,0360 га по адресу: Минская область, Смолевичский район, Заболотский с/с, д. Заболотье.

Земельный участок имеет ограничение прав в использовании: охранная зона линии электропередачи (0,0045 га).

**Начальная цена с НДС (20 %) – 27 000,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (2 700,00 бел. руб.)**

**Смолевичским районным исполнительным комитетом совместно с продавцом установлены условия продажи объекта:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Задатки 10 % от начальной цены перечисляются на р/с № BY55 BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.</u>

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Белорусская Нива» от 21.11.2017 г. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **25.01.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.01.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | ОАО «СтанкоГомель», г. Гомель, ул. Интернациональная, 10 |
| **Месторасположение предмета аукциона** | г. Гомель, ул. Интернациональная, 10 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)**

| Наименование объекта | Инвентарный номер | Площадь, кв. м | Назначение |
|---|---|---|---|
| **Ремонтно-строительного и модельного цеха** | 350/С-111643 | 1202 | Здание обрабатывающей промышленности иного назначения |
| Составные части и принадлежности | 5 пристроек, склад, крыльцо, 2 лестницы, навес | | |
| **Пилорама** | 350/С-111641 | 82 | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель |
| **Здание склада упаковщиков** | 350/С-111683 | 164,6 | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| **Склад ГСМ** | 350/С-78236 | 72,6 | |
| **Склад цемента** | 350/С-111637 | 263,7 | |
| **Здание склада огнеупоров** | 350/С-166018 | 190,1 | |
| **Склады** | 350/С-111636 | 73,3 | |
| Составные части и принадлежности | склад, склад углекислоты, контора, крыльцо | | |
| **Склад лакокрасок** | 350/С-111639 | 266,7 | |
| Составные части и принадлежности | навес 25 кв. м, ворота, забор 9 м, забор 20 м, забор 15 м, забор 27 м, покрытие 3976 кв. м | | |
| **Весовая** | 350/С-111638 | 80,7 | Здание неустановленного назначения |
| **Мойка автомашин** | 350/С-111642 | 7,3 | |
| Составные части и принадлежности | эстакада с емкостями для сбора и отстоя сточных вод (по данным тех. паспорта) | | |

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания технических строений на праве постоянного пользования пл. **0,8294 га**

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 150 800,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.02.2018** в 11.00 по адресу **г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.02.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

**Таблица № 1**

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% | № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автопогрузчик с инв. № 6 | 3 552,00 | 2 | Автопогрузчик вилочный б/у г/п 2 тн. FG20 (Митсубиси) с инв. № 211 | 16 032,00 |

*В отношении имущества, указанного в таблице № 1, проводятся вторые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 30.11.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 20 %. Окончание приема заявлений в 16.00 23.01.2018 г.*

**Таблица № 2**

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% | № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Утеплитель multi 40мм (1,2х0,58; толщ.40, 576 шт.) | 2 643,84 | 4 | Утеплитель instal 50 мм (1,2х0,58; толщ. 50, 605 шт.) | 3 861,59 |
| 2 | Утеплитель flex 80мм (1,2х0,6; толщ. 80, 493 шт.) | 4 637,55 | 5 | Утеплитель top 20 мм (1,2х1,2; толщ. 20, 476 шт.) | 2 925,12 |
| 3 | Утеплитель ultra 60мм (1,25х0,58; толщ.60, 633 шт.) | 5 414,43 | | | |

*В отношении имущества, указанного в Таблице № 2, проводятся первые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 30.11.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10 %. Окончание приема заявлений в 16.00 23.01.2018 г.*

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения торгов | **26 января 2018 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Задаток | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | ООО «Фрондера», +375 29 305-86-50 |
| Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122 | |
| Информация о продавце | Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ», г. Минск, ул. Селицкого, д. 39 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122) |
| Условия для участия в торгах | До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах, назначенных на __.__.2018, по Лоту №__ (Табл. №_). Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah.<br>Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях после возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету) в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.<br>В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона |

■ Экатурызм

# ГЛЯДЗІ, ЛЮБУЙСЯ. НЕ НАШКОДЗЬ!

## Ці трэба пускаць турыстаў у запаведнікі?

**Захаванне некранутасці прыродных тэрыторый — адна з галоўных задач запаведнікаў і нацыянальных паркаў. Гэта неабходна ўлічваць пры развіцці экалагічнага турызму ў Беларусі, упэўнены спецыялісты Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

### Стаўка — на «зялёны» турызм

— Беларусь — адна з самых багатых на прыродныя адметнасці краін на постсавецкай прасторы: тут налічваецца каля 1300 каштоўных прыродных аб'ектаў, плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый складае 8,7% ад плошчы краіны, — адзначае **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Некранутасць беларускай прыроды, яе багаты жывёльны і раслінны свет павінны прываблiваць у гэтыя месцы больш людзей, якія цікавяцца менавіта экалагічным турызмам.

Па словах спецыяліста, прыродныя экасістэмы маюць павышаную папулярнасць сярод турыстаў, што не заўсёды ідзе ім на карысць. На жаль, не ўсе, хто наведвае такія тэрыторыі, разумеюць іх каштоўнасць і асаблівыя патрабаванні да адпачынку.

— Пакінутае смецце і шматлікія вогнішчы на тэрыторыі асабліва ахоўных прыродных тэрыторый — Мінпрыроды не за такі турызм, — падкрэсліў Мікалай Свідзінскі. Пры гэтым ён упэўнены: ААПТ могуць і павінны быць адкрыты для наведвання, але пры строгім выкананні турыстамі прыродаахоўных нормаў.

Таму стаўку адміністрацыям прыродаахоўных устаноў лепш рабіць на развіццё экалагічнага турызму: арганізацыю арніталагічных тураў, фотапалявання, назірання за пэўнымі працэсамі ў натуральным асяроддзі, навуковыя сустрэчы і экаадукацыю. Пры гэтым без дасканалай падрыхтоўкі спецыялістаў, экскурсаводаў (веданне замежных моў, біялагічная спецыялізацыя і інш.) цяжка дасягнуць поспехаў у развіцці гэтага кірунку, лічыць спецыяліст.

### Знаёмячы з прыродай, абараняць яе

Экалагічны турызм — спецыялізаваны, але і высокадаходны кірунак, упэўнены **малодшы навуковы супрацоўнік навуковага аддзела Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Мікіта ЯКУБОЎСКІ.** Нягледзячы на тое, што гэты блок турыстычных патокаў — не самы папулярны сярод звычайных грамадзян, ён нясе значную выгаду як у прыродаахоўным, так і ў эканамічным аспектах.

У мінулым годзе ў Белавежскай пушчы зафіксавана каля 465 тысяч прыбыццяў турыстаў (колькасць наведванняў аб'ектаў). У асноўным у нацпарк прыязджаюць прадстаўнікі масавага турызму: каб наведаць вальеры з жывёламі, музей прыроды, рэзідэнцыю Дзеда Мароза; пакатацца на веласіпедах, лыжах; пабываць на аглядных экскурсіях; адпачыць на прыродзе і г. д. Развіваецца ў пушчы і паляўнічы турызм.



Прыроданакіраваны, ці экалагічны, турызм цікавіць больш падрыхтаваных наведвальнікаў. Для турыстаў тут прапануюцца шматдзённыя паходы па назіранні за дзікімі жывёламі (аленямі, зубрамі, дзікамі), арганізуюцца эколага-асветніцкія туры для навукоўцаў (па вывучэнні фаўны і флоры), наведванне ўнікальных прыродных тэрыторый, што захаваліся ў натуральным стане (дубравы, ліпнякі, насаджэнні піхты белай), праводзяцца семінары і канферэнцыі, навуковыя даследаванні.

— Экалагічны турызм вельмі працазатратны, ён закранае цэлы комплекс пытанняў і патрабуе значнай прафесійнай падрыхтоўкі экскурсаводаў і іншых спецыялістаў, — адзначыў Мікіта Якубоўскі. — Акрамя таго, кошт такіх тураў значна вышэйшы ў параўнанні з масавым.

Але пры гэтым, па словах спецыяліста, вышэйназваная дзейнасць найбольш літасціввая ў адносінах да прыроды. Да таго ж высокі кошт паслуг набліжае даходы экалагічнага турызму да даходаў масавага. Так, напрыклад, 97 удзельнікаў арнітыалагічнага тура «Птушкі першабытнага лесу», які з'явіўся ў нацпарку ў мінулым годзе, папоўнілі яго казну на $9,5 тыс. Пры гэтым бёрдвотчынг, ці назіранне за птушкамі, — паслуга сезонная (праводзіцца ў веснавы перыяд).

Сярод замежных прыхільнікаў экалагічнага турызму ў Белавежскай пушчы — жыхары Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Польшчы. Нашы заходнія суседзі таксама і ў спісе самых актыўных бязвізавых наведвальнікаў нацпарку праз міжнародны турыстычны пагранпераход «Перароў — Белавежа». Такі шлях выбіраюць тыя, хто плануе здзейсніць пешыя, веласіпедныя, конныя прагулкі па нацыянальным парку, пакатацца зімой на лыжах. За няпоўны 2015 год праз гэты пагранпераход Белавежскую пушчу наведала 1985 чалавек, у 2016-м — 4370, у 2017-м — 4471.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

# Калі ў парыльні — суседзі па раёне

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Некаторыя гараджане ўжо па 20 гадоў сюды ходзяць, — заўважае загадчык. — Моладзі мала: у іх не прывіта культура наведваць лазню. Для навічкоў я часам сам праводжу інструктаж. Тлумачу, што галаву лепш не мачыць перад парыльняй, каб пазбегнуць перагрэву. А першы заход павінен быць не больш за пяць хвілін. Калі навічок няправільна папарыцца і будзе дрэнна сябе адчуваць, ён сюды не вернецца, а нам трэба прыцягваць кліентаў.

Дзяжурный медсястры ў лазні няма, але пры неабходнасці першую дапамогу акажуць супрацоўнікі ўстановы. Абавязковы мінімум, які спатрэбіцца ў грамадскай парыльні, — дыванок, шапачка, ручнік. Жанчынам лепш узяць яшчэ рукавіцу, каб абараніць скуру ад апёкаў. А вось з селядцом і півам не прапусцяць.




Лазня № 7.

— Некаторыя па звычцы прыносяць з сабой слоікі з грыбамі і іншыя закускі, — прызнаецца Вячаслаў Кіргіз, — але мы змагаемся з гэтым. Староннія пахі будуць перашкаджаць іншым наведвальнікам. Трэба адыходзіць ад стэрэатыпаў. Ёсці ў лазні людзі не павінны — для гэтага ў нас ёсць бар.

### ВЫРАТАВАННЕ АД ПРАСТУДЫ І ЦЭЛЮЛІТУ

Мінчанка Вольга бывае ў гэтай грамадскай лазні тры-чатыры разы на месяц. «Тут добрая пара», — хваліць. Жанчыне 57 гадоў, але выглядае значна маладзейшай.

— Бо ў лазню хаджу, — смяецца. — Нават цэлюліт «разганяе» ў маім узросце. Як папарусся, адчуваю сябе цудоўна! Ты папраўляеш здароўе, расслабляешся і атрымліваеш задавальненне. Памятаеце, як казалі ў «Іроніі лёсу»? «Працэс мыцця, які ў лазні выглядае як урачысты абрад, у ванне — проста змыванне грязі».

Іншы наведвальнік ва ўзросце Віктар ужо 20 гадоў не можа жыць без лазні. Венікі ён прыносіць свае — іх яму вяжа знаёмы рамеснік.

— Бяру бярозавыя або бярозава-рабінавыя. Чуў, што найлепшы час для вязкі такіх венікаў — пасля свята Тройцы і да дня Пятра і Паўла. Да гэтага перыяду лісты бярозы ўжо добра выспелі, не ліпкія і не ападаюць, — дзеліцца Віктар.

Маладыя хлопцы Аляксей і Юрый шкадуюць, што ў горадзе мала лазняў, у якіх паляць з дапамогай газу. «Яны больш камфортныя, бо газавыя печкі, у адрозненні ад электрычных, не спальваюць кісларод», — тлумачаць яны. У лазні сябры бываюць кожны тыдзень, часам і па два разы. Паміж заходамі ў парыльню п'юць гарбату са скрыпеню і ліпы, якую Юрый робіць сам. «Увогуле вядзём здаровы лад жыцця. Ныраем у палонку, дзюдо займаемся».

Яшчэ адзін гараджанін Канстанцін рэгулярна ходзіць у лазню апошнія пяць гадоў. «Навошта? Таму што не хачу кашляць і смаркацца. За гэтыя пяць гадоў ні разу не хварэў». Венік мужчына выбірае з дубу («бо гэта дрэва — сімвал даўгалецця») або канадскага клёну. Тое, што ў грамадскай лазні прыходзіцца дзяліць парыльню з незнаёмцамі, яго не бянтэжыць. Наадварот — так можна завесці новую кампанію.

— Лазню варта вярнуць у спіс сацыяльна значных паслуг (так было да 2016 года: лазні фінансаваліся з бюджэту, і цэны, адпаведна, былі значна ніжэйшыя. — **Аўт.**), — упэўнены Канстанцін. — Гэта ж здароўе насельніцтва, таму паслугі павінны быць даступныя.

### ЗАЧЫНЯЦЬ УСТАНОВЫ НЕ ЗБІРАЮЦЦА

Пра тое, ці чакаць павышэння цэн і ці ўдаецца ўстановам выходзіць у «плюс», расказаў **дырэктар прадпрыемства «Гарадскія лазні» Анатоль МАРЧАНКА.** Самыя актыўныя карыстальнікі грамадскіх парыльняў — пенсіянеры. Яны складаюць 50 працэнтаў ад усіх наведвальнікаў. У летні час і па кастрычнік уключна для гэтай катэгорыі дзейнічае зніжка — 10 працэнтаў. Часта пенсіянеры набываюць абанементы ў лазні — так сеансы таксама абыходзяцца танней.

— У пажылых людзей больш часу. Асабліва гэта адчуваецца ў будныя дні, — тлумачыць Анатоль Марчанка. — Мы спрабавалі прыцягнуць і студэнтаў. Сустракаліся з моладдзю, якая вучыцца ва ўніверсітэце культуры (ён знаходзіцца побач з лазняй № 7), але вялікага патоку гэта не дало.

Адзін сеанс у гарадскіх лазнях (дзве гадзіны) каштуе восем рублёў. Там, дзе ёсць басейн, — 10 рублёў.

— Цана не мянялася з 2016 года. І ў найбліжэйшы час падымаць яе не плануем, бо даходы ў нашага насельніцтва растуць не вельмі хутка. Але калі павялічыцца кошт электра- і цеплаэнергіі, давядзецца пераглядзець тарыфы, — кажа Анатоль Марчанка.

Сабекошт наведвання летам складае 10 рублёў. Восенню і зімой, калі лазнямі карыстаюцца часцей, ён меншы. Магчыма, яго яшчэ ўдасца знізіць. Кіраўніцтва лазняў звярталася да дэпутатаў Мінгарсавета з просьбай зменшыць для іх каэфіцыент да стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць (цяпер аплата гэтых падаткаў займае ў сабекошце каля 40 працэнтаў).

Круглы год рэнтабельна працуюць толькі лазня № 7 і комплекс «Лазня». У кастрычніку—лістападзе на самаакупнасць выйшлі таксама грамадскія парыльні № 3, № 8 і № 11. Астатнія застаюцца ў «мінусе».

— Але зачыняць установы мы не збіраемся, — адзначае дырэктар. — Калі летам на два тыдні адключаюць гарачую ваду і лазні закрываюць, людзі адразу скардзяцца. Тым больш наведвальнасць павялічваецца: калі ў снежні 2016 года ў нашых парыльнях пабывала 32 тысячы чалавек, то ў мінулым снежні — 35,6 тысячы, на 11 працэнтаў больш.

Каб аб'екты сталі больш прыбытковыя, развіваюць дадатковыя паслугі. У некаторых установах працуюць бары. У комплексе «Лазня» адкрылі кавярню з уласнай кухняй. Плюс там ёсць трэнажоры, асобна прадаюцца абанементы ў басейн, у тым ліку і на заняткі аквааэробікай. «Грамадскае харчаванне дае 16 працэнтаў выручкі, фізкультурныя працэдуры — каля 10. Гэта ндрэнна», — лічыць Анатоль Марчанка.

На рэканструкцыі знаходзіцца лазня № 1. Работа чакаецца вялікая: цалкам прыбяруць сцены ўнутры, перакладуць камунікацыі. Ад старога памяшкання застанецца толькі фундамент. У лазні плануецца зрабіць басейн з 25-метровымі дарожкамі, два агульныя аддзяленні на 46 чалавек, джакузі, нумары «люкс», кавярню на 48 пасадачных месцаў. Адкрыць абноўленую ўстанову плануюць у 2019 годзе.

Сам Анатоль Марчанка — прыхільнік традыцыйнай лазні, якая паліцца на дровах.

— У нас, на жаль, у горадзе ні адной такой няма. Была раней на вуліцы Баграціёна, але насельніцтва, якое жыло побач, пачало скардзіцца на задымленне. Таму цяпер усюды ў грамадскіх лазнях стаіць або электрычная, або газавая печка.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# Жывуць кот і сабака...

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Карова чорная, ды ... белае (прык.). **4.** Ласкавае ... дзве маткі ссе (прык.). **7.** Валы не равуць, авечкі не бляюць, калі ў яслях ... (прык.). **9.** Такая ..., як з казла: ні воўны, ні малака (прык.). **10.** Дзіцяня авечкі. **14.** Завіруха. **15.** Прыстасаванне для далучэння праводоў да машыны, прыбора. **16.** Драпежны звярок сямейства куніц, які вядзецца ў Паўночнай і Цэнтральнай Амерыцы. **18.** Жыве кот і сабака, ды ... не аднака (прык.). **19.** Тое, што і збан. **20.** Не для пса ..., не для ката сала (прык.). **23.** Роды кошкі, казы, авечкі. **24.** Шчасце не конь — у ... не запражэш (прык.). **25.** ... сівее ад галавы, а сабака ад морды (прык.).

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** «Хадзіў коцік пад ..., // Лавіў рыбку за хвасток». З паэмы Я. Коласа «Сымон — рэспуснік». **2.** Міфалагічны цар птушак. **3.** «Існуюць ... верныя сябры: старая жонка, стары сабака і наяўныя грошы». Б. Франклін. **5.** Мужчынскае імя. **6.** Вечназялёная расліна, якая паразітуе на іншых дрэвах. **8.** Агледзелася ... праз сем год, што сучка без хваста (прык.). **11.** «Ляціць конь — агонь // І канёк — ...». З верша П. Панчанкі «Запішыце каня ў Чырвоную кнігу». **12.** Гаспадар чаго-небудзь. **13.** «Купі сабаку. Гэта адзіны ... купіць любоў за грошы». Я. Іпахорская. **17.** ... робіць дастатак (прык.). **18.** Вадкая частка стравы. **20.** Варона з кала — сем на ... (прык.). **21.** Карова цяліцца, а ... раве (прык.). **22.** Рака, прыток Волгі.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Малачко. 4. Цялятка. 7. Сена. 9. Карысць. 10. Ягня. 14. Пурга. 15. Клема. 16. Скунс. 18. Жытка. 19. Жбан. 20. Каўбаса. 23. Акот. 24. Аглоблі. 25. Чалавек.
**Па вертыкалі:** 1. Масток. 2. Кук. 3. Тры. 5. Ясь. 6. Амяла. 8. Нявестка. 11. Гарбунок. 12. Уладар. 13. Спосаб. 17. Статак. 18. Жыжка. 20. Кол. 21. Бык. 22. Ака.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.23 | 17.14 | 7.51 |
| Віцебск — | 9.19 | 16.56 | 7.37 |
| Магілёў — | 9.13 | 17.03 | 7.50 |
| Гомель — | 9.02 | 17.08 | 8.06 |
| Гродна — | 9.37 | 17.30 | 7.53 |
| Брэст — | 9.30 | 17.38 | 8.08 |

### Месяц

*Апошняя квадра 9 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр. Давыда, Іосіфа, Макара, Марыі, Якава.*
*К. Аркадзя, Таццяны.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**12 СТУДЗЕНЯ**



У краіне

**1895** год — у Мінску на правым беразе Свіслачы, каля вадапомпавай станцыі, пачала працаваць электрастанцыя, якая забяспечвала работу 390 лямпачак напальвання для асвятлення вуліц (Петрапаўлаўскай, Праабражэнскай, Губернатарскай), летняга і зімняга тэатраў, прыватных дамоў.

**1919** год — нарадзіўся (в. Канічы Касцюковіцкага раёна) Васіль Фёдаравіч Хомчанка, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і гумарэсак, кнігі «Чырвоны мак» і «Чырвоныя хвалі», рамана «Вяртанне ў агонь» і іншых твораў. Напісаў сцэнарыі да фільмаў «Вецразі майго дзяцінства», «Незнаёмая песня». У 1937 годзе быў рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1969-м. Памёр у 1992 годзе.

**1941** год — нарадзіўся (г. Свярдлоўск) Уладзімір Георгіевіч Мулявін, музыкант, заснавальнік і мастацкі кіраўнік беларускага ансамбля «Песняры». Народны артыст Беларусі і СССР. Свой жыццёвы і творчы лёс ён назаўжды звязаў з Беларуссю. З 1962 года Уладзімір Мулявін працаваў артыстам Беларускай дзяржаўнай філармоніі. А ў 1969 годзе стаў мастацкім кіраўніком створанага ім ансамбля «Песняры». Непаўторны талент Уладзіміра Мулявіна, увасоблены ў творчасці «Песняроў», адкрыў новую эпоху ў беларускім эстрадным мастацтве. У яго выдатных песнях багатая музычная і паэтычная спадчына беларускага народа набыла сучаснае гучанне. Мулявін быў таксама выдатным спеваком, уладальнікам прыгожага драматычнага тэнара, яго голас пазнавалі з першай ноты.

**1963** год — нарадзіўся (в. Новы Двор Пінскага раёна) Іван Аляксеевіч Кібак, беларускі псіхолаг, дзяржаўны дзеяч, кандыдат псіхалагічных навук. Аўтар навуковых прац па праблемах юрыдычнай псіхалогіі, псіхалогіі кіраўніцтва і заканатворчасці, псіхалагічнага забеспячэння дзейнасці праваахоўных органаў.



У свеце

**1903** год — нарадзіўся Ігар Васілевіч Курчатаў, савецкі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, акадэмік АН СССР. Галоўны навуковы кіраўнік атамнага праекта ў СССР, адзін з заснавальнікаў ідэі выкарыстання ядзернай энергіі ў мірных мэтах. Лаўрэат Ленінскай прэміі і чатырох Сталінскіх прэмій. Ганаровы грамадзянін СССР, Тройчы Герой Сацыялістычнай Працы. Памёр у 1960 годзе.



**1998** год — на еўрапейскай канферэнцыі нацыянальных камітэтаў па біяэтыцы ў Парыжы быў адкрыты да падпісання Пратакол аб забароне кланіравання (Пратакол да Еўрапейскай Канвенцыі аб правах чалавека і біямедыцыне ад 4 красавіка 1997 года) — першы міжнародны юрыдычны дакумент, які забараняе кланіраванне чалавека.

## УСМІХНЕМСЯ

**Хочаш правесці незабыўную ноч? Прымі роды.**

— А што такое колер «электрык»?
— Ну, гэта такі сіні з шэрым адценнем.
— Дзіўна, учора прыходзіў сантэхнік, а твар у яго — электрык.

**Выкладчык дзіцячага гуртка лепкі, цішком падмяніўшы пластылін цестам і фаршам, адкрыў краму крафтавых пельменяў.**

Дзеці — кветкі жыцця :)
Вовачка пытаецца ў маці:
— Мама, а ў таты ёсць бацькі?
— Вядома ёсць. Ты што, забыўся? Бабуля Люся і дзядуля Лёня.
— А навошта яны тады яго нам аддалі?..

**Таварыства сляпых шукае сакратарку, прыемную навобмацак.**

— Учора жонка мяне ў краму адправіла.
— Ну і што?
— Слухай, ты проста не ўяўляеш сабе, як там усё змянілася за дзесяць гадоў...



Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 244.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 11 студзеня 2017 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
12 студзеня 2018 г. № 2 (435)



3 стар.

**Тое, што нас аб'ядноўвае**



13 стар.

**Прыгожай быць не забароніш**



16 стар.

**Каму дровы на падворак?**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ІНКЛЮЗІЯ, А НЕ ІЛЮЗІЯ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ДОЎГІ час лічылася, што інваліднасць — гэта такая абдзеленасць лёсам. Але жыццё не стаіць на месцы і разам з развіццём грамадства змяняюцца і грамадскія погляды і ўстаноўкі. Цяпер у развітых краінах інваліднасць разглядаюць хутчэй як пэўны лад жыцця пры пэўных абставінах, што склаліся ў чалавека. Вось такое карэктнае і нейтральнае азначэнне — без упору на шкадаванне, без паблажлівага стаўлення і погляду зверху ўніз — хутчэй з пачуццём пэўнага разумення абставін, у якіх апынуўся чалавек і да якіх павінен прыстасавацца.**

стар. 4

ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

# А Ў НАС У КВАТЭРЫ ГАЗ...

## Ці ёсць на яго ўправа?

**Амаль год мінуў з таго часу, як у Барысаве чадным газам атруціліся шэсць чалавек, у тым ліку двое непаўналетніх дзяцей. Гэтая трагедыя вымусіла многіх грамадзян задумацца пра бяспечнае выкарыстанне бытавых прыбораў. Але не сакрэт, што і сёння далёка не ўсе з распасцёртымі рукамі сустракаюць спецыялістаў, якія прыходзяць праверыць спраўнасць газавых пліт, воданагравальных калонак, дымаходаў, вентыляцыйных каналаў і выцяжак: маўляў, гэта прыдумалі проста для справаздачнасці.**

Але такія скептыкі памыляюцца: усё робіцца для іх бяспекі. Чадны газ не мае ні паху, ні колеру. Ён забівае чалавека ціха. Часам для гэтага хапае некалькіх хвілін. Пасля барысаўскай трагедыі прайшлі пазапланавыя праверкі не толькі ў Мінскай вобласці, але і па ўсёй краіне. У выніку выявілася шмат непаладак, парушальнікам выдалі прадпісанні, а ў некаторых выпадках газавікі вымушаны былі пайсці на крайнія меры — часова прыпыніць эксплуатацыю бытавых газавых прыбораў. Карэспандэнт «Мясцовага самакіравання» наведалася на прадпрыемствы, якія забяспечваюць насельніцтва «блакітным» палівам, каб высветліць, што новага з'явілася ў іх рабоце і наогул ці змянілася стаўленне ў спажыўцоў да карыстання газам. «Адзіны спосаб пазбегнуць трагедыі — выкананне ўсіх патрабаванняў спецыялістаў, нават тых, якія на першы погляд здаюцца дробязнымі», — сказалі нам адразу.

— Павышэнню бяспекі эксплуатацыі газавага абсталявання ўдзяляецца першачарговая ўвага. Толькі за мінулы год у шматкватэрным і прыватным жылым фондзе праведзена абслугоўванне 156,5 тысячы адзінак воданагравальнага і ацяпляльнага абсталявання. Гэта зроблена адпаведна з графікамі, якія распрацоўваюцца штогод, — адзначыў **намеснік галоўнага інжынера ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаблгаз» Сяргей БАРАДАЎКА.** — Варта заўважыць, што былі выпадкі, калі прыборы часова адключаліся. Вядома, спажыўцы неадназначна ўспрымалі такія меры. Але работнікі прадпрыемства вымушаны былі пайсці на гэты крок дзеля іх жа бяспекі. Прычын для адключэння некалькі. Але, як правіла, асноўная з іх — няспраўнасць дымавых і вентыляцыйных каналаў, газавага абсталявання, у тым ліку і аўтаматыкі, выкарыстанне гофры ў якасці дымаадводу.



Парушэнні выяўляюцца падчас праверак. Адпаведныя звесткі перадаюць і арганізацыі, у веданні якіх знаходзіцца жыллёвы фонд. У выніку летась у Мінскай вобласці было адключана 3102 адзінкі газавага абсталявання. На сённяшні дзень застаюцца адключанымі 707 адзінак.

стар. 15

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# МАДЭЛЬ, ЯКОЙ МЫ ГАНАРЫМСЯ

*Мар'яна Шчоткіна павіншавала сацыяльных работнікаў*

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна ШЧОТКІНА прыняла ўдзел у мерапрыемстве, прысвечаным Дню работнікаў сацыяльнай абароны.**



— У наступным годзе сістэма сацыяльнага абслугоўвання краіны будзе святкаваць стагадовы юбілей. За гэты час праведзена сапраўды велізарная праца, — адзначыла віцэ-спікер. — Створана нацыянальная мадэль сацыяльнай абароны, якой мы маем права ганарыцца. На міжнародный арэне мы дзелімся вопытам з іншымі краінамі.

З віншаваннямі яна звярнулася да супрацоўнікаў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дамоў-інтэрнатаў, упраўленняў сацыяльнай абароны раённых адміністрацый Мінска, камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарвыканкама, а таксама да ветэранаў галіны.

Нагадаем, што Дзень работнікаў сацыяльнай абароны ў Беларусі штогод адзначаецца 5 студзеня. У спецыялізаваных органах і арганізацыях працуюць больш за 39 тысяч чалавек, а ў 80 стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання пражываюць больш за 18 тысяч. У 146 тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання на ўліку знаходзяцца 1,8 мільёна чалавек — гэта тыя, хто апынуўся ў складаных жыццёвых умовах.

# ЯК ПЕДАГОГ ПЕДАГОГУ

*Парламентарый Вольга Кавалькова сустрэлася з педагогамі Мазырскага раёна*

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 16 г. Мазыра» Вольга КАВАЛЬКОВА расказала ўдзельнікам сустрэчы пра галоўныя змены ў заканадаўстве з 1 студзеня 2018 года.**

Яна акцэнтавала ўвагу на павышэнні мінімальнай зарплаты да 305 рублёў, а таксама растлумачыла, што работадаўца абавязаны выкарыстоўваць яе як найменшую мяжу аплаты працы пры стандартных умовах і працягласці працоўнага дня. Таксама яна звярнула ўвагу на павелічэнне базавай велічыні, з-за чаго павялічыліся і пэўныя дапамогі, падаткі, штрафы і стыпендыі.

Сустрэча прайшла ў фармаце размовы: Вольга Кавалькова таксама адказала на пытанні. Педагогі цікавіліся, што зменіцца ў выплаце дапамог на дзіця і ў дэкрэтных выплатах. Акрамя таго, прагучала пытанне аб магчымасці павышэння прафесійнай кваліфікацыі з дапамогай дыстанцыйнага навучання жанчынам, якія знаходзяцца ў дэкрэтным водпуску. Абмеркавалі і змены ў пенсійным заканадаўстве, якія ўступаюць у сілу з 1 студзеня 2018 года.

# САВЕТ НА БУДУЧЫНЮ

*Апублікаваныя рэкамендацыі па выніках парламенцкіх слуханняў па дасягненні Мэт устойлівага развіцця*

Так, па выніках абмеркавання пытанняў партнёрства галін улады як неабходнай умовы паспяховага дасягнення Мэт устойлівага развіцця ўдзельнікі адкрытых парламенцкіх слуханняў рэкамендуюць Савету Рэспублікі і Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь канкрэтныя крокі.

У тым ліку прымаць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы некаторых праектаў законаў Рэспублікі Беларусь, сярод якіх — аб пітным водазабеспячэнні, аб вытворчасці і звароце арганічнай прадукцыі, аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны, харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека, а таксама па пытаннях дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Таксама рэкамендуецца прымяняць прынцыпы ўстойлівага развіцця на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях, а таксама прымаць актыўны ўдзел у рабоце па інфармаванні насельніцтва аб Мэтах устойлівага развіцця і значнасці іх дасягнення. Дарэчы, яшчэ адна рэкамендацыя — гэта ўзаемадзеянне з парламентамі іншых краін і міжнароднымі арганізацыямі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

КРЭАТЫЎНЫ ПАДЫХОД

# ТЭСТ-ДРАЙВ І КУЛІНАРНЫЯ МАЙСТАР-КЛАСЫ

## У Цэнтральным раёне сталіцы выбары стануць святам

**Не «па накатанай», а з новаўвядзеннямі, якія ўзніклі ў выніку мазгавога штурму, — менавіта так ахарактарызаваў будучую электаральную кампанію кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы Ігар БУЗОЎСКІ. Дарэчы, гэты раён Мінска першым укараняе большасць суперсучасных тэхналогій. А спецыяльна да выбараў тут запусцяць некалькі цікавых праектаў.**

Іх прэзентацыя прайшла ў форме грамадскага абмеркавання, якое, як паказала практыка, запатрабаванае ў насельніцтва. Як правіла, абмеркаванні прысвечаны пытанням забудовы і дэталёвага планавання, але на гэты раз кіраўніцтва Цэнтральнага раёна вырашыла ўвесці новы фармат. Пасля прэзентацыі прысутныя маглі аддаць свой голас за тры найлепшыя, на іх погляд, ідэі, развіццю якіх у далейшым будзе ўдзяляцца найбольшая ўвага.

> Мясцовыя жыхары нярэдка выступаюць з заявамі накшталт: «Дайце мне лапату, і я снег каля дома пачышчу». Задача раёна — арганізаваць тыя самыя пункты «выдачы лапат».

Першы праект, створаны ў межах пагаднення з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, атрымаў інтрыгуючае імя «18+». Такая назва была абрана нездарма: 2018 год, 18 лютага, васямнаццацігадовы ўзрост, які дазваляе і зрабіць свой выбар, і быць абраным. Для ўдзелу ў акцыі неабходна толькі запоўніць флаер — яны будуць распаўсюджвацца па ўсім Цэнтральным раёне ў месцах збору людзей. Трэба пазначыць свае кантактныя даныя: поўнае імя, тэлефон і абавязкова нумар участка. Раздаваць і збіраць флаеры будуць прадстаўнікі Лігі маладых выбаршчыкаў. Студэнты вышэйшых навучальных устаноў на пікетах прапануюць мясцовым жыхарам паўдзельнічаць у акцыі, а таксама выказаць свае пажаданні дэпутатам. Пазнаць валанцёраў можна будзе па белых значках. 18 шчасліўчыкаў з тых, хто запоўніць флаер, чакае прыемны сюрпрыз. Атрымаць яго можна будзе ў дзень выбараў на сваім участку. Раскрываць інтрыгу — што гэта за сюрпрыз — арганізатары не спяшаюцца, але запэўніваюць, што ён будзе карысны кожнаму.



Галасаванне за ўпадабаныя праекты.

Другім у чарадзе праектаў стане сацыялагічнае апытанне «Запыт да дэпутата». Пытанняў будзе зададзена два: ці ведаюць жыхары, калі пройдуць выбары, і якія праблемы раёна іх хвалююць у большай ступені? Другое пытанне адкрытае, таму адказы могуць быць самыя розныя. Апытанне арганізавана пры падтрымцы Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ. Як адзначыў яго **дырэктар Давід РОТМАН**, каб зрэз меркаванняў быў найбольш аб'ектыўны, удзельнікі апытання будуць адбірацца выпадковым чынам: пачынаючы ад вуліцы і заканчваючы нумарамі кватэр. У вялікіх дамах будуць апытаны 3-5 чалавек, у маленькіх — 1-2. Адказы апрацуюць з дапамогай спецыяльных праграм, пасля чаго будзе складзены рэйтынг праблем, якія неабходна вырашыць у першую чаргу. Калі ўсё пройдзе паспяхова, то ў дзень галасавання таксама будзе праведзены так званы exit pool — апытанне на выхадзе з выбарчых участкаў.

Яшчэ адзін праект, які будзе дзейнічаць не толькі ў перыяд агітацыйнай кампаніі, але і далей — «Кветкі Цэнтральнага раёна». Як адзначыў Ігар Бузоўскі, мясцовыя жыхары нярэдка выступаюць з заявамі накшталт: «Дайце мне лапату, і я снег каля дома пачышчу». Задача раёна — арганізаваць тыя самыя пункты «выдачы лапат». Гэта прыклад, які характарызуе сітуацыю ўвогуле. У самім праекце гаворка ідзе аб добраўпарадкаванні экафлоры раёна. Усім выбаршчыкам будзе прапанавана насенне кветак. Для пачатку выбраны аксаміткі, паколькі яны найменш капрызныя ў доглядзе, акрамя таго, расаду для іх высаджваюць менавіта ў лютым. Сумесна з дэпутацкім корпусам жыхары раёна, якія атрымалі насенне, вясной змогуць упрыгожыць яркімі кветкамі свае двары і вуліцы. Праект заклікаў падтрымаць ініцыятыву кіраўніка дзяржавы ў частцы навядзення парадку.

Спецыяльна да выбараў студэнты механіка-матэматычнага факультэта БДУ Павел Вацалеў і Антон Філіповіч распрацавалі мабільную праграму «Галасуй у Цэнтральным», ідэйным натхняльнікам якой стаў кіраўнік адміністрацыі раёна. Праграма ўжо даступная для запампоўвання: яна не толькі дае магчымасць даведацца, дзе знаходзіцца ваш участак, але таксама пракладае самы кароткі шлях да яго ад вашага дома.

Праект «Інфармацыйны веснік», які распаўсюджваецца як у друкаваным, так і ў электронным выглядзе, для жыхароў раёна ўжо не навінка. Але да выбараў падрыхтаваны спецыяльны тэматычны выпуск, у якім падрабязна расказваецца пра ўсе праекты. Яго «фішкай» стаў зварот да мясцовых жыхароў ад члена выбарчай камісіі Анатоля Ярмоленкі.

**Кульмінацыяй маштабнай падрыхтоўкі стане 18 лютага. На гэты дзень у Цэнтральным раёне запланавана насычаная праграма. Народныя са звыклымі формамі мерапрыемстваў будуць прадстаўлены і прынцыпова новыя.**

Так, напрыклад, кухары вядучых рэстаранаў Цэнтральнага раёна на выбарчых участках будуць праводзіць майстар-класы па прыгатаванні пельменяў і сырнікаў — прадстаўць новы погляд на традыцыйныя стравы. А бармены навучаць усіх ахвотных рабіць безалкагольныя карктэйлі і ліманады. Тайскія майстры спа-паслуг раскажуць пра сваю культуру, ароматэрапію, пачастуюць карыснымі чаямі. Прадставяць сябе і аўтадылеры, сярод якіх Hyundai, Mercedes і Geely. Каля іх стэндаў можна будзе бясплатна прайсці дыягностыку аўтамабіля і атрымаць экспертнае заключэнне, а таксама запісацца на тэст-драйв упадабанага аўтамабіля.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

ВЫБАРЫ-2018

# Жанчын больш за палову

**На Гомельшчыне кандыдатамі па ўсіх узроўнях мясцовых Саветаў дэпутатаў сталі 4142 чалавекі. Пра гэта паведаміў старшыня абласной камісіі па выбарах дэпутатаў у мясцовыя Саветы 28-га склікання Аляксей НЯВЕРАЎ. Заявы ад прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат пададзены ва ўсе акруговыя выбарчыя камісіі рэгіёна.**

— У параўнанні з папярэдняй выбарчай кампаніяй у мясцовыя Саветы дэпутатаў адзначаецца вялікая актыўнасць грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, — заўважыў Аляксей Няверaў.

Усяго грамадзянамі шляхам збору подпісаў вылучана 3452 прэтэндэнты на дэпутацкі мандат, працоўнымі калектывамі — 848, палітычнымі партыямі — 242. У тым ліку ад Беларускай партыі аб'яднаных левых «Справядлівы свет» — 14, Камуністычнай партыі Беларусі — 77, Ліберальна-дэмакратычнай партыі — 56, Аб'яднанай грамадзянскай партыі — 10, Партыі БНФ — 2, Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці — 80 чалавек, Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай Згоды — 3. Больш за 55% з тых, хто прэтэндуе на дэпутацкі мандат, — жанчыны. Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў прадоўжыцца па 18 студзеня.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# Безальтэрнатыўнасць нам не пагражае

**На гэтым тыдні, 8 студзеня, завяршылася вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты, паведаміў старшыня Магілёўскай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў 28 склікання Валерый БЕРАСТАЎ. Ён нагадаў, што ўсімі суб'ектамі — ініцыятыўнымі групамі (а іх было створана 4155), працоўнымі калектывамі і палітычнымі партыямі — ва ўсе ўзроўні Саветаў вылучана 5305 чалавек — болей чым 2 кандыдаты на акругу.**

Для параўнання, на папярэдніх выбарах альтэрнатыўнасць была ніжэйшая — 1,9 кандыдата. У сельскіх Саветах альтэрнатыўнасць склала 2 кандыдаты на месца (было 1,8), гарадскіх — 3,1 (2,4). На адно дэпутацкае месца ў Магілёўскі гарсавет прэтэндуе 3,6 кандыдата, у Бабруйскі — 2,5.

Па вобласці створана 750 участковых выбарчых камісій (у тым ліку 35 ва ўстановах аховы здароўя, сацыяльнай абароны і гэтак далей) з агульнай колькасцю 8215 чалавек. На $^{3}/_{4}$ гэта жанчыны, 44% ад агульнай колькасці — прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, болей за 8% — моладзь да 30 гадоў.

У абласны Савет дэпутатаў свае кандыдатуры вылучылі 171 чалавек, 47 з якіх — прадстаўнікі палітычных партый. Найбольшую актыўнасць праявіла Ліберальна-дэмакратычная партыя (26 чалавек), Аб'яднаная грамадзянская партыя — 10, «Грамада» — 7, «Справядлівы свет» і КПБ — па 2 прадстаўнікі. Жаданне пайсці ў аблсавет яшчэ на адзін дэпутацкі тэрмін выказалі 16 дзеючых дэпутатаў 27-га склікання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

БЕЗ МЕЖАЎ

# ЯШЧЭ НА КРОК БЛІЖЭЙ

## Карэспандэнт «МС» высвятляла, як у Магілёве рыхтуюцца да Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі



Палац культуры вобласці паўстане перад удзельнікамі Форуму рэгіёнаў у абноўленым выглядзе.

**Упершыню Форум плануецца правесці не ў сталіцы Расіі або Беларусі, а менавіта ў рэгіёне. І ў якасці такой пляцоўкі разглядаецца Магілёў. Па-першае, ён знаходзіцца бліжэй за іншыя да Расіі. Па-другое, колькасць сумесных беларуска-расійскіх праектаў тут год ад году павялічваецца. Праграма Форуму пакуль усё яшчэ напаўняецца рознымі прапановамі з абодвух бакоў. Арганізатары мерапрыемства — Савет Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі — звяраюць асноўныя яе моманты. У Магілёўскай вобласці таксама створаны аргкамітэт па падрыхтоўцы да Форуму на чале з губернатарам Уладзімірам Даманеўскім. Зараз вызначаюцца пляцоўкі для пленарных і секцыйных пасяджэнняў, аб'екты для наведвання, выконваюцца неабходныя будаўнічыя работы. Разам з гэтым аналізуецца вопыт міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў маштабах вобласці, вызначаюцца тэмы для будучых абмеркаванняў. Карэспандэнт «МС» паназірала за тым, як у Магілёве ідзе падрыхтоўка да прадстаўнічага мерапрыемства.**

### *Запрашаем на тыдзень інтэграцыі*

Канферэнцыі, круглыя сталы, сумесныя пасяджэнні пастаянных камісій Савета Рэспублікі і камітэтаў Савета Федэрацыі — падрыхтоўка да саюзнай сустрэчы вядзецца вельмі сур'ёзная, паведамілі ў Магілёўскім аблвыканкаме. Напярэдадні і падчас правядзення Форуму запланавана шмат сустрэч эканамічнага і навукова-адукацыйнага характару, культурных і спартыўных мерапрыемстваў. Усё больш актыўна прыцягваецца да саюзных спраў моладзь. Нядаўна ў Маскве прайшоў Расійска-беларускі маладзёжны форум, на якім было прапанавана стварыць Маладзёжны парламент пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Маладыя актывісты дзвюх краін павінны назапашваць вопыт узаемаадносін на, умоўна кажучы, раннім этапе. Дарэчы, наступны маладзёжны форум, як было вырашана ў Маскве, адбудзецца сёлета ў Магілёве, разам з Форумам рэгіёнаў Беларусі і Расіі. І моладзь Магілёўшчыны таксама актыўна рыхтуецца да гэтай сустрэчы. Узгадняюцца пытанні па спецыялізаванай выстаўцы, а таксама шмат іншых арганізацыйных момантаў.

— Асаблівасцю сёлетняга Форуму будзе тыдзень інтэграцыі, — паведамілі ў аблвыканкаме. — Напярэдадні яго правядзення раёны Магілёўскай вобласці запросяць сваіх партнёраў з расійскіх рэгіёнаў, каб прадэманстраваць ім інвестыцыйныя, прамысловыя, культурныя дасягненні. Прычым не толькі раённага ўзроўню, але і абласнога. Гасцям будзе дадзена магчымасць наведаць магілёўскія прадпрыемствы, культурныя мясціны вобласці, ацаніць наш турыстычны патэнцыял, каб яны атрымалі найбольш поўнае ўяўленне пра Магілёўшчыну і змаглі завязаць з намі як мага больш дзелавых, культурных і іншых кантактаў.



Гістарычная частка Магілёва (вуліца Ленінская).

### *Размова за агульным сталом*

Плануецца, што ўдзельнікамі Форуму ад рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі і абласцей Беларусі стане каля 500 чалавек. Гэта прадстаўнікі буйных прамысловых прадпрыемстваў, навукоўцы, аграрыі, бізнесмены, моладзь. З улікам гэтага вядзецца распрацоўка тэм для будучых перагавораў. Будзе магчымасць абмеркаваць пытанні аграрнага спектра, гарманізацыі заканадаўства Саюзнай дзяржавы, маладзёжнай палітыкі, эканамічнага супрацоўніцтва. Для правядзення секцыйных пасяджэнняў плануецца задзейнічаць пляцоўкі не толькі ў Магілёве, а яшчэ і ў Горках і Шклове.

Распрацоўваюцца пытанні для разгляду на пленарным пасяджэнні з удзелам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла Мясніковіча і старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціны Мацвіенкі.

— Мы таксама сфармулявалі свае прапановы наконт развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва, — паведаміў **галоўны спецыяліст Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Яўгеній НАЛЬГАЧОЎ.** — Яны датычацца рэалізацыі міжпарламенцкіх пагадненняў і пагадненняў паміж рэгіёнамі аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным, культурным і памежным супрацоўніцтве, распрацоўкі і дзеяння рэгіянальных праграм Саюзнай дзяржавы. Ёсць неабходнасць пагаварыць на тэмы прыгранічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі сумесных праектаў і акцый паміж гарадамі-пабрацімамі.

Галоўная мэта сустрэчы — знайсці новыя шляхі развіцця кааперацыі паміж краінамі. Падчас яе будзе прапанавана шмат новых унікальных ідэй і праектаў, рэалізацыя якіх дасць магчымасць узняцца яшчэ на адну прыступку вышэй і згуртавацца больш цесна.

— У ходзе работы V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі плануецца падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі на 2019 год, канкрэтных камерцыйных кантрактаў, — падкрэсліваюць у аблвыканкаме.

### *Магілёў наводзіць глянец*

— Для горада прымаць мерапрыемства такога ўзроўню вялікі гонар, — адзначае **Аляксандр ПАЦЁМКІН, першы намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама.** — Мы гатовы прадэманстраваць расійскім калегам свой вопыт і апошнія напрацоўкі, паказаць, як гэта ў нас прымяняецца на практыцы. Нам будзе цікава даведацца пра дасягненні расіян і, магчыма, нешта пераняць.

> Летась Магілёў адзначыў сваё 750-годдзе, шмат што было зроблена для развіцця інфраструктуры горада. Сёлета гэта тэндэнцыя працягваецца. Горад вядомы сваімі прамысловымі і культурнымі дасягненнямі, у яго багатая і цікавая гісторыя. І робіцца ўсё магчымае, каб ён паўстаў перад гасцямі ва ўсёй сваёй прыгажосці.

— Будзе зроблена рэканструкцыя фасадаў па найстарэйшай вуліцы горада Ленінскай, — кажа Аляксандр Пацёмкін. — Мы захаваем яе гістарычны настрой і ў той жа час пакажам, наколькі арганічна тут спалучаецца мінулае і сучаснасць.

Адна з жамчужын пешаходнай вуліцы — жылы дом канца XVII — пачатку XVIII стагоддзяў купецкага роду Аношак, цяпер тут размяшчаецца музей Бялыніцкага-Бірулі (філіял Нацыянальнага мастацкага). Ён пакуль на рэканструкцыі, але падзея саюзнага значэння прымусіла паскорыць працэс. Планецца, што яго адкрыццё адбудзецца ў рамках Форуму рэгіёнаў з удзелам высокіх гасцей.

У Магілёве знаходзіцца сумесны Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, які рыхтуе высокакваліфікаваныя тэхнічныя кадры для дзвюх краін. Адпаведнае пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі было падпісана ў 2001 годзе. Тут вядзецца навучанне як па беларускіх, так і па расійскіх адукацыйных стандартах з атрыманнем дыплома аб вышэйшай адукацыі дзяржаўнага ўзору Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Ёсць спадзяванні, што дзякуючы Форуму рэгіёнаў нарэшце будзе завершана будаўніцтва новага корпуса гэтага ўніверсітэта.

— Мы падрыхтавалі праект у адрас Саюзнай дзяржавы па развіцці інфраструктуры адукацыйнага працэсу і навуковых даследаванняў нашага ўніверсітэта, цяпер ён знаходзіцца ў стадыі ўзгаднення, — паведаміў **першы прарэктар універсітэта Міхаіл ЛУСЦЯНКОЎ.** — На нашай базе мяркуецца пасяджэнне адной з секцый Форуму, прысвечанае адукацыі і навуцы. Мы чакаем далейшага ўмацавання сувязяў паміж нашымі краінамі ў гэтым кірунку. Наш універсітэт — рэальны прыклад інтэграцыі адукацыйных прастор дзвюх краін.

Новае аблічча атрымае і шэраг іншых будынкаў, якія цяпер знаходзяцца ў стадыі падрыхтоўкі. Сярод іх і галоўная сцэна рэгіёна — Палац культуры вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Фота Галіны ХІТРЫКАВАЙ.**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# ЖАНЧЫНА ЗА РУЛЁМ

**Аўтамабіль — адзін з галоўных памочнікаў для кіраўніка сельсавета. Па працы ім прыходзіцца шмат ездзіць з адной вёскі ў другую, а калі жалезны конь паламаўся — неяк і рамантаваць. Ніхто не хоча захраснуць узімку пасярэдзіне дарогі. На жаль, вырашаць усе праблемы з аўтамабілем прыходзіцца самастойна: або прасіць дапамогі ў знаёмых — суседзяў — сяброў. Мы спыталі ў жанчын-кіраўнікоў, як яны спраўляюцца з цяжкасцямі на дарозе.**

**Старшыня Данілавіцкага сельвыканкама Дзятлаўскага раёна Ганна ЖЫХ** кіруе «Жыгулямі». «Яе спісаць даўно пара», — гаворыць Ганна. Але грошай на новую пакуль няма, таму прыходзіцца ездзіць на той, што ёсць. Закупляюцца запчасткі на грошы сельвыканкама. Часам муж рамантуе, часам аддаюць у рамонт. Ездзіць старшыня шмат: у сельсавеце 39 населеных пунктаў. А тэрыторыя раскідана: цяперашні сельсавет аб'ядналі з ранейшых трох. Калі ў дарозе здараюцца непаладкі, вядома, складана. Але кіроўцу наймаць нельга. У Дзятлаўскім раёне чатыры жанчыны-старшыні. «Часам стаіш на дарозе і не ведаеш, што здарылася», — расказвае Ганна Жых. Прыходзіцца тэлефанаваць мужу ці ў гаспадарку, хлопцам-механікам. Старшыня гаворыць, што добра было б, каб машыну своечасова мянялі, а не чакалі, пакуль яна аднойчы не пройдзе тэхагляд.

Больш пашанцавала **Марыі ПУГАЧОВАЙ, старшыні Даўгалескага сельвыканкама Гомельскага раёна.** Яна гаворыць, што праблем з аўто няма, хоць яму ўжо дзесяць год. Калі патрэбен рамонт, аддаюць на «Гомель-Ладу». Такі дагавор пры жаданні можна і з іншымі арганізацыямі заключыць. Грошы з бюджэту сельвыканкама размяркоўваюць на паліва і рамонт.

**Наталля ДАЎГАЛАПЦЕВА, старшыня Станькаўскага сельвыканкама Дзяржынскага раёна,** сядзіць за рулём «Лады». За станам аўтамабіля сочыць пільна, каб прадухіліць паломку. Але не заўсёды атрымліваецца: якраз за дзень да нашай размовы машыну адвезлі ў рамонт. Аўто таксама амаль юбіляр — хутка дзесяць гадоў будзе. За мяжу сельсавета выязджае рэдка, але нагрузкі хапае: 40 населеных пунктаў. Часта трэба і людзям дапамагчы, напрыклад падвезці адзінокіх у бальніцу. Для рамонту аўто возяць на СТА. Гэта ўжо другая «Лада» ў Наталлі. «Тэхніка такая... Але ездзіць, што самае галоўнае», — гаворыць яна. Аўтамабіль, вядома, трэба мяняць. Ды і прафесійны кіроўца быў бы больш упэўнены на дарозе, лічыць старшыня. Ён змога і адрамантаваць невялікую паломку, калі трэба.



У **Бялыніцкім раёне** рамонтам аўто займаецца толькі прыватнік — дзяржаўнай арганізацыі няма. **Запольскі сельсавет**, якім кіруе **Марыя ЛІСТАПАДАВА**, другі па плошчы ў раёне і адзін з найбольш вялікіх па адлегласці паміж населенымі пунктамі. Было і такое, што з паломкамі ў дарозе дапамагаў загадчык гаспадаркі мясцовай арганізацыі, часам звярталіся да дырэктара і кіроўцаў, выходзілі на лясніцтва. На пасадзе старшыні працуе вельмі шмат жанчын, кажа Марыя, таму было б добра выдзеліць стаўку механіка ім у дапамогу. Нават каб замяніць кола ці аліву. Трэба, каб гэтай справай займаліся прафесіяналы.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# ІНКЛЮЗІЯ, А НЕ ІЛЮЗІЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Больш за тое, у многіх краінах пайшлі яшчэ далей і лічаць, што прыстасоўвацца да рэалій і ўмоў навакольнага свету і грамадства павінен не толькі чалавек з інваліднасцю — грамадства таксама павінна адаптавацца і прыстасоўвацца да яго, а калі браць шырэй — да патрэб і асаблівасцяў кожнага чалавека, з інваліднасцю ці без яе. Усё гэта называецца інклюзіяй — працэсам рэальнага ўключэння ўсіх людзей, у тым ліку і з інваліднасцю, у актыўнае грамадскае жыццё. І гэта ў аднолькавай ступені неабходна ўсім нам — не толькі інвалідам. Як шмат страціла б чалавецтва, калі б не былі ўключанымі ў актыўнае жыццё глухі Людвіг ван Бетховен, сляпая празорлівая Ванга, паралізаваны фізік лаўрэат Нобелеўскай прэміі Стывен Хокінг, эпілептыкі Пётр Першы і Дастаеўскі... Таму так важна імкнуцца рэалізаваць патэнцыял кожнага чалавека.

Наша краіна таксама паступова рухаецца ў бок інклюзіўнага грамадства. Робіць першыя крокі сацыяльнае прадпрымальніцтва, якое садзейнічае інклюзіўнай занятасці не толькі людзей з інваліднасцю, але і іншых уразлівых груп. Мы прайшлі значны шлях па стварэнні нарматыўнай базы, якая забяспечвае безбар'ернае асяроддзе. Але замацаваныя нормы і патрабаванні пакуль яшчэ не заўсёды выконваюцца, таму гэтае пытанне яшчэ далёка не закрытае. Адначасова эксперты папярэджваюць, што ў нас на раённым узроўні ўсё яшчэ няма адзінай стратэгіі па сацыяльнай інтэграцыі людзей з інваліднасцю, якая не абмяжоўвалася б працатэрапіяй у цэнтрах дзённага знаходжання, што створаны пры мясцовых ТЦСАН. Хоць пазітыўныя зрухі і прыклады ініцыятыў, якія насамрэч працуюць, у сферы сацыяльнай інтэграцыі, вядома, ёсць. І, дарэчы, яны якраз і паказваюць, што без супрацоўніцтва паміж мясцовымі органамі ўлады і недзяржаўнымі структурамі тут не абысціся.

**Святлана БУСЬКО.**
busko@zviazda.by

ДАСТУПНАЯ ПРАФЕСІЯ

# УЗЯЛІ І ЗРАБІЛІ

## Хутка паспрабуем валожынскія вешанкі

**Куды працаўладкавацца чалавеку з інваліднасцю ў маленькім райцэнтры? Тут здаровы і канкурэнтаздольны не заўсёды можа знайсці прыстойную працу. Значыць, людзі з абмежаванымі магчымасцямі тым больш маюць патрэбу ў дапамозе. У Валожыне вырашылі паспрабаваць навучыць іх вырошчваць грыбы вешанкі.**

Чаму менавіта вешанкі? Справа ў тым, што вырошчванне грыбоў — даступная праца для людзей з інваліднасцю: тэхналогіі дастаткова гнуткія, грыбы хутка растуць, у цэлым гэты від дзейнасці можа быць канкурэнтаздольны. У Беларусі ўсяго дзве кампаніі вырошчваюць грыбы, асноўная ж частка прадукту ўвозіцца з Літвы і Польшчы, што робіць яго не самым танным. Ёсць яшчэ дробныя вытворцы, але яны ўмовы не дыктуюць.

Быў улічаны і той факт, што Валожынскі раён калісьці аказаўся самым забруджаным у Мінскай вобласці пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. А вешанка — карысны і экалагічна чысты прадукт, больш за тое, яна выводзіць з арганізма радыенукліды.

Таму і ўзнікла ініцыятыва «Валожынскія вешанкі». Адна з асноўных яе задач — навучанне і працаўладкаванне людзей з інваліднасцю. **Кіраўнік ініцыятывы загадчык аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Валожынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ларыса ШЧАРБАЧЭВІЧ** расказала, што ў праекце ўдзельнічаюць 10 маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія на працягу сямі месяцаў будуць вучыцца вырошчваць грыбы. Усе, хто прайшоў навучанне, атрымаюць сертыфікат адпаведнага спецыяліста. А пасля заканчэння праекта будзе створана сацыяльнае ўнітарнае прадпрыемства па вырошчванні грыбоў, куды працаўладкуюць чатырох чалавек з інваліднасцю.



Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацабароне Валожынскага райвыканкама Леанід САДОЎСКІ з першым ураджаем грыбоў.

* * *

У гэтым праекце тэорыя адразу ж спалучалася з практыкай. Так, вешанкі вырошчваюцца на саломе або на апілках. І, па словах Ларысы Шчарбачэвіч, усё неабходнае для іх вырошчвання хлопцы рабілі самі. Гэта не вельмі цяжкая праца, якая падыходзіць для чалавека, чые фізічныя магчымасці абмежаваны. Спачатку было падрыхтавана месца пад цяпліцу і збудавана сама цяпліца, у якой устанавілі кандыцыянеры з клімат-кантролем. Яны пастаянна падтрымліваюць патрэбную тэмпературу — гэта дазволіць вырошчваць грыбы круглы год. Былі нарыхтаваны дровы для запаркі саломы. Далей хлопцы рэзалі і запарвалі салому, закладвалі яе і міцэлій грыбоў у мяшкі, праз адтуліны ў якіх потым і прарастаюць вешанкі.

На сённяшні дзень ужо зроблена першая закладка (было закладзена 100 мяшкоў саломы) і нават атрыманы першы ўраджай грыбоў — 60 кг прадукцыі. Цяпер падрастае наступны. Усяго з адной закладкі можна атрымаць тры ўраджаі — гэта лічыцца высокай рэнтабельнасцю.



Цяпліца, у якой вырошчваюцца грыбы.



Так выглядаюць вешанкі.

Сацыяльны праект дзейнічае ў рамках ініцыятывы «Даступная прафесія для моладзі ў сельскай мясцовасці». А бізнес-складнік у яго дапамагла прыўнесці стартап-школа, якая ажыццяўляе падтрымку прадпрымальніцтва ў Валожыне і Валожынскім раёне.

Яе эксперты — прадпрымальнікі і інвестары, якія маюць рэальны практычны вопыт, — дапамаглі распрацаваць бізнес-праект і асноўныя элементы будучай справы. Як заявіў адзін з **заснавальнікаў стартап-школы Аляксандр БУЛАХ**, калі гэты праект акажацца рэнтабельным, падобны вопыт можна будзе распаўсюдзіць і на іншыя малыя гарады краіны.

**Святлана БУСЬКО.**
busko@zviazda.by

*Навучанне будучых сацыяльных прадпрымальнікаў у стартап-школе праходзіла ў рамках праекта «Валожын без бар'ераў». Мэта гэтага праекта — зрабіць сацыяльныя і рэкрэацыйныя паслугі ў Валожынскім раёне больш даступнымі для людзей з інваліднасцю. Праект фінансуецца ЕС. За перамены ў Валожынскім раёне адказваюць Валожынскі райвыканкам, грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства інвалідаў», Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы» і Мясцовы фонд садзейнічання развіццю міжнароднага дыялогу і супрацоўніцтва «Інтэракцыя».*

## ❍ У ТЭМУ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА:**

— У Беларусі створаны прававыя, арганізацыйныя і інстытуцыянальныя ўмовы для рэалізацыі правоў і свабод інвалідаў нароўні з іншымі грамадзянамі. Разам з тым, па выніках праведзенага маніторынгу дзеючага заканадаўства ў гэтай сферы Пастаянная камісія па адукацыі, навуцы, культуры, сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі лічыць патрэбным унесці шэраг змяненняў у закон аб сацыяльнай абароне інвалідаў.

У прыватнасці, мы лічым неабходным замацаваць нормы, якія гарантуюць інвалідам права на ўдзел у жыцці грамадства ў якасці раўнапраўных яго членаў і забяспечваюць такое права, вызначыць патрабаванні да абсталявання спецыяльных рабочых месцаў для працаўладкавання інвалідаў. На наш погляд, мэтазгодна ўдакладніць тэрміналогію, а таксама ўвесці тэрмін «дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці» і яго азначэнне. Таксама неабходна прадугледзець палажэнні адносна інклюзіўнай адукацыі інвалідаў, удакладніць нормы, якія датычацца фарміравання даступнага асяроддзя жыццядзейнасці для людзей з абмежаванымі магчымасцямі — бесперашкодны доступ да жылых аб'ектаў, аб'ектаў сацыяльнай, інжынернай і транспартнай інфраструктур, да месцаў адпачынку. Акрамя таго, неабходна прадугледзець нормы аб фарміраванні і вядзенні інфармацыйнага рэсурсу, які змяшчае звесткі аб інвалідах у Беларусі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

## Дарэчы

У Заходняй Еўропе і ЗША вешанкі называюць вустрычнымі грыбамі, яны лічацца далікатэсам. Ёсць меркаванне, што папулярнасць вешанак — гэта следства іх цудоўнага дзеяння на арганізм чалавека, асабліва мужчыны. У паўднёва-ўсходняй Азіі вешанкі выкарыстоўваюцца гэтаксама часта, як і ўжо вядомыя нам грыбы шыітаке.

Вешанкі смачныя і карысныя. Яны змяшчаюць бялкі, вітаміны групы B, C, E і даволі рэдкі вітамін D2, які дапамагае правільнаму засваенню фосфару і кальцыю. Акрамя таго, вешанкі дапамагаюць знізіць узровень «дрэннага» халестэрыну, нармалізаваць ціск і вывесці радыенукліды.

■ Ёсць нагода

# 15 ІМГНЕННЯЎ «ЕЎРАБАЧАННЯ»

**Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне», удзел у якім на цяперашні момант пацвердзілі 43 краіны ад Аўстраліі да Швейцарыі, стане 63-м па ліку. Беларусь жа выступіць на шоу 15-ы раз. 15 — яшчэ не юбілей, але ўжо і не маленькая дата. Пакуль інтрыга вакол артыста або калектыву, які прадставіць нашу краіну ў Партугаліі, яшчэ толькі вырашаецца, «Звязда» згадвае найбольш яркіх і запамінальных, кожнага на свой лад, удзельнікаў нацыянальных адбораў мінулых гадоў.**

## Першыя ластаўкі



Як бы ні ацэньвалі выступленне сёння, Саша Кірсанава і Канстанцін Драпеза з дуэта «**Аляксандра і Канстанцін**»назаўжды ўвайшлі ў гісторыю як нашы піянеры на еўравізійнай сцэне. Безумоўна, мы падсвядома марылі адразу трапіць у дамкі, таму ўскладалі на канкурсантаў асаблівыя надзеі і чакалі ад іх занадта многа... І ўсё ж дэбют прынёс як мінімум арганізацыйную карысць — напрыклад, даў зразумець, што патрэбны PR-падтрымка, актыўныя стасункі з прэсай і што наогул дробязяў у падрыхтоўцы артыстаў не бывае (згадаць хоць бы злашчасныя турэцкія кандыцыянеры, з-за якіх наша спявачка страціла голас напярэдадні выступлення).

...Яшчэ адной прыкметнай з'явай самага першага нацыянальнага адбору стаў **Аляксандр Саладуха**. Будзем шчырымі, вельмі нямногія помняць, хто яшчэ быў у фінале ў той год, але большасць з вас лёгка напяе пару слоў на рускай ці англійскай з саладухаўскага хіта «Не пераджывай» («Take it easy guy»). Больш за тое, адным гэтым выхадам артыст прымусіў успамінаць пра сябе 10 гадоў, а потым зноў падагрэў інтарэс публікі, зняўшыся ў адборачным прома-роліку «Еўрабачання» ў вобразе гіганцкага каляровага матылька.

## Што занадта...

У 2005-м пераможца нацыянальнага адбору **Анжаліка Агурбаш** вырашыла ўлічыць мінулы няўдалы вопыт і зрабіць усё па найвышэйшым разрадзе, дорага і з прыцягненнем міжнародных спецыялістаў. Конкурсную песню спявачка мяняла тройчы, абраўшы ў выніку кампазіцыю грэчаскіх аўтараў, прадзюсарскую падтрымку ёй аказваў кароль расійскай поп-сцэны Філіп Кіркораў, прома-тур ахапіў 26 краін. Выдаткі толькі на сцэнічны ўбор-трансформер ад Валянціна Юдашкіна склалі каля 40 тысяч долараў, а ўся еўравізійная кампанія абышлася ў некалькі мільёнаў — касмічная нават для дакрызісных часоў сума. Але вынік — 13-е месца ў паўфінале — безумоўна, не парадаваў ні саму Анжаліку, ні яе мужа-спонсара, ні беларускіх гледачоў.

А вось у 2013-м зварот да замежнай творчай каманды (бельгійскі кампазітар, грэчаскія стылісты, здымкі кліпа ў Турцыі, запіс песні ў Лондане, і г. д.) і значныя фінансавыя ўліванні ў «Еўрабачанне» сябе апраўдалі. Хоць памятная бліскучая міні-сукенка **Алены Ланской**, упрыгожаная стразамі



Сваро́ўскі, каштавала «ўсяго» 10 тысяч еўра, але спявачка з немудрагелістай, лёгка запамінальнай песенькай «Solayoh» упэўнена заняла 16-ю прыступку ў фінале конкурсу. Відаць, не сукенкай адзінай зачапіла беларуская артыстка пераборлівую еўравізійную публіку?

## Зоркі сышліся



**Дзмітрый Калдун**, які прадставіў нашу краіну на «Еўрабачанні-2007», запомніўся не толькі як самы паспяховы за ўвесь час беларускі канкурсант (6-е месца ў фінале). Яму нейкім містычным чынам шанцавала ўсю дарогу. Так, ледзь паспеўшы падаць заяўку на праслухоўванне, спявак быў дапушчаны ў фінал адбору авансам, там вымушаны быў яшчэ раз тэрмінова змяніць песню і феерычна абышоў сапернікаў, у тым ліку папулярную спявачку з Расіі Дзіяну Гурцкую. Пасля Калдуна «дзялілі» паміж сабой два расійскія прадзюсары, Віктар Дробыш і Філіп Кіркораў, перасіліў у выніку апошні — і менавіта дзякуючы яму наш артыст атрымаў новы яркі вобраз, песню, кліп і сцэнічную харэаграфію.

А яшчэ — і гэта для нашых унутраных адбораў з'ява рэдкая — Дзмітрый умудрыўся заваяваць сімпатыі ўласна беларускіх гледачоў. Вакол яго хадзіў выключна «белы» піяр, яму шчыра зычылі поспеху, яго праводзілі і сустракалі ў аэрапорце не толькі дзяўчаты з фан-клуба, а дзясяткі паклоннікаў конкурсу... Што гэта, калі не тая самая магія, пра якую ішла гаворка ў песні Калдуна?

Узяць такую ж светлую і ўзнёслую ноту ўдалося толькі праз 10 гадоў — нашым леташнім прадстаўнікам «**Naviband**».



Ксенія і Арцём стукаліся ў дзверы нацыянальнага адбору некалькі разоў, а пашанцавала толькі ў 2017-м, і зноў неяк усё супала: лёгкая і меладычная беларускамоўная песня, абаянне і харызма саміх артыстаў, гарачая падтрымка слухачоў з розных краін, конкурсны заклік да разнастайнасці... Дуэт прадставіў бадай самы рамантычны нумар ад Беларусі, а пацалунак салістаў у прамым эфіры спарадзіў эпідэмію паўтораў — і нават занятае ў фінале не самае высокае 17-е месца не сапсавала адчування свята.

## Скандальны флёр

На жаль, у наступныя (пасля Калдуна) гады светлая паласа для нашых удзельнікаў «Еўрабачання» скончылася, і ніводны нацыянальны адбор не абыходзіўся без скандалаў ды ўнутраных разборак — дзіва, што не перасварыўся ўвесь айчынны шоу-бізнес. Прыкладам, у 2009-м фіналісты праекта «Еўрафэст» патрабавалі дыскваліфікацыі аднаго з фаварытаў адбору **Пятра Ялфімава**; а праз нейкі час ужо сам артыст не знайшоў паразумення з прадзюсарскай і творчай камандай тэлевізійнікаў. То спеваку не падабалася канцэпцыя конкурснага нумара, прыдуманага вядомым польскім рэжысёрам, то ён адмовіўся ўдзельнічаць у некаторых прома-паездках. Але апошняй кропляй стала нестрыманасць артыста пасля таго, як стала вядома, што Ялфімаў не прайшоў у фінал шоу — у правальным выніку артыст і прадзюсар публічна абвінавацілі арганізатараў, а таксама чамусьці журналістаў. Як мы памятаем, менавіта з-за гэтага скандалу «ЕўраФэст» быў закрыты, а выбар канкурсантаў для «Еўрабачання» перададзены зусім у іншыя рукі — у 2010 і 2011 гадах за нацыянальны адбор адказваў тэлеканал АНТ.

Па шляху скандалу перыядычна праходзілі і іншыя ўдзельнікі нацыянальных адбораў. Прыгадаем: у 2012-м гурт «**Litesound**» выкрыў спробу фальсіфікацыі галасавання і запатрабаваў пераглягу яго вынікаў. Пуцёўку на конкурс з рук Алены Ланской хлопцам вырваць удалося, а вось пацвердзіць пасыл уласнай песні «We Are the Heroes» («Мы — героі») і заняць высокае месца на ім — не. Гурт стаў толькі 16-м у паўфінале шоу.



Таксама не прынесла плёну правакацыя, на якую пайшла творчая каманда ўдзельніка «Еўрабачання-2016» **IVAN`а** (ён жа — выхадзец з гомельскай музычнай сям'і Аляксандр Іваноў). Помніцца, артыст збіраўся выйсці на сцэну аголеным і з драпежнікамі-ваўкамі — у парушэнне правілаў конкурсу. Але выліласся гэта ў эксплуатацыю вобразу сучаснага Маўглі з дапамогай 3D-праекцый ваўкоў і спевака, а таксама 12-е месца ў паўфінале.

## З Беларуссю ў сэрцы

Мабыць, у 2011-м як ніколі часта аб прадстаўніцы нашай краіны пыталіся: «А хто гэта?». Спачатку адмысловая фокус-група выбрала зусім іншага прэтэндэнта — спявачку Кацю Лангер, раней вядомую як Corriana, але пазней яе дыскваліфікавалі за парушэнне правілаў наконт даты выпуску песні. Імя ж студэнткі перакладчыцкага факультэта Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта **Анастасіі Віннікавай**, якая наступнай атрымала шчаслівы білет на «Еўрабачанне», шырокай публіцы не гаварыла зусім нічога. Канчатковы варыянт кампазіцыі «I love Belarus», а таксама кліп на яе былі гатовыя ўсяго за два дні (!), а нумар стаў самым патрыятычным выступленнем нашых артыстаў на міжнародным конкурсе, бо ад пачатку да канца быў зроблены сіламі айчынных спецыялістаў — ад рэжысёраў да дызайнераў. «Трэба памятаць, што тады быў пік санкцый супраць Беларусі, і мы разумелі, што ў фінал наўрад ці пройдзем, — нагадвае кампазітар конкурснай песні Яўген Алейнік. — Але ўсё адно працавалі на пад'ёме, прычым выкарыстоўвалі толькі беларускія творчыя сілы, гэта быў прынцыповы момант, каб заявіць аб сабе. Наколькі ўдалося? Гледачы прапусцілі Беларусь у фінал, а вось журы паставіла ледзь не на апошняе месца».

Яшчэ адной яркай спробай выкарыстаць нацыянальныя матывы стала выступленне дзявочага гурта «**MILKI**», адмыслова сабранага пераможцам конкурсу 2009 года Аляксандрам Рыбакам. На адборы да «Еўрабачання-2015» вышыванкі і англа-беларускамоўны прыпеўкі давялі дзяўчат да фіналу адбору і... усё на тым.

## Знак якасці

У кулуарах беларускага адбору ходзіць жарт, што калі б **Гюнеш** захацела, яна магла б скласці альбом са сваіх песень



для «Еўрабачання». І ў гэтым значная доля праўды. Цяперашні адбор для спявачкі ўжо сёмы па ліку, і штораз яна прадстаўляе гледачам новыя, разнапланавыя і нечаканыя вобразы (асабіста мой любімы з ранейшых — эфектная Fantastic Girl 2009-га). Некалькі разоў Гюнеш спынялася літаральна за крок ад перамогі. Чаму ёй не шанцавала? Спытайце што-небудзь лягчэйшае. Але рэч у тым, што артыстка, як сапраўдны баец і прафесіянал, сустракала няўдачы з высока ўзнятай галавой і адкрывала ў сабе ўсё новыя грані таленту, — уласна, сёлетняя яе песня пра жанчыну з моцным характарам гэта яскрава пацвярджае.

А за тыя некалькі гадоў, што Гюнеш прапусціла адборы, яна паспела ўзяць «серабро» альтэрнатыўнага ўсходняга конкурсу «Turkvision», стаць мамай і назапасіць вялікае мноства новых творчых ідэй.

## Нестандартны варыянт



На адборы да «Еўрабачання-2015» Белтэлерадыёкампанія ўпершыню вырашылася на эксперымент: зладзіла анлайн-трансляцыю праслухоўвання на сайце www.tvr.by, каб гледачы самі ацанілі, хто і што прапануе на конкурс. Такім чынам усе ахвотныя ўбачылі і пачулі фрыкаў, большасць з якіх звычайна не даходзіла да этапу тэлеэфіру. Некаторыя, як удзельнікі адбораў 2014—2015 гадоў свежанькія зомбі з калектыву «**Sweet Brains**», аказаліся даволі сімпатычнымі (але былі злоўленыя на плагіяце вядомай камп'ютарнай гульні і з барацьбы выбылі), а леташні гумарыстычны нумар баяніста-віртуоза **Віталя Варанко** сумесна з клоўнам Вадзiкам Ракетай, белымі мядзведзямі ды балалайкай наогул стаў сапраўдным упрыгажэннем канцэрта.

Але штогод хапала і тых, хто скарыстоўваў праслухоўванне як бясплатную рэкламу для будучых карпаратываў, — таму журы даводзілася выслухоўваць і цыганскія ансамблі, і артыстаў-парадыстаў у вобразах аленя або Элвіса Прэслі, і персанажаў фэнтэзі, і аматараў шансона, і многіх іншых відавочна «нефарматных» прэтэндэнтаў.

## Хто на новенькага?

Сёлетні адбор атрымаўся не самым масавым, але дакладна не менш яркім і эмацыянальным за папярэднія. Жаданне прадставіць Беларусь на «Еўрабачанні» выказалі папулярны ўкраінскі поп-спявак Alexeev і пратэжэ Пятра Ялфімава з Расіі Соф'я Лапіна, ураджэнка Таджыкістана Тахміна Ніязава і наша першая ўдзельніца дзіцячага «Еўрабачання» Вольга Сацюк, ветэраны нацыянальнага адбору Гюнеш і Жанэт, а таксама мноства амбіцыйных навічкоў. Хто з іх стане 15-м па ліку «імгненнем» вялікага шоу? На момант здачы нумара праслухоўванне яшчэ не скончылася, таму падрабязны расказ пра яго і спіс фіналістаў глядзіце на нашым сайце www.zviazda.by.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

**Фота БЕЛТА, tvr.by і з сайтаў выканаўцаў**

## Серада, 17 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** Зона Х (16+).
**9.10, 22.05 Серыял «След». (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Капітанша». 1-я серыя. (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Райское места». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.40** Сфера інтарэсаў.
**0.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.10** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Серыял «Жанчына ў чорным». (16+).**
**9.55, 17.55 Серыял «Каварныя пакаёўкі». (16+).**
**10.50, 22.05 «Сляпая». Драма. (16+).**
**11.55, 21.15** «Тата зможа?» (16+).
**12.40** «Свет навыварат». (16+).
**13.30, 19.15** «Амерыканскі жаніх». (16+).
**14.25** «Бітва салонаў». (16+).
**15.25, 23.05 Серыял «Іх прабліталі ў раддоме». (16+).**
**16.15, 23.50** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20, 23.55** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**18.40** «Калі мы дома». Скетчкам. (16+).
**20.15** «Паненка-сялянка». (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 20.15** «Беларуская кухня». Боршч з клёцкамі.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Строгавы». Маст. фільм. (12+).**
**9.35, 17.40** «Апошні дзень». Наталля Крачкоўская (12+).
**10.15** «Запіскі на палях». Французскі Скарына.
**10.45, 16.25 «За двума зайцамі». Маст. фільм (12+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Пызы.
**12.50** «Шляхта. Брутальная гісторыя». Дак. фільм.
**13.15** «Хата на хату».
**14.10, 22.15** «Сакрэтная папка». Эльбрус. Сакрэтная аперацыя Гітлера (12+).
**14.55, 21.05 «ТАСС упаўнаважаны заявіць». Маст. фільм. (12+).**
**16.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» Лагойскі раён (6+).
**19.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Антона Бархатова.

### Беларусь 5

**8.00** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Трынец» (Чэхія) — «Ювяскулля» (Фінляндыя).
**9.50** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Францыя — Беларусь.
**11.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Амур» (Хабараўск).
**13.20** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Векшэ Лейкерз» (Швецыя) — «Ліберэц» (Чэхія).
**15.15** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**17.20** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Харватыя — Швецыя.
**18.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Шахцёр» (Салігорск). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Спорт-цэнтр.
**21.25** Слэм-данк.
**21.55** Агнявы рубеж.
**22.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Іспанія — Данія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Міхаіл Галусцян. Зразумець і дараваць» (12+).
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Рагнеда». Інтрыга парыжскай сцэны» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Двайное жыццё» (16+).**
**23.05 Серыял «Што і трэба было даказаць» (16+).**
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 20.15** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**9.25, 21.10** «Дзень засакрэчаных спісаў» (16+).
**10.40, 17.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**12.20, 23.05 «ДМБ». Серыял (16+).**
**13.50 Баявік «Джэк Рычэр» (16+).**
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).

**16.50** «Самая карысная праграма» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.10** «Глядзець усім!» (16+).
**0.05 Камедыя «Суперцешча для няўдачніка» (16+).**

### МІР

**6.00** «Дастукацца да зоркі» (12+).
**6.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**7.35** «Няма праблем» (16+).
**9.00 Серыял «АСА» (16+).**
**10.00, 13.15, 19.20 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 3.00** «Справы сямейныя» (16+).
**15.00, 4.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Самы лепшы вечар» (16+).**
**1.05 Маст. фільм «Аднакласніцы» (12+).**
**5.00 Серыял «Спрут» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху». (16+).
**8.10 Маст. фільм «Брэсцкая крэпасць». (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00 Серыял «Правакатар-2». (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў». (12+).**
**22.10, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі. Рэанімацыя». (16+).**

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20** «Цягнік будучыні». (12+).
**7.15** «Шлях нафты: міфы і рэальнасць». (12+).
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.05** «НЗ.by».
**10.05, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.35 Серыял «Дарожны патруль». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Адвакат». (16+).**
**15.30** «НЗ. Расследаванне». (16+).
**16.35, 19.40 Серыял «Інспектар Купер». (16+).**
**21.20 Серыял «Аперэта капітана Крутава». (16+).**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Патруль». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.05, 19.55, 20.50, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс».**
**8.15 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».**
**9.15** Дак. серыял «Уводзіны ў сабаказнаўства».
**10.00** М/с.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00 Драма «Афіцэр з ружай».**
**13.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».**
**14.30 Камедыя «Насмешка».**
**16.10** Для дзяцей «Адказвайка».
**16.15** «Мультпарад».
**16.35 Прыгоды «Чалавек з Рыа».**
**18.40 Серыял «Ключы ад бездані».**
**19.25** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**20.00 Серыял «Выратаваць боса».**
**20.45** «Вечарніца».
**20.55** Анталогія вестэрна. «Сільверада».

### ВТБ

**6.00, 15.20** Серыял «Варонiны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Чычылэнд». (0+)
**8.00, 4.35** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.55** М/ф «Машкіны страшылкі». (6+)
**8.40, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.40, 19.00** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**10.45** Баявік «Без кампрамісаў». (16+).
**12.25** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 20.00** Серыял «Лондангград» (16+).
**14.10** Серыял «Паласатае шчасце» (12+).
**16.50, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 22.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Баявік «Перавозчык-3». (12+).
**0.00** Серыял «Карабель». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).
**3.30** «Лаві момант» (16+).

### Культура

**10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** ХХ стагоддзе. «Рок і вакол яго». Тэлемост Масква — Ленінград». 1987.
**12.15** «Гульня ў бісер». «А. і Б. Стругацкія. «Панядзелак пачынаецца ў суботу».
**12.55** Штучны адбор.
**13.35** «Тайна грабніцы Чынгісхана». Дак. фільм.
**14.30** «Кур'ёзы, тэатр, кіно, жыццё». Выбранае.
**15.10, 1.45** Знакамітыя аркестры Еўропы. Лонданскі сімфанічны аркестр.
**16.05, 2.40** Сусветныя скарбы.
**16.25** «Блізкае кола Андрэя Эшпая».
**17.20** Жыццё выдатных ідэй. «Інсулінавыя войны».
**18.45** «Наша кіно. Чужыя берагі». Дак. серыял.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Прыступкі цывілізацыі. «Егіпецкі паход Напалеона Банапарта». Дак. фільм. 1-я серыя.
**21.40** «Абсалютны слых».
**22.20** «Мемарандум Парвуса». Серыял.
**23.15** «Маналог у 4 частках. Мікалай Цыскарыдзэ».
**1.05** «Сакрэт раўнавагі». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Аўтограф». 2005 год. (18+).
**6.50, 8.35, 9.40, 11.00, 12.50, 14.35, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 0.40, 5.45** Музычная настальгія. (12+).
**7.20, 13.20** Маст. фільм «Арбацкі матыў». (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час». (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**12.00** «Бый час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Школа выжывання пачатку 90-х». 2006 год. (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казлякоўай. 2004 год. (12+).
**19.05** Маст. фільм «Таня». (16+).
**0.00** «Акулы пяра». Андрэй Губін. 1998 год. (12+).
**1.30** «Што? Дзе? Калі?» Фінальная гульня. 1985 год. (12+).

**4.00** Маст. фільм «Міг удачы». (16+).
**5.05** «Песня-87». 2-я частка. (12+).

### EuroSport 1

**3.00, 7.00, 9.00, 11.15, 13.15, 16.45, 19.45, 21.00, 2.00** Тэніс. Australian Open.
**11.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
**16.15, 2.30** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**17.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
**19.15** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
**22.00** Снукер. «Мастэрс».
**1.30** Ралі-рэйд. «Дакар».

### Кінакамедыя

**0.55** Шоу «Камедыянты». (16+).
**2.00** — Прафілактыка.
**10.00** Прыгоды «Факап, або Горш не бывае». (16+).
**12.15** Камедыя «Карпаратыў». (16+).
**14.00** Камедыя «Як па масле». (16+).
**15.40** Камедыя «Вясельны пераполах». (16+).
**17.40** Меладрама «Закахацца ў нявесту брата». (16+).
**19.30** Меладрама «Фанаткі на сняданак не застаюцца». (16+).
**21.30** Камедыя «Вікі». (16+).
**23.10** Камедыя «Ультраамерыканцы». (18+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.00, 2.15** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.35, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10, 18.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**13.00, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.00** «Паралельныя свет» (12+).
**14.55** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.30** «Простыя складанасці» (12+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Першакурсніца». Серыял (12+).
**21.45, 5.15** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.40** «Лінія абароны» (16+).
**23.10** «Нябёсы, якія ўпалі». Серыял (16+).
**23.55** «Адвакат д'ябла». Трылер (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Як выйсці замуж за тры дні (16+).
**8.10** Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса (16+).
**11.15** Розум і пачуцці (12+).
**13.55** Дзікая рака (12+).
**16.10** Каралеўства Поўнага месяца (12+).
**20.10** Жудасна гучна і залімітава блізка (16+).
**22.45** Ключ ад усіх дзвярэй (16).
**0.45** Строга на захад (18+).
**2.25** Вёска праклятых (16+).
**4.00** Елізавета (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Геаграф глобус прапіў (16+).
**8.40** Глухар у кіно (16+).
**10.30, 0.25** Бліндаж. (12+).
**12.35** Старое добрае кіно. Гіпербалоід інжынера Гарына (6+).
**14.30** Жаніх (12+).
**16.20, 4.20** Забытая жанчына. 3—4-я серыі (12+).
**18.10** Іронія лёсу. Працяг (12+).
**20.20** Спадчанак у таты (12+).
**22.10** А досвіткі тут ціхія... (12+).
**2.30** Кур'ер з «Раю» (12+).

### National Geographic

**6.00, 9.20** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.15** Код небяспекі. (12+).
**7.45, 11.40, 17.15, 20.25** Аўта-SOS. (12+).
**8.35** Шаша праз пекла. (16+).
**10.10** Мегазаводы. (12+).
**10.55** Ледзяная дарога. (12+).
**12.30** Праз мільён гадоў. (12+).
**13.15** Гульні розуму. (12+).
**14.50, 22.45, 1.55, 5.10** «Тытанік»: праз 20 гадоў». (12+).
**15.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (16+).
**16.25, 19.35, 0.20, 3.30** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.00, 22.00, 1.05, 4.20** Дзікі тунец. (12+).
**18.45** Навука будучыні. (12+).
**23.35** Эвакуацыя Зямлі. (16+).
**2.40** Пачатак. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**14.00, 7.10** Голыя і напалоханыя. (16+).
**18.00** Карапі грузавікоў. (16+).
**19.00, 5.30** Хуткія і гучныя (16+).
**20.00, 1.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**0.00** Металаломшчыкі. (16+).
**2.00** Вулічныя войны. (16+).
**2.55** Салдаты нядачы. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Тыдзень будзе спрыяльны для пачатку новых дзелавых праектаў. Праявіце ўласцівую вам добрасумленнасць і пунктуальнасць, звярніце пільную ўвагу на дробязі, і не прыйдзецца выпраўляць свае памылкі, іх проста не будзе. Паспрабуйце менш крытыкаваць калег па працы, памятайце: маўчанне — золата, яны і так усё зразумеюць. У сераду і ў пятніцу можаце разлічваць толькі на свае сілы, сябры не заўсёды змогуць дапамагчы.



**ЦЯЛЕЦ.** Паспрабуйце засяродзіцца на бягучых справах. Менавіта ад гэтага будзе залежаць ваша паспяховасць у найбліжэйшы час. Нават калі не вельмі падабаецца цяперашняе месца працы, не спяшайцеся шукаць новую сферу прымянення сваіх працоўных рэсурсаў. Дзелавыя знаёмствы тыдня будуць на рэдкасць канструктыўныя, карысныя і прыемныя. Паспрабуйце іх не пазбягаць.



**БЛІЗНЯТЫ.** Пачатак тыдня прынясе святочны настрой, але запатрабуе старанна папрацаваць. Для рэалізацыі запланаванага на перыяд з аўторка па чацвер праявіце больш творчасці, думайце нестандартна. У сераду і чацвер прыгледзьцеся да «падводных плыняў» на працы, каб не апынуцца ўбаку ад самых важных падзей. У выхадныя займіцеся асабістым жыццём, зоркі абяцаюць штосьці рамантычнае.



**РАК.** Удача можа апынуцца на вашым баку, аднак неабходна рэалістычна паглядзець на некаторыя рэчы і прыняць часам нават не зусім прыемныя для вас рашэнні. Некаторыя людзі з акружэння нарэшце пакажуць свой сапраўдны твар, і гэта будзе вельмі цікавае відовішча. Акрамя таго, такая шчырасць дазволіць разабрацца, хто вам вораг, а хто сябра. Добры тыдзень для прасоўвання ўгору па службовай лесвіцы і заключэння кантрактаў. Пачынаючы з пятніцы праявіце ініцыятыву і прадпрымальнасць у чымсьці новым, хоць гэта ўхваляць далёка не ўсё.



**ЛЕЎ.** Імкненне да самаўдасканалення, пад знакам якога павінен прайсці гэты тыдзень, пойдзе вам на карысць. Да яго канца станеце вельмі прыцягальнай асобай і проста ідэальным суразмоўнікам. Аднак асцерагайцеся фальшывых аўтарытэтаў. Побач з вамі можа апынуцца абаяльны, але пусты чалавек ці нават ашуканец. А вось да меркавання навакольных усё ж варта прыслухацца, толькі ў гэтым выпадку ўсе, пачынаючы з начальства і дзелавых партнёраў і заканчваючы блізкімі людзьмі, пачнуць лічыцца з вамі. Спрыяльны час для вырашэння жыллёвых пытанняў, якія даўно наспелі.



**ДЗЕВА.** Не варта марнаваць занадта шмат часу на будаванне паветраных замкаў. Занятак прыемны, але чым больш прывабныя пабудовы, тым горшае расчараванне ад жорсткай рэчаіснасці. Значна больш карысна паклапаціцца пра зямное. Прычым можна выкарыстоўваць самыя разнастайныя метады, у тым ліку і інтрыгі, галоўнае — увага да дробязяў і стараннасць у абдумванні дзеянняў. Пажадана не паказваць навакольным сваё нецярпенне, інакш усе справы могуць пайсці наперакос. Да канца тыдня вы здольныя перавярнуць горы, паказаць сябе ва ўсім бляску. Узрастае аўтарытэт на працы і ўплыў на блізкіх.

## Субота, 20 студзеня

### Беларусь 1

**6.20** Існасць.
**6.45 Меладрама «Каханне прыходзіць не адно». (16+).**
**8.25** Кулінарная дыпламатыя. (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў. (16+).
**9.50** Здароўе. (12+).
**10.35** Пад ключ. (12+).
**11.10** «Сваты. Жыццё без грыму». «Аляксандр Фяклістаў». (12+).
**12.10** 50 рэцэптаў першага». (12+).
**12.45, 15.45 Серыял «Сваты-4». (12+).**
**13.50** «Я ведаю».
**15.15** Краіна.
**16.50 Меладрама «Дзіця на мільён». (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Шчаслівы вечар.
**22.40 Меладрама «Каханне Надзеі». (16+).**
**2.05** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Занадта шмат хвастоў. (6+).
**7.30 Фільм для дзяцей «Халоднае сэрца». (6+).**
**8.50, 21.55** Тэлебарометр.
**8.55** «Свет навыварат». (16+).
**9.45** «На нажах». (16+).
**10.45** «Бітва салонаў». (16+).
**11.45** Анімацыйны фільм «Як прыручыць дракона». (0+).
**13.25 Камедыя «102 далмацінцы». (12+).**
**15.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
**16.05** Капейка ў капейку. (12+).
**16.35 Драма «Злаві мяне, калі зможаш». (12+).**
**19.00 Меладрама «Дзень працы». (12+).**
**20.55** «Паненка-сялянка». (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.05** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).
**22.40 Фантастыка «Пятая хваля». (16+).**

### Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 14.30, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 14.45, 20.30** «Гэты дзень».
**8.20** М/ф (0+).
**8.50 «Вечны кліч». Маст. фільм. Фільм другі. (12+).**
**10.00** «Хата на хату».
**10.55** «Беларуская кухня». Аўсяны кісель.
**11.20** «Беларусь як песня». Святлана Кульпа.
**11.45** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.15 «Цётка Маруся». Меладрама (12+).**
**14.50** «Навукаманія» (6+).
**15.20** «Камедыянт». Тэлевізійны спектакль паводле твораў В. І. Дуніна-Марцінкевіча.
**17.00** «Апошні дзень». Сяргей Бадроў (12+).
**17.35 «Справа Румянцава». Драма (12+).**
**19.20** «Спатканне сяброў». Канцэрт.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Верныя сябры». Камедыя (12+).**
**22.35** «Тэатр у дэталях». Мюзікл Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра «Дуброўскі».
**23.05** «Сусветная класіка». Канцэрт групы «Depeche Mode».

### Беларусь 5

**8.00, 0.05** Велатрэк. Этап Кубка свету. Мінск.
**9.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Спрынт. Мужчыны.
**10.35, 17.40** Спорт-мікс.
**10.45** Легенды спорту. Беларускія гісторыі.
**11.15** Хакей для ўсіх.
**11.45** Фрыстайл. Этап Кубка свету. Лыжная акрабатыка.
**13.05** Вялікі спорт. Ток-шоу.
**13.50** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-мікс.)
**16.20** Трэніровачны дзень.
**16.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка пераследу. Мужчыны.
**17.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**20.15** Спорт-цэнтр.
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Ньюкасл».
**22.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Другі этап. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.10, 23.45 Меладрама «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (12+).**
**9.10** М/с «Смяшарыкі. Спорт» (0+).
**9.30** «Здароўе» (12+).
**10.40** «Смак» (12+).
**11.30** «Ідэальны рамонт» (12+).
**12.35** «Разумніцы і разумнікі» (12+).
**13.25** «Ералаш».
**14.00 Камедыя «Утаймавальніца тыграў» (12+).**
**16.20** Лядовае шоу «Руслан і Людміла».
**18.05** «Хто хоча стаць мільянерам?» (16+).
**19.05** «Лепш за ўсіх!»
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**21.10** «Сёння вечарам» (16+).

### СТБ

**6.15 Маст. фільм «Папялушка ў ботах» (16+).**
**7.10 Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2» (12+).**
**8.50** «Самая карысная праграма» (16+).
**9.40** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**10.25** «Тэледоктар» (12+).
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Далёкія сваякі» (16+).
**12.00 Камедыя «ДМБ» (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45** «Адкрытая размова».
**14.00 Маст. фільм «Дажывём да панядзелка» (12+).**
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Дзіўная справа» (16+).
**18.30** (16+).
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Баявік «Лара Крофт: раскрадальніца грабніц» (12+).**
**21.50** «Дзень засакрэчаных спісаў» (16+).
**22.45 Камедыя «Салдаты. Новы год, твая дывізія!» (16+).**
**0.15** «Соль». Спецыяльны выпуск (16+).

### МІР

**6.00, 8.20, 3.5** М/ф (0+).
**6.15 Маст. фільм «Казка пра страчаны час» (0+).**
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**9.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік. Меламанія» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Гараж» (12+).**
**12.40** «Любімыя акцёры». «Гараж» (12+).
**13.35 Маст. фільм «Мікіта» (16+).**
**16.15, 20.00 Серыял «Адзіны мужчына» (16+).**
**23.45 Серыял «Буду верны жонкай» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «7 футаў пад кілем». (12+).**
**10.10** «Пяцёра на аднаго». (12+).
**11.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі». (12+).
**12.10 Серыял «Правакатар-2». (16+).**
**14.00** «Наша справа». (16+).
**14.15** «Аншлаг і Кампанія». (16+).
**16.30 Маст. фільм «Дачка за бацьку». (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Прывітанне, Андрэй!» (12+).
**22.40 Маст. фільм «Расплата». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25 Серыял «Адвакат». (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс». (12+).
**8.50** Іх норавы. (0+).
**9.30** «НЗ.by».
**10.25** Галоўная дарога. (16+).
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая». (12+).
**12.00** Кватэрнае пытанне. (0+).
**13.00** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**13.51 Маст. фільм «Выйсці замуж за генерала». (16+).**
**16.25** «Следства вялі…» (16+).
**17.15** «Сакрэт на мільён». Аляксей Ягудзін і Таццяна Тацьмяніна. (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55 Маст. фільм «Водпуск па раненні». (16+).**
**23.05 Драма «Бумер». (16+).**

### 8 канал

**9.00, 16.25, 18.30, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.40 Серыял «Англійскае забойства».**
**11.15 Серыял «Выратаваць боса».**
**15.00** Суперкніга.
**15.30** Глядзім усёй сям'ёй. М/ф «Дзікія лебедзі».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**17.00 Прыгоды «Анаконда».**
**18.35 Драма «Аповесці Белкіна».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн із му прафэшн» (12+).
**21.15** Анталогія вестэрна. «Легенды восені».

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер». (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**8.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**9.00, 3.00** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**9.20, 3.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**9.40, 3.40** М/ф «Машкіны страшылкі». (6+)
**10.00** М/ф «Скубі Ду». (6+)
**10.30, 2.10** «Ералаш» (6+).
**11.30** Анімацыйны фільм «Рогі і капыты». (12+).
**13.00** «Вакол свету падчас дэкрэту» (12+).
**13.30** Серыял «Вечны водпуск» (12+).
**15.30** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**16.40** Фантастыка «Асобая думка». (12+).
**19.10** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Фантастыка «Супер 8». (12+).
**23.00** Жахі «Пасланнікі». (16+).
**0.35** «Хачу верыць!» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30** Біблейскі сюжэт.
**7.05** «Бабулі надвае варажылі». Маст. фільм.
**8.25** «Дзядзечка Ау». «Кароўка з Маслёнкіна». М/ф.
**9.50** «Звычайны канцэрт».
**10.25** «Аповесць пра першае каханне». Маст. фільм.
**11.55** Рукапісы факта. «1968: год, «які ўзрушыў свет».
**12.35** «Лета белага мядзведзя». Дак. фільм.
**13.30** «Пятае вымярэнне».
**14.00** «Мая Італія». Енас Каўфман і Нацыянальны сімфанічны аркестр Італьянскага радыё.
**15.05** «Кошка на распаленым даху». Маст. фільм.
**16.50** «Гульня ў бісер». «Г. Белых, Л. Панцялееў. «Рэспубліка ШКІД».
**17.30, 1.40** «Шукальнікі». «Праклятая шабля Дэўлет-Гірэя».
**18.15** Рэпартажы з будучыні. «Біянічныя палёты». Дак. фільм.
**18.55** «Усход—Захад». Маст. фільм.
**21.00** «Агора». Ток-шоу.
**22.00** Партрэт пакалення. «Выпрабаванне». Маст. фільм.
**23.45** Канцэрт Пола Макартні і гурта «Wings».
**0.45** «Лета белага мядзведзя». Дак. фільм.
**2.30** «Знаёмыя карцінкі». «Маленькая начная сімфонія». «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Любімыя песні пра зіму». 2005 год. (12+).
**7.15, 8.25, 9.40, 11.00, 13.05, 14.35, 15.40, 17.00, 23.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія. (12+).
**7.30** Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару». 1980 год. (16+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час». (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1988. 1-я частка. 2011 год. (16+).
**13.30** Маст. фільм «Два галасы». (16+).
**16.00** «Колба часу». (16+).
**18.00** «Сустрэча ў канцэртнай студыі «Астанкіна» з Мікітам Міхалковым». 1986 год. (12+).
**19.30** «Вакол смеху». 1981 год. Шыфр 16101. (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год. (16+).
**22.00** Маст. фільм «Проста Саша». (16+).
**23.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2004 год. (12+).
**1.05** Маст. фільм «Таня». (16+).

### EuroSport 1

**3.00, 7.00, 9.00, 11.15, 15.00, 2.00** Тэніс. Australian Open.
**11.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матч»-экстра.
**13.30, 20.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**16.15, 2.30** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матч».
**16.45, 19.45** Біятлон. Кубак свету.
**17.45** Скачкі на лыжах з трампліна.
**21.30** Зімовыя віды спорту. «Пункт назначэння».
**22.00** Снукер. «Мастэрс».
**1.30** Ралі-рэйд. «Дакар».

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Кароль вечарынак». (16+).
**2.25** Камедыя «Карпаратыў». (16+).
**4.05** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**4.50** Меладрама «Заказацца ў нявесту брата». (16+).
**6.35** Камедыя «Бясплатныя ўзоры». (16+).
**8.10** Камедыя «Фартуна Вегаса». (16+).
**9.55** Камедыя «Настаўнік года». (16+).
**12.00** Камедыя «Вясельны перапалох». (16+).
**14.00** Меладрама «Уік-энд у Парыжы». (16+).
**15.40** Прыгоды «Сардэчна запрашаем у джунглі». (12+).
**17.30** Камедыя «Вазьмі мяне штурмам». (16+).
**19.30** Камедыя «Дублёр». (16+).
**21.10** Меладрама «Фанаткі на сняданак не застаюцца». (16+).
**23.05** Камедыя «Навіны з планеты Марс». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.15** «Сардэчна запрашаем дадому!» (6+).
**11.00, 1.45** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.50, 2.25** «Труфельны пёс каралевы Джаваны». Серыял (12+).
**15.15** «Шукайце жанчыну». Камедыя (12+).
**17.55** «Мегамозг». Анімацыйны фільм (0+).
**19.25, 5.30** «10 самых» (16+).
**20.00** «Каханая». Серыял (12+).
**21.50** «Уцёкі з Шаўшэнка». Драма (16+).
**0.15** «Нябёсы, якія ўпалі». Серыял (16+).

### ТБ1000

**8.10** Дзявяткі (16).
**10.05** Законы прывабнасці (12+).
**11.50** Дывергент (12+).
**14.30** Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса (16+).
**17.30** Розум і пачуцці (12+).
**20.10** Дывергент-2. Інсургент (12+).
**22.25** Мачаха (12+).
**0.50** Без заганы (12+).
**2.50** Строга на захад (18+).
**4.15** Ключ ад усіх дзвярэй (16).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Агні вялікай вёскі (12+).
**8.05** Бабло (16+).
**9.50** Уцякі, дагнаць, закахацца (12+).
**11.35** Старое добрае кіно. Юнацтва Пятра. 1—2-я серыі (12+).
**14.25** Геаграф глобус прапіў (16+).
**16.45** Сняданак у таты (12+).
**18.35** Глухар у кіно (16+).
**20.20** Службовы раман. Наш час (16+).
**22.10** Кандагар (16+).
**0.20** Гетэры маёра Сакалова. 3—4-я серыі (12+).
**2.20** А досвіткі тут ціхія... (12+).
**4.30** Сняданак у таты (12+).

### National Geographic

**6.00, 8.25, 5.10** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.45, 19.35, 22.45** Чалавекападобныя малпы. (12+).
**9.35, 15.40, 17.15** Аўта-SOS. (12+).
**10.20, 16.30** Шаша праз пекла. (12+).
**11.05** Ледзяная дарога. (12+).
**11.50** Пачатак. (16+).
**12.40** Неверагодныя машыны. (12+).
**13.25** Займальная навука. (12+).
**14.10** Гульні розуму. (12+).
**14.55** Місія: Плутон. (12+).
**18.00, 22.00** Інстынкт выжывання. (16+).
**20.25** Антарктыка. (12+).
**21.15** Дзікае надвор'е. (12+).
**0.15** Прарыў. (12+).
**1.05** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**1.50** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**3.30** Космас: прастора і час. (12+).
**4.20** Пачатак. (16+).

### Discovery

**8.00** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00** У пагоні за класікай. (12+).
**10.00** Грандыёзныя машыны Аляскі. (12+).
**11.00** На краі Аляскі. (16+).
**12.00** Бушкрафт: лясная ліга. (12+).
**13.00** Гаражны рамонт. (12+).
**14.00, 7.10** Прыроджаныя механікі. (12+).
**16.00, 18.00, 19.30** Паляўнічыя на рэліквіі. (16+).
**20.00, 23.00, 1.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**2.00** Скаваныя. (16+).
**4.40, 6.20** Як гэта зроблена? (12+).

## Замор'е

### Самую дарагую ў свеце бутэльку гарэлкі знайшлі пустой

**Самую дарагую ў свеце бутэльку гарэлкі, украдзеную ў дацкага калекцыянера, знайшлі пустой на будпляцоўцы. Пра гэта ўладальнік рарытэта Брыян Інгеберг расказаў выданню Extra Bladet.**



Ён адназначыў, што сам напой не меў каштоўнасці. Паколькі экспанат аказаўся непашкоджаным, ён мае намер зноў напоўніць бутэльку рускай гарэлкай, а таксама ўзмацніць сістэму бяспекі ў сваім сховішча, адкуль яна была ўкрадзена. Бутэлька гарэлкі «Руса-Балт» знікла са сховішча ў кавярні, якая належыць Інгебергу, на пачатку месяца. Яе кошт складаў каля 1,3 мільёна долараў. Яна зроблена з серабра і золата і дэкарыраваная выявай гоначнага аўтамабіля «Руса-Балт» і гербам Расійскай імперыі на корку, напой фільтруецца праз насадку з дыяментамі. У крадзяжы гаспадар падазрае былога супрацоўніка, які мог зрабіць дублікаты ключоў ад бара і сейфа. Усяго ў яго калекцыі каля 1,2 тысячы бутэлек.

### Шведам прапанавалі імітаваць турыстаў

**Шведскае аддзяленне аднаго сеткавага турагенцтва размясціла на сваім сайце інфармацыю аб вакансіі для чацвярых «прафесійных гультаёў». Саіскальнікам прапануецца сядзець увесь дзень у офісе, афармленым як пляж, імітаваць адпачынак каля мора і атрымліваць за гэта заробак, паведамляе Mirror.**



Работадаўцы шукаюць людзей, не здольных думаць нестандартна, а таксама тых, хто «ненавідзіць словы «прадукцыйнасць», «дэдлайн» і любіць ляжаць або сядзець». Сярод патрабаванняў да прэтэндэнтаў значыцца псіхалагічная ўстойлівасць, а таксама здольнасць сканцэнтравацца на адпачынку і не адрывацца на вонкавыя раздражняльнікі. На працягу працоўнага дня наёмным работнікам будзе дазволена чытаць, слухаць музыку і драмаць. Праца мяркуецца зменная, аплата — пагадзінная. Прапанова сапраўдная для ўсіх, хто будзе знаходзіцца на тэрыторыі Стакгольма з 22 студзеня па 4 лютага.

### Выпіў і... паскардзіўся на сябе ў паліцыю

**У амерыканскім штаце Фларыда п'яны кіроўца патэлефанаваў у экстранную службу і паскардзіўся на самога сябе, паведамілі прадстаўнікі шэрыфа акругі Полк.**

Нейкі мужчына, які прадставіўся Майклам, патэлефанаваў у 911 і паведаміў, што вядзе машыну, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення. Як чуваць на аўдыязапісе, дыспетчар угаворвае кіроўцу прыцісну́цца да абочыны і спыніцца, аднак той доўга сумняваўся і не мог успомніць сваё прозвішча і апісаць, дзе знаходзіцца. Паліцэйскім усё ж удалося высветліць яго месцазнаходжанне. Калі яны прыбылі туды, кіроўца расказаў, што выпіў два ці тры-чатыры куфлі піва. Таксама ён прызнаўся, што ўжываў метамфетамін. Як высветлілася, раней мужчына ўжо не раз прыцягваўся да адказнасці, у тым ліку за кіраванне ў нецвярозым стане, захоўванне наркотыкаў, хуліганства і супраціўленне супрацоўнікам паліцыі.

**Іван КУПАРВАС.** *hvir@zviazda.by*

# АСАБЛІВАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

## Вельмі важна, каб мы ўмелі яе бачыць...

**Алена ЖДАНЮК з Валожына, колькі сябе памятае, заўсёды любіла прыдумваць і ствараць сваімі рукамі ўпрыгажэнні, сувеніры і цацкі — увогуле ўсю тую прыгажосць, якую мы цяпер называем замежным словам хэнд-мэйд. А нядаўна яна адважылася і ператварыла сваё хобі ў прафесію.**



**Алена ЖДАНЮК верыць у пазітыўныя перамены.**

Напэўна, да гэтага падштурхнула і перамога на конкурсе сацыяльных і бізнес-праектаў, што праходзіў у рамках праекта «Валожын без бар'ераў». Дзякуючы гэтаму дзяўчына стала слухачом стартап-школы і ўдзельнічала ў майстар-класах і кансультацыях па стварэнні і прасоўванні ўласнага бізнесу.

У выніку падчас навучання Алена прыйшла да рашэння рэалізаваць два праекты: адзін — бізнес-праект па стварэнні рэчаў хэнд-мэйд «Лянок-матылёк», другі — сацыяльны праект, у рамках якога яна плануе прыцягваць да рэкламы сваіх упрыгажэнняў людзей з інваліднасцю. Гэты праект атрымаў назву «Асаблівая прыгажосць». Ён прадугледжвае, што дэманстраваць і рэкламаваць створаныя Аленай упрыгажэнні будуць дзяўчаты-мадэлі з сіндромам Дауна. Па словах Алены Жданюк, ужо ёсць дзве такія дзяўчынкі, гатовыя супрацоўнічаць. Іх мамы таксама згодныя.

— Я хачу паказаць, што прыгажосць бывае розная, — сцвярджае Алена. — Хачу, каб, гледзячы на фатаграфіі маіх мадэляў, людзі ні ў якім разе не адчувалі жаль! Наадварот, каб яны бачылі прыгожых дзяўчат, у якіх нешаблонны выгляд. І мне хацелася б, каб бацькі тых дзяцей, у якіх інваліднасць прыкметная вонкава, не хавалі сваіх дзяцей ад свету, а дазволілі ім быць самастойнай часткай гэтага свету.

Дарэчы, у іншых краінах такі вопыт ужо ёсць. Так, у 2015 годзе 18-гадовая мадэль з сіндромам Дауна Мэдлін Сцюарт стала новай зоркай Нью-Ёркскага Тыдня моды. Пасля гэтага Мэдлін і яе маці Разанна пачалі атрымліваць прапановы ад міжнародных мадэльных агенцтваў, і цяпер дзяўчына робіць рэальныя крокі ў мадэльным бізнесе. Гэта вельмі пазітыўны і яскравы прыклад, які паказвае, што ў свеце мяняецца стаўленне да людзей з абмежаванымі магчымасцямі — у многіх краінах яны лічацца нармальнымі членамі грамадства, якім цалкам даступна прафесійная і асабістая рэалізацыя ў самых розных сферах нашага жыцця.

У нашым грамадстве стаўленне да падобных ідэй пакуль яшчэ насцярожанае. Але яно, як і любая іншая грамадская думка, здольна мяняцца. Алена Жданюк лічыць: для таго, каб гэта стаўленне хутчэй памяняць, трэба больш актыўна падключаць да тэмы аўтарытэтных для большасці з нас персон, лідараў, якія дапамаглі б усім нам убачыць, што ў людзей з інваліднасцю ёсць добры патэнцыял. І грамадства можа і павінна гэты патэнцыял развіваць і выкарыстоўваць. «Я зараз шукаю такіх лідараў думак», — кажа Алена.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

# НАКОЛЬКІ ГЭТА РЭАЛЬНА?

**Ці гатова беларускае грамадства да таго, каб уключыць людзей з інваліднасцю ў актыўнае грамадскае жыццё? Што для гэтага трэба зрабіць усім нам? З такімі пытаннямі мы звярнуліся да тых, хто зараз актыўна працуе ў азначаным кірунку.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Тамара КРАСОЎСКАЯ:**

— Мы на 100 працэнтаў гатовыя. Я бачу гэта, я сустракаюся з людзьмі, над дадзенай тэмай цяпер вядзецца ўзмоцненая работа. Самае галоўнае, што самі інваліды да гэтага гатовыя, а грамадства павінна прыняць іх, але не як аб'екты або прадметы, а як звычайных людзей. Што мы для гэтага робім? Сустракаемся з інвалідамі, грамадскімі арганізацыямі, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны; распрацаваны план мерапрыемстваў па выніках ратыфікацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў. Усё зроблена для таго, каб інклюзія ўвайшла ў наша грамадства як данасць.

Вядома, у перспектыве з'явяцца і заканадаўчыя акты. Будуць змены ў розных звязаных законах, якія рэгулююць правы ў дачыненні да такіх людзей. Над гэтым ужо пачынаецца работа, мы бачым канкрэтныя пытанні.

Хочацца, каб дзеці з асаблівасцямі сацыялізаваліся ў школе і стаўленне да іх было адпаведнае. Таму мне здаецца, што пачынаць трэба з дзіцячага садка: калі розныя дзеці гуляюць у адной пясочніцы, то будзе і іншае іх успрыманне. Усё атрымаецца, калі рэалізаваць комплекс мерапрыемстваў, тым больш што ў нас вельмі талерантнае грамадства.

**Дырэктар «Офіса па правах людзей з інваліднасцю» Сяргей ДРАЗДОЎСКІ:**

— Калі казаць пра нацыянальны характар беларускага грамадства, то ў цэлым мы пакуль слаба гатовыя. Тут ёсць шэраг бар'ераў. Па-першае, мы павінны дакладна разумець, што інваліднасць — гэта не проста чалавек у калясцы або невідушчы, і ўсё. Гэта і велізарны пласт людзей, якія маюць псіхасацыяльныя, інтэлектуальныя парушэнні, інваліднасць унутраных органаў — тая ж анкалогія. Другое: сапраўды існуюць ментальныя праблемы ўнутры грамадства, а менавіта непрыманне, якое становіцца на шляху інклюзіі.

Складана сказаць, што важней, але адзін з самых галоўных бар'ераў — гэта адсутнасць рэальнай дзяржаўнай палітыкі. Так, у нас ёсць дэкларацыі, падпісаныя дакументы, шэраг нядрэнных законаў, якія фактычна не выконваюцца. У іх чалавек займае ролю аб'екта, але не суб'екта ўзаемадзеяння. Просты прыклад: усё бюджэтнае фінансаванне прыпадае не на чалавека, а на органы, установы, інстытуты. Без гэтага моманту мы ніколі не рэалізуем якаснае ўзаемадзеянне.

Акрамя таго, факт застаецца фактам: на топавых пазіцыях мы практычна не бачым людзей з інваліднасцю. Так, мы пачалі заўважаць іх у такіх вузкіх сферах, як IT, журналістыка, спорт, грамадская дзейнасць. А вось дзяржаўная палітыка — дзе там людзі з інваліднасцю? Мясцовае самакіраванне, буйны бізнес? Іх практычна няма.

Генеральны індыкатар палажэння: калі нашы людзі ўпершыню трапляюць за мяжу, іх першыя ўражанні — нібы колькі ж там інвалідаў і як мала іх у нас! Гэта фактар таго, што фарматы тых грамадстваў больш прыязныя і інклюзіўныя, чым наш. Я лічу, што ў нас ёсць патэнцыял і напрацоўкі, аднак пакуль працэсы рэформаў буксуюць.

**Кіраўнік міжнароднай дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА:**

— Фактычна не гатова. Ад грамадства, звычайных людзей патрабуецца разуменне, але яго пакуль, на жаль, недастаткова. Я вельмі тонка — і як кіраўнік арганізацыі, і як мама дзіцяці з асаблівасцямі здароўя — адчуваю, што сітуацыя мяняецца. І праца грамадскіх арганізацый, як асобная, так і з дзяржаўнымі органамі, не праходзіць бясследна. Тым не менш пакуль яшчэ агульная сацыяльная атмасфера не гатовая да гэтага.

Што трэба зрабіць? Патрэбны нейкія рухі насустрач, рэальныя дзеянні з боку сістэмы. Заканадаўча мы прасунуліся на міжнародным узроўні, была ратыфікавана Канвенцыя аб правах інвалідаў, цяпер мы ў стане імплементацыі — рэальнага ўвасаблення. Але патрэбны не чаканні, што з'явіцца нейкі дакумент, а людзі з месцах.

Дарэчы, бацькі дзяцей з асаблівасцямі рэдка ездзяць за мяжу. Але мне часта кажуць: а чаму там так, а ў нас інакш? Вось калі звяртаць на гэта ўвагу — і не проста чалавечую, а прафесійную — то мы будзем мяняцца. Ёсць лічаная колькасць мам, якія бяруць на сябе адказнасць па тэме аўтызму, а калі да іх падключыцца грамадства і дзяржава, будуць прыняты рашэнні, то ўсё атрымаецца. Трэба працаваць.

**Грамадская актывістка і PR-спецыяліст Дар'я ТРАЙДЭН:**

— Да сур'ёзных змен ніколі не можа быць поўнай гатоўнасці, таму што рабіць новае — гэта трапляць у поле невядомасці, у сітуацыі, якія немагчыма было прадугледзець. Няма механізмаў, адладжаных часам, няма вопыту. Але змены павінны пачынацца — няхай і без масавай падтрымкі.

Мне складана сказаць, ці ўсе ў Беларусі разумеюць праблему сацыяльнай інтэграцыі людзей з інваліднасцю. Але і нельга чакаць, пакуль усе зразумеюць. Важна, каб гэта разумела ў першую чаргу дзяржава. Таму што дзяржаўная палітыка, добра рэалізаваная, можа вельмі змяніць становішча людзей з інваліднасцю. І тут гаворка не пра адно толькі безбар'ернае асяроддзе, але і пра магчымасці працаўладкавання, пра інклюзіўную адукацыю, пра падтрымку бацькоў з інваліднасцю, у якіх з'явілася дзіця (чытала гісторыі пра тое, што сацыяльныя службы часта спрабуюць забраць дзяцей з такой сям'і). Таксама важныя ініцыятывы бізнесу. Напрыклад, тое, што сетка крамаў «Віталюр» запрасіла на працу людзей з інваліднасцю — гэта вельмі важны крок. Чым больш магчымасцяў для рэалізацыі і матэрыяльнай незалежнасці будзе ў людзей з інваліднасцю, тым лепш. І з часам сыдзе гэта паўсюднае здзіўленне «а чаму яны проста дома не сядзяць?».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*


# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СЧАСТЛИВАЯ ПОКУПКА-7»

**Сведения об организаторе:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «КонтеТрейд», УНП 590701005, г. Гродно, ул. Победы, 30.

**Наименование рекламной игры:** «Счастливая покупка-7».

**Территория проведения игры:** Республика Беларусь.

**Срок начала и окончания рекламной игры:** 1 сентября 2017 г. – 20 января 2018 г.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3064 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 4 августа 2017 г. Правила рекламной игры «Счастливая покупка-7» были опубликованы в газете «Звязда» № 163(28527) от 25.08.2017 г.

**Сведения о количестве участников рекламной игры:** в рекламной игре участвовало 22 546 человек.

**Сведения о розыгрыше призового фонда:** Призовой фонд, общий размер которого составляет 94 470 (девяносто четыре тысячи четыреста семьдесят) белорусских рублей, разыгран полностью.

**Ф.И.О. победителей рекламной игры, их выигрыш:** Список победителей рекламной игры(с указанием выигранного приза) размещен на сайте **www.happyby.com**

**Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры:** + 375 33 377-78-97, + 375 44 504-07-77.



## Извещение о проведении 24 января 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «административное помещение» общей площадью 2008,7 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 500/D-708150242; теплосчетчик SKU-01 с инв. № 462014; электросети 200М К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-169; сети водопровода d100 мм L23 м К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-170; т/сети К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-178 | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 500 954,00 | 150 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 24 января 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.01.2018 по 22.01.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»).

# ЗАДАВАЛЬНЕННЕ НЕ ДЛЯ ЎСІХ

**ДРОБНЫЯ фермерскія гаспадаркі ў Беларусі працуюць сёння павольна і не надта адкрыта. Вядома, на фермерскім полі ёсць і буйныя гульцы, чые аб'ёмы вытворчасці выводзяць іх на адзін узровень з некаторымі калгасамі. Каб высветліць, як ідуць справы з развіццём айчынных дробных фермерскіх гаспадарак, мы пагутарылі з Надзеяй САБАЛЕЎСКАЙ, уладальніцай інтэрнэт-крамы дастаўкі фермерскіх і арганічных прадуктаў «ЭкаЕжа», чыя арганізацыя супрацоўнічае з 15 фермерамі.**

## Пра Еўрапейскі сертыфікат

Ідэя для стварэння падобнай інтэрнэт-крамы з'явілася больш за пяць гадоў таму. «Стала цікава, як ствараюцца прадукты і як яны з'яўляюцца на прылаўках крам, — кажа Надзея. — Усе беларусы па-рознаму ставяцца да арганічных прадуктаў, ёсць катэгорыя людзей, якім гэта цікава, — і іх колькасць павялічваецца».

Напачатку магазін працаваў выключна з мясцовымі фермерамі, якія вырошчваюць свае прадукты па арганічных ці блізкіх да іх тэхналогіях, з тымі, хто адмовіўся ад выкарыстання мінеральных угнаенняў, пестыцыдаў і гербіцыдаў, ГМА-насення, антыбіётыкаў і камбікармоў.

«У нас зусім няшмат сертыфікаваных фермераў, іх можна пералічыць па пальцах. Але мы працуем і з несертыфікаванымі работнікамі, таму што, на жаль, асартыменту не хапае. Аднак з гэтымі людзьмі мы працуем доўга і ведаем, што і як яны робяць, па сутнасці — яны маглі б атрымаць Еўрапейскі сертыфікат, калі б гэта было даступна і лёгка», — дадае Надзея Сабалеўская.

Чаму такі сертыфікат дакладна не перашкодзіць? Таму што тады людзі будуць разумець, што прыстаўкі «эка-» і «бія-» рэальна пазначаюць арганічны прадукт.

## Пра праблемы і перспектывы

«Мы працуем з пэўнай групай фермераў, таму за астатніх казаць цяжка. Што датычыцца фермераў-энтузіястаў, якія займаюцца арганічным або набліжаным да арганічнага фермерствам, то праблема ў тым, што заканадаўства пад іх ніяк не падстроена, — адзначае Надзея. — Адпаведна, яны працуюць на тых жа ўмовах, што і ўсе фермеры, а ўкладанні ў іх значна большыя — і энергетычныя, і фінансавыя, і нават рызыкі. Тое ж датычыцца і патрабаванняў».

У прыклад дзяўчына прывяла фермера: мясцовыя ўлады папрасілі яго абкасіць участак зямлі, своеасаблівую буферную зону, на якой спецыяльна былі пакінуты зараснікі бульбянугу, каб абараняць асноўныя землі ад пестыцыдаў і іншых рэчываў з тэрыторыі суседняга калгаса. Гэта значыць, што бур'ян «працаваў» як заслона. «І тут два варыянты: альбо паступіцца ўласнымі прынцыпамі і скасіць, альбо заплаціць вялікі штраф. І ён выбраў другое».

Аднак аб якім-небудзь выцясненні дробных гульцоў з рынку гаворкі, канешне, не ідзе, упэўнена Надзея. «Правілы і нормы для ўсіх роўныя. Аднак няма індывідуальнага падыходу. А дробны фермер займаецца крыху іншай дзейнасцю, у адрозненне ад буйных гаспадарак, — лічыць Надзея Сабалеўская. — Больш гнуткіх умоў для такіх людзей няма, таму ўсё залежыць ад канкрэтнага фермера. Альбо ён марнуе свой час і грошы, таму што яму гэта падабаецца, альбо ён сыходзіць з гэтай сферы. Таму змены ў заканадаўстве не перашкодзілі б».

## Пра супермаркеты і цэны

У 2013 годзе «ЭкаЕжа» пачала ўвозіць у Беларусь арганічныя прадукты з Еўропы — напрыклад, бабовыя, крупы, алей халоднага адціскання. Так арганізацыя пашырыла свой асартымент, а пазней выйшла на рынак мінскіх супермаркетаў. Дарэчы, дробным фермерам працаваць з буйнымі гандлёвымі сеткамі няпроста. «Яны могуць, бо зараз попыт на арганічную прадукцыю патроху павялічваецца. Вядома, гандлёвым сеткам лепш супрацоўнічаць з меншай колькасцю фермераў, каб не загразнуць у афармленні вялікай колькасці дагавораў і іншых папер. Але тады не хопіць сур'ёзных вытворчых магутнасцяў, каб задаволіць буйную гандлёвую сетку. Бо, як правіла, такія фермеры дробныя. Вось і атрымліваецца такая нестыкоўка», — кажа спадарыня Сабалеўская.

Акрамя таго, цэны на арганічныя прадукты вышэйшыя, чым на звычайныя, аднак тут справа не ў грашах. «Гэта своеасаблівае ўкладанне ў будучыню — лепш зараз патраціць крыху больш на ежу, каб потым не траціць шмат на лекі. Я так разумею, што людзі пра гэта думаюць». Дарэчы, сярэднестатыстычны кліент крамы — гэта жанчына, у якой ёсць сям'я і дзеці, ва ўзросце за 30 гадоў з сярэднім прыбыткам і вышэй. Часам прыходзяць і бабулі, якія перыядычна бяруць тварог, нехта заказвае прадукты дзецям, у якіх алергія. Усё індывідуальна, аднак цікавасць да прадукцыі з'яўляецца ў розных людзей.

«Зараз увесь прыбытак мы ўкладваем у развіццё. Звышпрыбытку ў нашай справе няма. Трэба разумець, што ўмовы гульні пастаянна змяняюцца. Напрыклад, у нас былі ўкладанні ў імпартныя прадукты ў сферы дэкларавання і сертыфікацыі. А праз нейкі час увялі новыя фітасанітарныя нормы — і мы страцілі грошы».



Па словах Надзеі, цяпер нельга спакойна адысці ад спраў, каб бізнес працаваў без аніякіх праблем. «Гэта вельмі доўгатэрміновы праект з пастаянным удзелам, убок сысці не атрымаецца. Цяжкасці? Вядома, узнікаюць. Але калі ты займаешся сваёй справай, то ў любым выпадку будзеш пастаянна вырашаць праблемы».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

## Наколькі прыбыткова займацца рэалізацыяй арганічных прадуктаў?

**У тэму**

**Дзмітрый КРЫЛОЎ, уладальнік адной з самых буйных у Беларусі фермаў па развядзенні коз «ДАК»:**



— Першая праблема нашых фермераў — гэта адукацыя. Для таго каб весці фермерскую гаспадарку, патрэбны адпаведныя веды і ўменні. А вось у фермераў часцяком неабходнай адукацыі для гэтай справы няма. Акрамя таго, трэба ведаць тэхналогіі.

Праблемы з заканадаўчай базай? Не думаю, што з гэтым ёсць нейкія складанасці, яшчэ ў былыя часы быў прыняты нармальны закон. Я сказаў бы, што ў дачыненні да малога фермерства дзяржаўнай палітыкі недастаткова. Але гэта абгрунтавана тым, што Беларусь больш арыентавана на буйныя таварныя гаспадаркі, а фермеры — часцей дробныя гульцы.

Тут яшчэ трэба разумець, якім гаспадаром ты хочаш быць: калі гэта хатні, сямейны бізнес для сябе і сваякоў — гэта адно, а другое, калі ты становішся фермерам буйным. У дробнага фермера вельмі нізкая канкурэнтаздольнасць супраць буйной гаспадаркі, якая можа выкарыстоўваць дарагія тэхналогіі і пры гэтым хутка акупіцца.

На Захадзе гэтая праблема вырашаецца шляхам кааперацыі: там вельмі шмат маленькіх гаспадарак — калі ім патрэбны камбайн або сушылка, то яны аб'ядноўваюцца і набываюць гэтую адзінку тэхнікі, напрыклад, на 20 фермераў. У іх гэта добра развіта, але і фермераў там сотні тысяч. А ў нас на ўсю Беларусь іх 2,5 тысячы, таму пра кааперацыю гаварыць сёння складана. Гэта і ёсць другая праблема: дзяржаўная палітыка накіравана на буйныя арганізацыі, а не на дробных фермераў.

Таму фермеру лепш займацца эксклюзіўнымі рэчамі. На сутнасці, нашы дробныя фермеры гэтую нішу і закрываюць. Альбо гэта ягады, альбо сады, альбо лекавыя травы.

Перспектывы? Напэўна, яны ёсць, улічваючы тое, што дзяржаўная палітыка сёння паварочваецца ў бок прадпрымальніцтва — і ў вёсках у тым ліку. Па меншай меры, як дагэтуль было: калі і не дапамагаюць, дык хаця б не перашкаджаюць.

**Ігар ХВАШЧЭЎСКІ, кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Вермі Экапрадукт», Смаргонскі раён:**



— Асноўная праблема на сённяшні дзень — гэта недахоп кліентаў па арганічнай прадукцыі. Што датычыцца заканадаўчай базы, то на сённяшні дзень не прыняты закон аб арганічным земляробстве, а гэта не дае разабрацца як пастаўшчыкам, так і кліентам у тым, ці сапраўды прадукт арганічны. Нядаўна я быў у адной краме, на прылаўку якой ляжалі прадукты з пазнакай «эка». Я папрасіў падаць сертыфікат, які гэта пацвярджае, аднак аказалася, што сертыфікату проста няма.

З-за адсутнасці адпаведнага закона людзям няпроста зразумець, чаму «ЭкаЕжа» прадае біясмятану па больш высокай цане, чым у звычайнай краме. Быў бы закон, людзі б разумелі, што за той жа біясмятанай стаяць каровы, адсутнасць антыбіётыкаў і іншыя рэчы, таму цана ў прыватнай краме цалкам апраўданая.

Акрамя таго, фермерам не хапае магчымасцяў крэдытавання. У Еўропе сектар арганічнага земляробства атрымлівае датацыі, у нас пакуль гэтага няма.


Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение об отмене аукциона**

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует: аукцион, назначенный на 31.01.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, по продаже объектов недвижимого имущества, принадлежащих ООО «Паритет Риэлт», расположенных в г. Бобруйске по ул. Рабочей, д. 23, отменяется. Публикацию извещения о проведении торгов в газете «Звязда» от 28.12.2017 г. считать недействительной

**Контактные тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42; e-mail: auction@cpo.by** УНП 100080849

**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

**Фондом «Гродннооблимущество» проводится аукцион с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, определенной законодательством по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

**К продаже предлагается:**

Комплекс зданий и сооружений производственной базы по улице Южная, 37, 37А, 37Б в городе Волковыске.

**Аукцион состоится 8 февраля 2018 года в 11.30.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.**

**Последний день подачи заявлений на участие в аукционе 2 февраля 2018 года до 13.00.**

**Подробная информация по телефонам:**

в городе Волковыске 8 (01512) 4 50 25;

в городе Гродно: 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02.

УНП 500042135

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 20%) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВИСЛОЧСКОГО ФИЛИАЛА ГРОДНЕНСКОГО ОБЛПОТРЕБОБЩЕСТВА**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Лот № 1**<br>**Капитальное строение инв. № 413/С-19951** (магазин) с пристройкой общей площадью 56,4 кв. м, кирпичное, 1948 г. п. | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Свислочский р-н, г. Свислочь, ул. Мельнова, д. 19** | | | |
| Информация о земельном участке | Площадь 0,0096 га, кадастровый номер 425250100001002061, назначение – для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции | | |
| Начальная цена | **6 628 руб. 00 коп. с учетом НДС** | Сумма задатка (5 %) | **331 руб. 40 коп.** |
| **Сведения о продавце:** Свислочский филиал Гродненского облпотребобщества, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 8 (01513) 32495 | | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | | | |
| **Условия оплаты:** предоставление рассрочки на 12 месяцев с уплатой первоначального взноса в размере 20% | | | |
| **Торги состоятся 26 января 2018 года в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **по 22 января 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | |
| Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте **www.fincentr.by**, телефон для справок 8 (0152) 744911.<br>Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 30.09.17 года, 22.11.2017 года | | | |

ОАО «Світанак» г. Жодино приглашает организации принять участие в переговорах по выполнению комплекса строительно-монтажных и пусконаладочных работ на объекте «Замена оборудования ГРУ и средств автоматизации котла ДЕ 10-14ГМ в котельной ОАО «Світанак» г. Жодино».

Заявки принимаются по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 15.00 23.01.2018 г. За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8 (01775) 7-14-92, 7-97-74.

УНН 600038919

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующим Цилинского Максима Юрьевича, 31.07.1984 года рождения, уроженца г. Комсомольск-на-Амуре Хабаровского края Российской Федерации, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Советская, 97, а/22. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2 месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Цилинском Максиме Юрьевиче.

УНП

# ПАСТАВІЛА ПАТЭЛЬНЮ НА ПЛІТУ, ПАЙШЛА Ў КРАМУ...



## А вяртацца няма куды

**ПАСЛЯ выпадку ў Барысаве вытворцы вынайшлі апавяшчальнік чаднага газу. Як толькі чад пступае ў памяшканне, прыбор рэагуе гукавым і светлавым сігналамі. Таму спецыялісты рэкамендуюць набываць гэты «разумны» апарат спажыўцам, асабліва там, дзе ўстаноўлены калонкі і катлы. «Гэты надзейны памочнік папярэдзіць аб небяспецы, — кажа начальнік тэхнічнай інспекцыі ўнітарнага прадпрыемства «Мінгаз» Людміла МАТУКЕВІЧ. — Каштуе ён 28—30 рублёў, ёсць і таннейшыя».**

— Наша прадпрыемства абслугоўвае больш як 530 тысяч кватэр з прыродным газам у Мінску і Мінскім раёне. Толькі ў сталіцы летась спецыялісты падчас планавага тэхнічнага абслугоўвання праверылі 123 626 адзінак абсталявання. Але здараецца, што зрабіць гэта своечасова немагчыма з розных прычын, — працягвае Людміла Уладзіміраўна. — Нехта з уладальнікаў здае кватэру, у іншай ніхто не пражывае. Ёсць частка спажыўцоў, якія наогул ігнаруюць правілы. А без дазволу гаспадароў ніхто, нават у суправаджэнні міліцыі, не мае права доступу ў памяшканне для абследавання і абслугоўвання. Таму актыўна працуем з насельніцтвам: праводзім разнастайныя акцыі, вывешваем аб'явы каля пад'ездаў, змяшчаем інфармацыю ў сродках масавай інфармацыі, на паведамленнях аб аплаце камунальных паслуг, а таксама нагадваем аб своечасовым правядзенні тэхнічнага абслугоўвання.

Сутыкаюцца газавікі і з іншымі праблемамі. Здараецца, што спажыўцы проста ігнаруюць правілы карыстання газавым абсталяваннем, хоць з імі папярэдне ў абавязковым парадку праводзіцца інструктаж.

— На жаль, многія разлічваюць на «ўдачу», адсюль і ўсе праблемы, — канстатуе Людміла Матукевіч. — Напрыклад, пры карыстанні любым газавым абсталяваннем трэба абавязкова адкрываць фортку, каб быў прыток паветра, асабліва там, дзе ўстаноўлена ацяпляльнае і воданагравальнае газавае абсталяванне. Парушэнне гэтай нормы можа прывесці да атручвання чадным газам, паколькі прадукты згарання цалкам не выдаляюцца і частка іх трапляе назад у памяшканне. У 2017 годзе адбылося шэсць такіх выпадкаў. У кожным з іх грамадзяне праігнаравалі гэтае правіла.

Спецыяліст засяродзіла ўвагу яшчэ на адным недапушчальным моманце — калі ў каналы вентыляцыйнай сістэмы ўстаўляюць электрамеханічныя выцяжкі. Пры ўключэнні ў выніку адсутнасці прытоку паветра ў пэўны момант можа «перавярнуцца» цяга ў дымавым канале, і прадукты дымавыдалення пачнуць паступаць у жыллё. Некалькі хвілін знаходжання ў ім прывядуць да лятальнага зыходу.

Дарэчы, у апошнія гады газавікі ўсё часцей сутыкаюцца з няспраўнасцю дымавых і вентыляцыйных каналаў. Многія дамы, пабудаваныя ў 60—70-я гады мінулага стагоддзя, далі ўсадку, трэшчыны. Таму дымавыя газы праз няшчыльнасці трапляюць у міжпрастору дома, а далей у вентыляцыйныя каналы і жылыя памяшканні. Апошні такі выпадак адбыўся 24 лістапада 2017 года ў Мінску па вуліцы Авакяна, 36, у кватэры на першым паверсе.

— У гэтым доме па плане дымавыя каналы правяраліся раз у тры месяцы. Але менавіта ў гэтую кватэру спецыялісты, якія аказваюць паслугу па праверцы дамавых і вентыляцыйных каналаў, не маглі трапіць ніводнага разу ні ў 2016, ні ў 2017 гадах — не было доступу. Падчас расследавання высветлілася, што перагародка паміж дымавым і вентыляцыйным каналамі мела трэшчыну, у выніку чаго прадукты згарання праз вентыляцыйны канал трапілі ў памяшканне. Атруціліся тры чалавекі. Яны засталіся жывыя дзякуючы аказанню своечасовай медыцынскай дапамогі. Абследаванні выявілі, што ў 60 кватэрах былі няспраўныя як дымавыя, так і вентыляцыйныя каналы. Былі выдзелены сродкі, на якія закуплены дарагія матэрыялы, зроблена адпаведная герметызацыя каналаў, — расказала начальнік тэхнічнай інспекцыі УП «Мінгаз».

Па словах спецыяліста, гэтыя каналы ў асноўным правяраюць прыватныя арганізацыі, з якімі прадпрыемствы ЖКГ заключаюць дагаворы на выкананне работ. Але справа ў тым, што праверка на герметычнасць праводзіцца з дапамогай сістэмы задымлення. Гэты метад цягне за сабой падаражанне кошту работ, таму, як відаць, яго не выкарыстоўваюць.

Што датычыцца таго ці іншага бытавога абсталявання, то нарматыўны тэрмін яго эксплуатацыі прапісаны ў пашпарце і ён розны для розных прыбораў. Але, як правіла, у асноўным не больш 20 гадоў. Ці можна выкарыстоўваць прыборы, вызначаюць шляхам тэхнічнага дыягнаставання. У выніку гэтай працэдуры спажыўцу выдаецца адпаведная рэкамендацыя. Бясспрэчна, пакупка новай пліты — гэта фінансавая праблема для гаспадара, але чалавечае жыццё даражэйшае.

Людміла Матукевіч у абавязковым парадку заклікае спажыўцоў не пакідаць без нагляду працуючае газавае абсталяванне, не пераключаць увагу на іншыя хатнія справы, паставіўшы патэльню на пліту, тым больш не адлучацца з кватэры.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# А Ў НАС У КВАТЭРЫ ГАЗ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

У 2017 годзе «Мінаблгаз» удасканальваў работу эксплуатацыйных службаў прадпрыемства. Праводзіліся стажыроўкі і навучанне работнікаў, у тым ліку для абслугоўвання новых марак імпартнага газавага абсталявання. Адпаведныя службы ўкамплектаваны сучаснымі прыборамі, якія дазваляюць вызначаць канцэнтрацыю чаднага газу ў памяшканні і наяўнасць цягі ў дымавых і вентыляцыйных каналах. Забеспячэнне сродкамі аўдыя- і відэафіксацыі дазволіла павысіць кантроль якасці работ.

— Шмат увагі ўдзяляем інфармаванню насельніцтва, юрыдычных асоб па бяспечным карыстанні газам і прыборамі. Сацыяльная рэклама змяшчаецца ў раённых газетах, гучыць па радыё. На мясцовым тэлебачанні ў Слуцку, Салігорску, Маладзечне, Жодзіне і Барысаве дэманструюцца відэазастаўкі, на інтэрнэт-сайтах — відэаролікі адзін раз на два тыдні. На канале «Сталічнага тэлебачання» круцім відэаролік па правілах карыстання газавым абсталяваннем, — канстатуе Сяргей Барадаўка. — З 15 па 31 сакавіка мінулага года праведзена абласная акцыя па бяспечным карыстанні газам у быце сярод школьнікаў і гімназістаў з прыцягненнем сродкаў масавай інфармацыі. Падчас прафілактычнай работы актыўна выкарыстоўваюцца календары, магніты, памяткі, друкаваная прадукцыя.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 14 февраля 2018 года в 11.00 в городе Гомеле по ул. Гагарина, 20 открытого аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства**

| № лота | Наименование объекта | Уполномоченный орган | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Недвижимое имущество – несамоходная баржа-площадка для перевозки минерально-строительных грузов судно Р-0473,** 1985 года постройки, регистрационный номер **ВД766, порт прописки –** речной порт Мозырь, **материал корпуса** – сталь | ИМНС РБ по Мозырскому р-ну | **241 812,00** | 24 181,20 |

**Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204, ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 января 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12 февраля 2018 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) **не позднее 20 (двадцати) рабочих дней** с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем (единственным участником) аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, соответствующим Департаментом по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 (двадцать) рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по оплате предмета торгов. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства (Указ Президента РБ от 19.02.2016 г. № 63). **Примечание: земельный участок под объект продажи будет сформирован согласно законодательству РБ покупателем после приобретения капитального строения самостоятельно. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

**ОАО «Крупский плодоовощной завод» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона**

<table>
<tr><td colspan="2">Лот № 1</td></tr>
<tr><td colspan="2">Капитальное строение с инвентарным № 613/С-10556, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2, площадь – 1 598,1 м², назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание хранилища техники</td></tr>
<tr><td colspan="2">Земельный участок площадью 5,6931 га с кадастровым номером 623050100001002292. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Право аренды – по 01.10.2102. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь</td></tr>
<tr><td colspan="2">В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 30.11.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10 %. Окончание приема заявлений в 16.00 29.01.2018</td></tr>
<tr><td>Начальная цена Лота с НДС 20%</td><td>114 480,00 белорусских рублей</td></tr>
<tr><td>Задаток</td><td>11 448,00 белорусских рублей</td></tr>
<tr><td>Шаг аукциона</td><td>5 % от начальной стоимости предмета торгов</td></tr>
<tr><td>Организатор торгов</td><td>ООО «Фрондера», тел. +375 29 305-86-50</td></tr>
<tr><td>Информация о продавце</td><td>ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122)</td></tr>
<tr><td>Дата и время проведения торгов</td><td>31 января 2018 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55) по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 11, конференц-комната № 609</td></tr>
<tr><td colspan="2">Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122</td></tr>
<tr><td>Условия для участия в торгах</td><td>1. До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту № 1, проводимых 31.01.2018.<br>2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah.<br>3. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. Также победителем подлежат возмещению затраты по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затраты по размещению публикации (согласно выставленному счету).<br>4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – Екатерина, тел. + 375 26 395-30-88</td></tr>
</table>

# ХТО Ў ЛЕС І ХТО — ПА ДРОВЫ?

## Як вяскоўцу нарыхтаваць паліва для печы? Адказ не такі просты...

**З ЛЕЛЬЧЫЦКАГА раёна да нас звярнуўся даўні чытач са скаргай, што цяжка здабыць на зіму дровы. У сілу паважанага ўзросту заяўніка было складана зразумець, што менавіта мае на ўвазе мужчына. Бо, падавалася б, жывём у лясной краіне, і арганізацыі, якія дапамагаюць насельніцтву нарыхтаваць паліва, ёсць паўсюдна. Што тады не так? Тым не менш, каб не крыўдзіць нашага прыхільніка, паспрабуем «станцаваць», як той казаў, ад той самай печы...**

**Як вядома, ёсць некалькі спосабаў нарыхтоўкі дроў (а мы будзем мецы на ўвазе толькі іх, а не пілеты ці абрэзкі піламатэрыялаў). Кожны спосаб мае свае плюсы і свае мінусы.**

### НАБЫЦЬ ГАТОВЫЯ

Самы просты — звярнуцца ў паліўную арганізацыю свайго раёна. Што мы напачатку і зрабілі, патэлефанаваўшы ў Лельчыцкі філіял па забеспячэнні палівам КУП «Гомельаблпаліва».

Як запэўніла нас **выканаўца абавязкаў дырэктара прадпрыемства Галіна ПАГРАНОЎСКАЯ**, ніякіх праблем з забеспячэннем насельніцтва гатовымі — парэзанымі і пакалатымі — дровамі няма. Праўда, калі гаварыць пра тэрміны дастаўкі, дык у паліўны сезон іх прывязуць па працягу месяца пасля заказу. Па-за сезонам — з красавіка па жнівень — могуць нават у той самы дзень даставіць. Уласна дровы каштуюць 7,7 рубля за адзін кубаметр. Аплата распілоўкі, колкі, пагрузкі, разгрузкі аплачваецца дадаткова. У год на адно прыватнае домаўладанне можна ўзяць па паліўнай кніжцы 4,9 кубаметра дроў. Крыху па іншых цэнах можна купіць потым і дадаткова, але, як нам паведамілі на прадпрыемстве, такіх выпадкаў за апошні час не было. Атрымаў вясковец свае належныя 4,9 кубаметра паліва ў год і больш не звяртаецца. (Таму мы нават не сталі прасіць пралічыць цэны на дадатковыя дровы.)

> „У год на адно прыватнае домаўладанне можна ўзяць па паліўнай кніжцы 4,9 кубаметра дроў.

Калі гаварыць пра льготы, яны даюцца інвалідам першай і другой груп па агульным захворванні, інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Але прэферэнцыя датычыцца толькі ўласна самых дроў: такія льготнікі будуць плаціць за кубаметр 3,85 рубля. А вось паслугі па распілоўцы, колцы, пагрузцы-разгрузцы трэба будзе аплачваць цалкам, усе сто працэнтаў. Дарэчы, цэны на паліва змяняліся ў самым пачатку 2016 года. Непасрэдна на дровы іх устанаўлівае Гомельскі аблвыканкам. На расцэнкі прадпрыемства па распілоўцы, колцы, пагрузцы-разгрузцы мяжы рэнтабельнасці няма.

### З уласнага досведу

*Спосаб нарыхтоўкі дроў добры тым, што не трэба больш ні пра што клапаціцца: зрабіў заказ і чакай, калі прывязуць. Праўда, калі чалавек састарэлы, узнікае іншая праблема: як іх потым самастойна перанесці і скласці ў дрывотню? Калі здароўе не тое, без памочнікаў абысціся цяжка.*

*Я ж сутыкаўся з іншай праблемай у сваім раёне. Табе могуць прывезці палены ці цуркі (гледзячы што заказваеш) рознай даўжыні. Адны будуць па 30 сантыметраў, другія па 60. Гэтак жа можа адрознівацца і дыяметр дроў. Ды і самі яны бываюць «не першай свежасці». Калі такое здарылася, трэба перапразаць, пераколваць. Тут зноў жа фізічныя сілы патрэбныя. Добра, калі ў сям'і ёсць працаздольныя мужчыны і патрэбны інструмент...*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

### КУПІЦЬ НА ПНІ

Яшчэ адзін спосаб — звярнуцца ў мясцовы лясгас ці ў найбліжэйшае лясніцтва. Тут нават два спосабы нарыхтаваць дровы. Вось першы з іх. Як расказаў нам **дырэктар Лельчыцкага лясгаса Аляксандр РЫДЗЕЦКІ**, у іх можна набыць дровы ў круглым выглядзе — сасны і вольхі і іншых парод на прамежкавым складзе (той, што бліжэй да дарогі) — па 11,28 рубля за кубаметр. І на верхнім складзе (той, што побач з лесасекай) — па 8,71 рубля за кубаметр. Розніца ў цэнах зразумелая — за выгоды трэба плаціць. Між іншым, гэта цэны без уліку транспарту. Пакупнік можа самастойна забраць набытыя дровы, калі ж не мае такой магчымасці, — дапаможа лясгас. Дастаўка транспартам арганізацыі — 21,53 рубля за гадзіну без ПДВ. Канчатковы кошт падлічыце самі?

З плюсаў тут — цуркі вы потым адразу нарэжаце патрэбнай даўжыні. Ды і цэлае бервяно-другое ў гаспадарцы спатрэбіцца могуць. Праўда, і колку дроў ніхто не адмяняў. А гэта зноў жа састарэламу чалавеку — не пад сілу.

Яшчэ адзін спосаб нарыхтоўкі дроў праз лясгас — аформіць лесасечны білет на фізічную асобу і самому заняцца гэтай справай. Лясгас вылучае дзялянку лесу на пні — калі ласка, сам зразай, распілоўвай, грузі, вывозь. Праблема ў тым, што той, на каго аформлены білет, і павінен займацца нарыхтоўкай, перадача дакумента іншаму забаронена. Пра фізічную працу зноў жа прамаўчу, як і пра наяўнасць уласнага грузавога транспарту... Затое расцэнкі лесу на пні вельмі прымальныя — 1,1 рубля за дзесяць кубаметраў.

### З уласнага досведу

*Нейк вельмі даўно вырашылі скарыстацца апошнім спосабам нарыхтоўкі дроў. Падавалася, што танна... Але давялося наймаць трактар, легкавую машыну, каб адвесці памочнікаў у лес (туды — назад), пакінуць яшчэ аднаго чалавека дома для разгрузкі... А пацягаўшы сырыя бярозавыя ствалы па некалькі метраў і дыяметрам недзе да паўметра з лесу да прычэпа, ужо не хацелася нічога... І гэта зноў жа не адмяняла далейшага пераўтварэння «лесу» ў гатовыя дровы.*

### ПРАЦА АБО ГРОШЫ?

Як відаць, любы спосаб нарыхтоўкі звязаны як з фінансавымі выдаткамі, так і з фізічнымі. Ні без аднаго, ні без другога немагчыма. Адносна сэканоміць грошы можа толькі той, хто мае ўласны транспарт, патрэбны інструмент і як мінімум памочніка. Але ўсё гэта — за кошт вялікіх фізічных высілкаў найперш. Вядома, не іх жа меў на ўвазе наш пажылы чытач, калі звяртаўся ў газету. Значыць, грашовы бок? Бо, як мы расказалі, праблем з самімі дровамі няма, нарыхтаваць іх можна. Пытанне — якім спосабам?.. Як сказала нам Галіна Паграноўская, не ў сезон дровы летась заказалі ўсяго пяць чалавек. Затое заяўкі пачынаюць сыпацца, як толькі сезон надыходзіць, людзі яшчэ і прыспешваюць. Калі надыходзяць халады, натуральна, выдаткі павялічваюцца, а тут яшчэ і за дровы дастань і пакладзі. Вядома, пенсіянеру пры такім раскладзе можа падацца, што гэта дорага. Але, як адзначалася, ільготы для пэўных катэгорый насельніцтва ёсць.

### З уласнага досведу

*Мы з братам апошнім часам выкарыстоўваем яшчэ адзін спосаб набыць дровы — праз рэкламныя аб'явы. Механізм тут наступны — індывідуальныя прадпрымальнікі набываюць у лясгасах лес на пні, а потым рэалізуюць (дарэчы, у Лельчыцкім лясгасе зараз такога няма, хоць летась, падчас санітарных высечак, з'ява мела месца). Прывязуць вам яго нават з суседняй вобласці, пароды — пад заказ. Выходзіць нятанна, прызнаюся. Гэта мінус. Яшчэ не вельмі проста зрабіць заказ: то індывідуальныя прадпрымальнікі яшчэ не гатовыя вазіць дровы, бо тэхніка не можа заехаць у лес з-за ўмоў надвор'я, то ўжо паспелі ўсё распрадаць. Затое выдатных дроў — дубу, вольхі, бярозы — потым хапае не на адну зіму. Ну, а сякерай памахаць для мяне — толькі ў задавальненне.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
rs@zviazda.by

ЧАГО РАБІЦЬ НЕЛЬГА

## «Наламалі» дрэў

### Адзін з нелегалаў ссякаў іх па начах — з ліхтарыкам

Двух лесарубаў-нелегалаў затрымалі работнікі Маладзечанскай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі мясцовага лясгаса. На пачатку ацяпляльнага сезона мужчыны вырашылі «падзарабіць» на нарыхтоўцы дроў.

Адзін з іх займаўся гэтым на пастаяннай аснове як індывідуальны прадпрымальнік. Толькі дакументы на высечку ІП афармляў, мякка кажучы, не заўсёды. Калі недалёка ад вёскі Белева, дзе пражывае прадпрымальнік, выявілі ссечаныя дрэвы (42 штукі), да мужчыны наведаліся з праверкай. Тым больш што ад месца высечкі да яго дома, размешчанага на ўскраіне вёскі, па прымятай траве вёў выразны след аўтамабіля.

Факт незаконнай нарыхтоўкі дроў падазраваны прызнаў і паказаў яшчэ адно месца, дзе ён таксама ссек восем дрэў. Нелегальнай высечкай мужчына займаўся па начах, падсвечваючы сабе налобным ліхтарыкам. Усяго без дазволу прадпрымальнік нарыхтаваў каля 27 кубаметраў драўніны, учыненая шкода — 1073 рублі. Акрамя таго, яму прызначана каля 805 рублёў штрафу, паведаміла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.**

Другі нелегал быў затрыманы пад Радашковічамі. Мужчына нідзе не працуе, але мае ва ўласнасці два трактары. На адным з іх у момант затрымання перавозіў 10 кубаметраў алешыны, асіны і бярозы. На дровы, якія ён збіраўся рэалізаваць мясцовым жыхарам, пайшлі 27 дрэў. За незаконна ссечаную драўніну парушальніку прыйдзецца выплаціць 934 рублі і 460 рублёў штрафу. А калі б усё было зроблена па законе, дровы абышліся б нарыхтоўшчыку як мінімум у дзесяць разоў танней.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 11 студзеня 2018 года.**